МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МЕДЫЦЫНСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ
КАФЕДРА БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОЎ

**В. П. Клімавец**

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

Зборнік кантрольных работ

Мінск БДМУ 2011

Репозиторий БГМУ

УДК 811.161.3 (075.8)
ББК 81.2 Бел-923 я73
К49

Рэкамендавана Навукова-метадычным саветам універсітэта ў якасці зборніка кантрольных работ 24.11.2010 г., пратакол № 3

Р э ц э н з е н т ы: ст. выкл. каф. беларускай і рускай моў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Г. У. Мядзведзь; ст. выкл. каф. беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Н. Я. Савіцкая

**Клімавец, В. П.**
К49 Беларуская мова : зборнік кантрольных работ / В. П. Клімавец. Мінск : БДМУ, 2011. – 136 с.

ISBN 978-985-528-344-8.

У зборнік уключаны 9 кантрольных работ, кожная з якіх мае па 4 варыянты. Кантрольныя работы ўяўляюць сабой заданні па асобных раздзелах праграмы і маюць на мэце праверку і замацаванне атрыманых ведаў.

Прызначаны для слухачоў падрыхтоўчага аддзялення.

**УДК 811.161.3 (075.8)**
**ББК 81.2 Бел-923 я73**

---

Вучэбнае выданне

**Клімавец** Вольга Паўлаўна

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

Зборнік кантрольных работ

Адказны за выпуск В. У. Белы
У аўтарскай рэдакцыі
Камп’ютарная вёрстка Н. М. Федарцовай
Карэктар Ю. В. Кісялёва

Падпісана да друку 25.11.10. Фармат 60×84/16. Папера пісчая «Снягурачка».
Друк афсетны. Гарнітура «Times».
Ум. друк. арк. 7,9. Ул.-выд. арк. 6,25. Тыраж 50 экз. Заказ 101.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт».
ЛВ № 02330/0494330 ад 16.03.2009.
ЛП № 02330/0150484 ад 25.02.2009.
Вул. Ленінградская, 6, 220006, Мінск.

**ISBN 978-985-528-344-8**

© Афармленне. Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, 2011

Репозиторий БГМУ

## Умоўныя скарачэнні

*А. А.* — А. Андрэеў
*А. Ж.* — А. Жук
*Альш.* — В. Альшэўскі
*Андр.* — С. Андраюк
*Асіп.* — А. Асіпенка
*Аўл.* — Г. Аўласенка
*А. Р-ч* — А. Разановіч
*Афяр.* — А. Афяроўскі
*Б.* — Я. Брыль
*Багд.* — М. Багдановіч
*Бар.* — А. Бароўскі
*Баршч.* — Я. Баршчэўскі
*Башл.*— М. Башлакоў
*Бел. кн.*— Беларускі кнігазбор
*Бр.* — П. Броўка
*Бур.* — Г. Бураўкін
*Бр. Спр.* — Бр. Спрынчан
*Бут.* — А. Бутэвіч
*Бязл.* — С. Бязлепкіна
*Ваб.* — В. Вабішчэвіч
*Валас.* — І. Валасевіч
*Васіл.*— Г. Васілеўская
*Васюч.* — П. Васючэнка
*В. В.* — В. Вольскі
*В. Б.* — В. Быкаў
*В. Д.* — В. Дайліда
*В. Ж.* — В. Жуковіч
*В-х* — А. Ветах
*Віт.* — В. Вітка
*В. Іп.* — В. Іпатава
*В. М.* — В. Макарэвіч
*В. Пр.* — В. Праўдзін
*В. Ш.* — В. Шабалтас
*В. Яр.* — В. Ярац
*Гаўр.* — У. Гаўрылаў
*Гальп.* — Н. Гальпяровіч
*Гап.* — В. Гапееў
*Гаран.* —В. Гарановіч
*Гардз.* — В. Гардзей
*Г. З.* — Г. Запартыка
*Гар.* — М. Гарэцкі
*Гасп.* — П. Гаспадыніч
*Гіг.* — В. Гігевіч
*Гіл.* — Н. Гілевіч
*Гл.* — П. Глебка
*Гн.* — У. Гніламёдаў
*Гр.* — С. Грахоўскі
*Гур.* — І. Гурскі
*Г. Ч.* — Г. Чарказян
*Запр.* — І. Запрудскі
*Зар.* — А. Зарыцкі
*Зв.* — А. Звонак
*З. Д.* — З. Дудзюк
*З. Пр.* — З. Прыгодзіч
*З-ў.* — А. Зэкаў
*Зяньк.* — М. Зяньковіч
*Д. Б.* — Д. Бугаёў
*Дал.* — Г. Далідовіч
*Дам.* — У. Дамашэвіч
*Дз.* — А. Дзятлаў
*Дзел.* — М. Дзелянкоўскі
*Дуб.* — М. Дубоўскі
*Дубр.* — І. Дуброўскі
*І. Н.* — І. Навуменка
*Індз.* — К. Індзюкова
*І. Пт.* — І. Пташнікаў
*І. Ст.* — І. Стадольнік
*І. Т.* — І. Тулупава
*К-д* — А. Кажадуб
*Каз.* — А. Казулін
*Казл.* — А. Казлоў
*Кам.* — К. Камейша
*Капыл.* — І. Капыловіч
*Карам.* — В. Карамазаў
*Кар.* — І. Карэнда
*Кір.* — К. Кірэенка
*К-с* — Я. Колас
*Кр.* — К. Крапіва
*К. Т.* — К. Тарасаў
*Куп.* — Я. Купала

*К. Ч.* — К. Чорны
*К-ч* — А. Крэйдзіч
*Л. А.* — Л. Арабей
*Л. Д.* — Л. Дайнека
*Лев.* — Л. Левановіч
*Л. Л.* — Л. Ламека
*Лоб.* — С. Лобан
*Лук.* — М. Лук’янаў
*«ЛіМ»* — «Літаратура і мастацтва»
*Мал.* — М. Маляўка
*Марц.* — А. Марціновіч
*Масл.* — І. Масляніцына
*М. Д.* — М. Дукса
*М. К.* — М. Корзун
*М. Л.* — М. Лобан
*М. П.* — М. Парахневіч
*М. Стр.*— М. Стральцоў
*М. Т.* — М. Танк
*М. Шаб.* — М. Шабовіч
*Мятл.* — М. Мятліцкі
*М. Ю.* — М. Южык
*Наб.* — Р. Набатаў
*Нар.* — Народная творчасць
*Н. М.* — Н. Мацяш
*Нов.* — І. Новікаў
*Н-к* — В. Новік
*Н. Р.* — Н. Рыбік
*Н. Ц.* — Н. Цыпіс
*Нямц.* — Б. Нямцова
*Нях.* — Р. Няхай
*Пазн.* — М. Пазнякоў
*Панч.* — П. Панчанка
*Патап.* — В. Патапенка
*Пестр.* — П. Пестрак
*П. К.* — П. Кавалёў
*Пр.* — П. Прыходзька
*Прык.* — Прыказка
*П. С.* — П. Сабіна
*П-ў* — А. Пісьмянкоў
*Радз.* — Ф. У. Радзівіл
*Р. Бар.* — Р. Баравікова
*«Р. сл.»* — «Роднае слова»
*Саб.* — Р. Сабаленка
*Самахв.* — В. Самахвалаў
*Сач.* — Б. Сачанка
*С. Сц.* — С. Сцяпан
*С-к* — А. Салтук
*Сіп.* — Я. Сіпакоў
*Сод.* — У. Содаль
*Сянк.* — А. Сянковіч
*С. Кух.* — С. Кухараў
*Т. Дз.* — Т. Дзярабіна
*Тул.* — А. Тулупава
*У. А.* — У. Арлоў
*У. К.* — У. Караткевіч
*Ул. Л.*— У. Ліпскі
*У. П.* — У. Паўлаў
*Ул. Сц.* — У. Сцяпан
*У. Ш.* — У. Шулякоўскі
*Ф. Б.* — Ф. Баторын
*Федар.* — А. Федарэнка
*Х. Ж.* — Х. Жычка
*Шам.* — І. Шамякін
*Шн.* — В. Шніп
*Шуп.* — Г. Шупенька
*Энц.* — Энцыклапедыя
*Э. Я.* — Э. Ялугін
*Ю. Кр.* — Ю. Крашэўскі
*Ю. Ст.* — Ю. Станкевіч
*Ю. Т.* — Ю. Татарынаў
*Яг.* — У. Ягоўдзік
*Я. Г.* — Я. Галубовіч
*Я. К.* — Я. Конеў
*Я. М.* — Я. Маўр
*Янк.* — Ф. Янкоўскі
*Я. Я.* — Я. Янішчыц

Репозиторий БГМУ

## Кантрольная работа № 1 (Дыктант)

### Варыянт 1

### Інтэлігентнасць — скарб душы

Сёння мы павінны надзвычай добра зразумець і адчуць неабходнасць выхавання сучаснай школай інтэлігента, а калі браць шырэй — інтэлігентнасці ў чалавеку. Гэта, аднак, не значыць, што сённяшні вучань заўтра павінен атрымаць вышэйшую адукацыю. Мы ўжо добра ведаем, да чаго прывяла ўсеагульная політэхнізацыя школы ці спроба ажыццявіць у краіне ўсеагульную абавязковую сярэднюю адукацыю.

Інтэлігентнасць, на жаль, не заўсёды праяўляецца ў чалавеку, які мае дыплом аб заканчэнні вну, бо інтэлігентнасць — гэта перш-наперш узровень духоўнага і агульнакультурнага далягляду чалавека. Янка Купала, Цішка Гартны, Кузьма Чорны, Уладзімір Караткевіч — нацыянальныя інтэлігенты з вялікай літары.

Нацыянальны інтэлігент пачынаецца з усведамлення свайго нацыянальнага «я». Хіба можа ўзрасці ўвогуле свядомы беларус без любові да роднай мовы і прыроды, без моцнай духоўнай памяці, без шанавання генеалагічнага дрэва свайго роду, без ведання гісторыі і культуры Бацькаўшчыны? Але інтэлігент-беларус не павінен адчуваць сябе ізалявана ў славянскім сумоўі людзей, у агульнасусветнай супольнасці.

Мова, культура ўвогуле знітоўваюць чалавека з чалавекам, краіну з краінай. Ці кожны з сённяшніх інтэлігентаў можа пахваліцца глыбокім веданнем моў і культуры славянскіх суседзяў і народаў свету? Пэўна, што не: і сваё нацыянальнае «я» ў душы досыць часта занядбана ці вытручана.

Прыкра, што інтэлігентнасць часта зводзяць да паводзін чалавека ў будзённым жыцці, а гэта ж скарб чалавечай душы, вызначальная рыса духоўнасці, унутранай культуры асобы, яе цэльнасці і цэласнасці.

Філолаг, гуманітарый увогуле, як ніхто іншы, павінен увасабляць эстэтычнае і культурнае багацце свету і асобы, умяшчаць у сабе вабнае і прыцягальнае хараство духоўнасці, маральнасці.

Настаўнік-славеснік праз слова мастацкай літаратуры і сваё ўласнае слова павінен раскрыць для сэрцаў вучняў хараство духоўнага існавання, сутнасць высакароднай, рыцарскай маральнасці.

*Паводле А. Бельскага*
*(253 словы)*

### Варыянт 2

### Талент, аддадзены Радзіме

Двойчы ў 1860 годзе замаляваў Орда месца свайго нараджэння, родную сядзібу Варацэвічы. На малюнках адлюстраваны аднапавярховы прамавугольны ў плане драўляны дом на дзве палавіны, з традыцыйным чатырохкалонным порцікам-ганкам па цэнтры франтальнага фасада, невялікай мансардай над ім. Перад домам парадны двор, за ім пейзажны парк. Такая сядзіба дробнапамеснага шляхціца была тыповай і найбольш распаўсюджанай на Беларусі, пра што зноў-такі сведчаць і іншыя малюнкі Орды. Здаецца, што сэрцу мастака бліжэй менавіта гэтыя ўтульныя фальваркі са сціплым жыллём, паркавымі прысадамі, гаспадарчымі пабудовамі.

Серыя малюнкаў Н. Орды з'яўляецца абагульненай ілюстрацыяй беларускай вёскі сярэдзіны XIX стагоддзя, на якой народнае драўлянае дойлідства перададзена мастаком з вялікай трапнасцю і захаваннем нацыянальнага каларыту. Перад намі паўстаюць маляўніча раскінутыя ўздоўж рэк і азёр беларускія паселішчы з хатамі, накрытымі саламянымі стрэхамі, з драўлянымі храмамі і званіцамі, млынамі і ветракамі, калодзежамі-жураўлямі і іншымі вясковымі збудаваннямі.

Але найбольш шырока ў творчасці мастака прадстаўлена гарадская архітэктура (больш за 30 малюнкаў). Па шэрагу гарадоў створана шырокая панарама шматстылёвай мураванай забудовы XIX стагоддзя. У гэтай серыі малюнкі гарадоў Гродна, Віцебска, Мінска, Магілёва, Полацка, Пінска, Навагрудка, Нясвіжа, Турава, Свіслачы. На малюнках Орда амаль ніколі не абагульняў гарадскую забудову: кожны будынак надзелены вызначанай індывідуальнай характарыстыкай, вулічныя панарамы пададзены з вострых ракурсаў з вылучэннем архітэктурных дамінант.

З асаблівым замілаваннем перад сівой мінуўшчынай Орда замалёўвае старажытныя замкі, многія з якіх ужо ў той час ляжалі ў руінах. На двух малюнках зафіксаваны сусветна вядомы помнік абарончага дойлідства — Камянецкая вежа ў сваім першапачатковым выглядзе без пазнейшай рэстаўрацыі і атынкоўкі. З рамантычнай настальгіяй мастак адлюстроўвае Стары і Новы замкі ў Гродна, замкавую рэзідэнцыю Ільінічаў у Міры. На малюнках Орды мы бачым старажытныя беларускія замкі ў Крэве, Геранёнах, Лідзе, Навагрудку, Караліне пад Пінскам і іншыя.

*А. М. Кулагін. «Талент, аддадзены Радзіме»*
*(267 слоў)*

### Варыянт 3

### Мастацтва ў Нясвіжы

У другой палове XVIII стагоддзя ў нясвіжскім тэатры ўсё часцей з'яўляліся іншаземцы-прафесіяналы і артысты з прыгонных сялян, якія атрымалі адпаведную адукацыю. Асабліва гэта ўзмацнілася пасля смерці Францішкі Уршулі Радзівіл, калі са сцэны зніклі драматычныя творы

і перавага аддавалася операм і балетам. А паколькі артысты з прыгонных каштавалі намнога танней, чым замежныя гастралёры, у Нясвіжы пачалі рыхтаваць уласных музыкантаў, танцораў, спевакоў, драматычных акцёраў. Для гэтага запрашаліся вядомыя майстры. У архівах сустракаюцца прозвішчы капельмайстра Альберціні, балетмайстраў Дзюпрэ, Лойкі. Часам вучняў з прыгонных адпраўлялі за граніцу. Іван Цэнцыловіч удасканальваў майстэрства ігры на скрыпцы ў Рыме. Здольны прыгонны скрыпач Мацей з Карэлічаў атрымаў музычную падрыхтоўку таксама, відаць, за мяжой. Міхал Радзівіл адзначаў у дзённіку, што «яго навука дорага каштавала».

Міхал Казімір Радзівіл, па мянушцы Рыбанька, часта абменьваўся прыгоннымі і прафесіянальнымі артыстамі са слуцкім магнатам Геранімам Радзівілам, сваім братам. Часам нават цяжка ўстанавіць, дзе пачалася кар’ера таго ці іншага спевака, танцора, музыканта. У 1757 годзе Рыбанька папрасіў у брата добрага балетмайстра. Геранім пачаў шукаць адпаведнага чалавека ў Вене, але безвынікова. Тады паабяцаў прыслаць свайго, які служыў у яго два гады. «Чалавек гэта даволі цвярозы і французскага стылю паводзін», — паведаміў слуцкі магнат нясвіжскаму. І нарэшце, не без ваганняў, уступіў абяцанага балетмайстра. Быў ім знакаміты Луі Максіміліян Дзюпрэ. Француз па паходжанні, родам з Квебека ў Канадзе, да Слуцка ён саліраваў у парыжскай оперы, дзе выступіў пачынальнікам мужчынскага класічнага танца.

У Нясвіжы Дзюпрэ з’явіўся ў канцы сакавіка 1758 года. З ім быў падпісаны трохгадовы кантракт, дзе гаварылася, што ён павінен навучыць танцам восем дзяўчынак і хлопчыкаў, у тым ліку і малалетніх дзяцей Рыбанькі.

Як адзначае Г. Барышаў, з прыездам у Нясвіж Дзюпрэ на сцэне мясцовага тэатра адбыліся прынцыповыя змены. Упершыню тут з’явіўся танцор з такой «грацыёзнасцю і пластычнасцю рухаў».

*З. Шышыгіна. «Скарбы Нясвіжа»*
*(273 словы)*

## Варыянт 4

### Вытокі і пачатак творчасці

У гісторыі беларускай культуры першай паловы ХХ стагоддзя дастойнае месца займае імя Язэпа Драздовіча. Яно стаіць у адным шэрагу з такімі вядомымі прозвішчамі, як браты І. і А. Луцкевічы, Б. Эпімах-Шыпіла, М. Багдановіч, В. Ластоўскі, Я. Купала і іншыя. Яго імя амаль што на 30 гадоў было забыта, пакуль не выйшла з друку кніга А. Ліса «Вечны вандроўнік».

Драздовіч Язэп Нарцызавіч нарадзіўся 1 кастрычніка 1888 года ў збяднелай шляхецкай сям’і ў засценку Пунькі Глыбоцкага раёна

Віцебскай вобласці. Сям’я Драздовічаў не мела сваёй зямлі і вымушана была арандаваць яе, пераязджаючы амаль што праз кожныя тры гады на новае месца. Калі Язэпу споўнілася два гады, памёр яго бацька. Выхоўвала дзяцей маці. З замілаванасцю слухаў Язэп беларускія песні, якія спявала яна вечарамі. Яна вучыла сваіх дзяцей быць патрыётамі, любіць Бацькаўшчыну. Запомніліся будучаму мастаку цікавыя народныя паданні пра курганы-валатоўкі, у якіх пахаваны старажытныя асілкі — абаронцы роднай зямлі. Усё гэта нараджала ў думках хлопчыка вобразы адважных і магутных змагароў. Народныя песні, казкі, легенды і паданні натхнялі хлопца цікавіцца гісторыяй роднага краю, Беларусі, ганарыцца сваёй мовай.

У 1906 годзе Я. Драздовіч паступіў вучыцца ў Віленскую школу малявання, якую закончыў праз два гады. Кіраваў школай акадэмік Іван Трутнеў. Тут, у школе, былі зроблены першыя малюнкі — «Трызна мінуўшчыны», «Дух зямлі», «Брамка будучыні». Падчас летніх канікул вучні рабілі замалёўкі краявідаў знакамітага Тракайскага замка, Вільні, малявалі пейзажы каля рэк Дзісна і Вілія. У гэты час Язэп Драздовіч пачаў супрацоўнічаць з рэдакцыяй беларускай газеты «Наша ніва». Ён маляўніча аздобіў вокладкі «Беларускага календара на 1910 год», кнігі К. Буйло «Курганная кветка».

*Ю. Малаш. «Язэп Драздовіч — вандроўнік, мастак, гісторык»*
*(253 словы)*

## Кантрольная работа № 2

### Варыянт 1

**1.** ***Запішыце прозвішчы ў алфавітным парадку.***

1 — Буры. 2 — Зяленін. 3 — Красноў. 4 — Красніцкі. 5 — Буракоў. 6 — Зелянкевіч. 7 — Краснеўскі. 8 — Серакоў. 9 — Сярак. 10 — Зелянкоў. 11 — Аўдзееў. 12 — Зяленскі. 13 — Шарэцкі. 14 — Шарай.

**2.** ***Зрабіце фанетычны разбор слоў.***

Гарадскі, біялогія, вымаўленне.

**3.** ***Падкрэсліце словы, у якіх колькасць літар і гукаў не супадае.***

Выкананне, раздзяліць, кантрасны, папялішча, небяспека, індустрыяльны, выяўленчы, перавозчык, сейбіт, заіскрыцца, беспрацоўе, пераключальнік.

**4.** ***Запішыце ў транскрыпцыі наступныя словы.***

Бясшумна, на рэчцы, дубкі, падносчык, смешна, прыволле, зайграе, пясчынка, вясёлы, айсберг, гарадскі, моладзь, французскі, пасадка.

**5.** ***Пастаўце націскі ў словах.***



Репозиторий БГМУ

Дакумент, працэнт, старэнькі, вярба, прынесла, нянавісць, накрыўка, засланка, шэсцьдзясят, квартал, атлас, каменны, калоссе, замак, выпадак.

**6.** ***Устаўце прапушчаныя літары.***

Д…кламацыя, інв…нтар, ваз…лін, ц…гельня, абв…шчэнне, Бес…дзь, р…ляцыя, р…п…ртуар, г…н…тычны, орд…н, вет…ран, ж…леза, літ…ратура, бухгалт…р, кандыт…р, т…леграф, в…сна, в…лізарны, Васн…цоў, эл…мент, інт…л…генцыя, п…рп…ндыкуляр, н…пэўны, Н…птун, М…ркурый, дыл…тант, Новы Арл…ан, імпр…сары…, адр…с, інж…нер, п…рсанаж, п…ц…рня, …рмак, канц…лярыя, р…фарматар, майст…р, акад…мічны, кр…пасны, Ч…лябінск, світ…р, ш…рэнга, Ч…р…павец, Т…г…ран, Дрэзд…н, …ўропа, грэйд…р, р…меснік, б…летрыстыка, Ш…кспір, Ц…йлон, Бар…нцава мора, Вал…р'ян, Даг…стан, Гр…нада, Гр…нландыя, Д…тройт, Ж…нева, …ўфрат, пл…нарны, д…з…рцір, с…мантыка, Svіц…зь, сер…нада, се…лка, пр…міяльны, пр…стыж, пр…зідыум, пр…зідэнт, пс…ўданім, м…сцком, м…шчанства, м…нушка, мушк…цёр, п…дант, п…рон, н…гатыў, н…ктар, п…рыметр, код…кс, др…наж, Гаш…к, В…рнадскі, Г…ракл.

**7.** ***Запішыце па-беларуску.***

Диапазон, поэзия, апофеоз, виадук, потенциал, дивизион, биография, библиотека, аксиома, библиография, приоритет, стационарный, абитуриент, официоз, рациональный, мельхиор, теоретик, география, киоскер, диафрагма, диалектика, периодика, медиана, диагональ, радиатор, районный, фиалка, диадема, национальный, секвойя, селекционер.

**8.** ***Ад наступных пар слоў утварыце складаныя словы, растлумачце правапіс галосных шляхам пастаноўкі націску.***

Кіно і пракат; мала і метраж; лес і ахоўваць; высокі і ўраджай; высокі і якасць; добры і сусед; прырода і знаць; многа і том; дрэва і апрацоўваць; зямля і трэсці; плод і насіць; тонкі і валакно; тонкі і ствол (аб зброі); фота і камера; трэці і клас; высокі і эфектыўнасць; высокі і рослы; зычыць і дабро; добры і душа.

## Варыянт 2

**1.** ***Запішыце прозвішчы ў алфавітным парадку.***

1 — Чэховіч. 2 — Танковіч. 3 — Зайко. 4 — Ягоўдзік. 5 — Азаронак. 6 — Пузан. 7 — Пузевіч. 8 — Пузакоў. 9 — Бажко. 10 — Купахавец. 11 — Пашкевіч. 12 — Букаты. 13 — Жырноў. 14 — Гладкоў.

**2.** ***Зрабіце фанетычны разбор слоў.***

Вядзерца, неабходнасць, салаўі.

**3.** ***Падкрэсліце словы, у якіх колькасць літар і гукаў не супадае.***

Адзвініш, барацьба, дзераза, дождж, дзянькі, заціхаць, ка́паюць, люблю, людзі, мерыдыян, павільён, прыярытэт.

Рэпазіторый БДПУ

**4.** ***Запішыце ў транскрыпцыі наступныя словы.***

Сцярогся, растлумачце, балотца, світанне, песня, касьба, Ільіч, ельнік, лось, зжалішся, здзіўленне, дзверы, ззянне, з’ездзіць.

**5.** ***Пастаўце націскі ў словах.***

Гушчар, буйны (горад), веснавы, прысады, ласкавы, анапест, валасы, замець, правапіс, вабіць, ганьба, навіна, завесці, інструмент, кпіны, магазін, музыка, увачавідкі, сантыметр, грэблівасць.

**6.** ***Устаўце прапушчаныя літары.***

М…нташка, ч…рналессе, Дн…про, д…ктант, р…торта, купл…тыст, вызв…рыцца, г…рм…тычны, д…л…гат, ваз…лін, р…ф…рэндум, ц…р…монія, р…жысёр, бал…рына, аб…ліск, с…зон, м…нзурка, бар…льеф, В…нера, Ч…рнышэўскі, м…тодыка, п…рсп…ктыва, б…сконца, К…тлінская, дроб…зь, с…ржант, гл…дачы, Г…надзь, Пан…тоўскі, Шв…йцарыя, ап…рацыя, сн…гавік, м…чэць, з…нітчык, к…фір, м…стачковы, Ап…ніны, Н…свіж, м…тазгодна, м…ккаваты, Ж…нева, Д…фо, Ш…п…тоўка, …фіопія, гард…роб, ч…снок, ц…люлоза, карц…р, тэар…тычны, д…фект, ш…дэўр, р…клама, Прып…ць, выгл…д, л…снікова, ц…гнікі, кіб…рнетыка, к…фаль, к…нгуру, п…дыятр, п…даль, п…йзаж, к…нтаўр, п…льмені, к…раміка, ках…цінец, п…раміда Х…опса, с…мнаццаць, с…нтэнцыя, с…рвант, акард…н, с…кунда, п…ргамент, м…ніск, м…мбрана, п…рсідскі, мец…нат, Вал…нціна, Ін…са, Вен…дзікт, Панц…л…ймон, Л…вонцій, К…йптаўн, М…дэа, К…нэдзі.

**7.** ***Запішыце па-беларуску.***

Океан, траектория, антиквариат, бионика, ассоциация, коэффициент, артезианский, фиаско, Венецианов, Орион, Ариадна, иллюзионист, Иордания, диалект, Циолковский, Илиада, Антониони, стереотип, физиономия, меридиан, плагиат, мириады, Ниагарский водопад, марионетка, биология, мемориальный, региональный, патриот.

**8.** ***Ад наступных пар слоў утварыце складаныя словы, растлумачце правапіс галосных шляхам пастаноўкі націску.***

Роўны і права; круглы і твар; доўгі і нос, высокі і ідэя; высокі і родны; сіні і вока; вада і лячэбніца; рэдкі і зуб; ружовы і шчака; шырокі і плечы; абарона і здольнасць; сто і год; мова і знаць; слова і злучэнне; дровы і секчы; роўны і мера; рэдкі і лес; сорак і год; мароз і ўстойлівасць; розны і колер; уласнік і дом.

## Варыянт 3

***Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары і знакі прыпынку.***

### (Не)ацэнны помнік

Полацкае кня(?)ства пас(?)пяхова а...стойвала (не)залежнас(?)ць ад (К, к)іева. Апроч палітычных і эканамічных выгодаў гэта давала творчую свабоду дойлідам ж...вапісцам ювелірам ад якіх (не, ні)хто н... вымагаў абавя...кова ар...нтавацца на (К, к)іеўскія ўзоры. Полацкая з...мля н... тол(?)кі прара...іма беларусаў але і калыска (Б, б)еларускай кул(?)туры. Н...стомна (з, с)біраючы вакол с...бе тал...нты Еўфрасіння (П, п)олацкая стала нашай першаю мец...наткай.

Высокі (ў, у)з(?)лёт (П, п)олацкай школы дойлі...тва зас(?)ведчыла ...тварэнне (С, с)пасаўскай або (С, с)паса-(П, п)раабражэнскай ц...рквы (не)ацэннага помніка сус(?)ветнай кул(?)туры.

(З, с) чым параўнаць яе б...люткае (д, дз)іва? (З, с) лілеяй у цёплай завоіне блі...кай (П, п)алаты? (З, с) казачнаю птушкаю на з...лёным поплаве? (З, с) (журботна)светлай м...лодыяй?.. А як выказаць словамі стан душы якая тут (ні)быта выпростваецца і зам...рае рыхту...чыся дакрануцца да Вечнас(?)ці?

…Для Еўфрасінні і яе сучас(?)нікаў храмы былі ...образамі і мадэлямі (С, с)ус(?)вету. У іх увасабляліся ідэалы хара(?)ства і гармоніі. Калі (П, п)алачане ...бачылі новы (С, с)абор без рыштава...яў іх агарнулі пачу...і сугучныя а...чуванням (В, в)ізантыйца Міхаіла Псёла які ў сваёй «Хранаграфіі» пісаў Вока нел(?)га адве...ці н... тол(?)кі ад (не)выказнай прыгажос(?)ці цэлага (з, с) цудоўных частак ...плеце(н, нн)ага але і ад кожнае часткі (па)асобку…

В...домы расейскі гісторык Леанід Аляксе...ў называе будаўніцтва (С, с)пасаўскага (С, с)абора на...буйнейшаю па(д, дз)еяй (П, п)олацкага і ўсяго старажытнага (усходн...)славянскага дойлі...тва. Здарылася гэта па(д, дз)ея н...дзе памі... 1152 і 1161 гадамі. (Князёўна)ігуме(н, нн)я была і фундатаркаю ...мурава(н, нн)ага (не)верагодна хутка за а(д, дз)ін будаўнічы с...зон храма і дара...чыцай на...хняльніцай Іаана на творчы подз(?)віг.

*У. Арлоў. «Нібы прамень сонечны»*
*(232 словы)*

## Варыянт 4

***Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары і знакі прыпынку.***

### Св...точным вечарам

Ці пам...таеце вы пасл...ваенны (М, м)інск? У маёй пам...ці дык ён захаваўся як (стоп)кадр адзіны (не)паўторны і жахлівы. Цэлыя кварталы а...гарэлых як у камуфляж... будынкаў якія ўжо і не называлі дамамі а каро...камі. Абапал ...узкіх ...уліц горы друз... парослыя бур...яном

і маладымі дрэўцамі на...больш б...розамі. Паныласць дзён (з, с)м...нялася ч...рнатой начэй (не)было асв...тле(н, нн)я.

Набліжаліся кастрычніцкія святы. (На)пярэдадні з горада наша (Г, г)рушаўка была далёкай ...скраінай в...рнулася гаспадыня зайшла да нас села на ўслончык і раптам заплакала ад радасці.

Каб вы тол(?)кі бачылі скро(с, з)ь слёзы ра...чулена загаварыла яна толькі пабачылі. Сцягі на ветр... палошч...цца. Праж...ктары.... Мора агнёў. Ну як да вайны...

(На) заўтра і мы з Анютаю па...шлі ў горад каб пабачыць ягонае ўбранства. Душа прагнула хара(?)ства. Вялікая па тым часе плошча перад в...лізным шэрым урадавым будынкам з...хацела ад яркай віднаты праж...ктараў л...хтароў і р...знакал...ровых агнёў ...плеце(н, нн)ых у г...рлянды. На ёй то...піліся людзі зачарава(н, нн)ыя хара(?)ством вечара яркас...ю сцягоў і палотнішчаў. Мы з Анютай трапілі на плошчу з бакавой ...уліцы ад даваеннай (фабрыкі) кухні якая ац...лела ў вайну як і прылеглыя да яе драўля(н, нн)ыя будынкі. Мы (па)малу ішлі па выраўне(н, нн)ай да свята бру...чатцы ў натоўпе ў...хвалява(н, нн)ых людзей ахопле(н, нн)ыя тым(жа) святочным пачуццём прыгажосці што і ўсе хто тут прахо...ваўся.

*Алесь Асіпенка. «Цыркачка і маёр»*

*(241 слова)*

## Кантрольная работа № 3

### Варыянт 1

***Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі. Устаўце прапушчаныя літары і знакі прыпынку.***

### Партызанскі доктар

Партызанскі доктар Талейка пад…хо(д, дз)іў да л…чэ…я ране(н, нн)ых (па)свойму. Галоўнае на яго думку а…на(д, дз)еіць іх узняць іх дух прымусіць паверыць што выздаравеюць а розныя таблеткі мікстуры справа (друга)радная. Пад…ход такі быў выкліканы умовамі ў якіх знахо(д, дз)іўся (Т, т)алейкаў л…сны шпіталь. Калі (з, с)харчам а…стаяла бол(?)ш мен(?)ш здавал(?)няюча дык н… лекаў н… медыцынскага начы…я н… хапала. Сув…зь з (В, в)ялікай (З, з)ямлёй была дрэ(н, нн)ая самалёты а…туль у гэты ра…н н… прыл…талі (н…)было (д, дз)е а…сталяваць на(д, дз)ейны (аэра)дром. Шпіталь жывіўся тым што ўдавалася …дабыць па…пол(?)шчыкам у м…стэчках і гарадах у немцаў і партызанам пры нападах на варожыя гарн…зоны.

Якія ця…кас(?)ці н… выпадалі Талейку н…колі н… бачылі панурым ці ра…хвалява(н, нн)ым ці злосным. Хударлявы (руда)бароды твар з

просц…н(?)кімі акулярамі на блізарукіх вачах с(?)в…ціўся мя…ай прыязнас(?)цю ў ха(д, дз)е рухах выяўлялася жвавас(?)ць і разам з тым ц(?)вёрдас(?)ць. Насіў доктар адно і тое(ж) ватоўку паверх якой апранаў жаўтлявы халат (цёмна)сінія ды…ганал…выя галіф(е, э) і к…рзавыя боты шапка была афіц…рская летняя з зоркай. Варта было яму паказацца ў будане ці ў з…млянцы як …ціхалі стогны св…тлелі вочы бы…ам адно па…ўле…е яго несла палё…ку. Кожнаму ён як(бы) загляд(?)ваў у душу ўлоўліваючы настрой і знахо(д, дз)ячы патрэбныя словы.

Да ўсіх ён ставіўся аднол(?)кава але як даведаўся што яны з Арсен…м з…млякі што Арсень (не)кал(?)кі год вучыўся і працаваў у яго родным гора(д, дз)е час(?)цей прыса…ваўся ля ў…галоўя (А, а)рсеневага ло…ка.

*Т. Хадкевіч. «Песня Дзвіны»*
*(214 слоў)*

## Варыянт 2

***Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі. Устаўце прапушчаныя літары і знакі прыпынку.***

### Выпадак з бі…графіі

Андрэй Макаёнак ра…каз(?)вае пра такі выпадак (з, са) сваёй вае…ай бі…графіі.

Ён быў (у, ў) (К, к)рымскім д…сан(т, ц)е на (К, к)ерч…нскім (паў)востраве. Там яго раніла. Але яму пашанцавала як (н…)многім з таго трагічнага д…санту — удалося пераправі…а на Каўка…кі бера… у франтавы шпіталь.

Рашэ…е галоўнага хірурга (у, ва) умовах калі навакол сотні параненых калі няма час… доўга заду(?)вацца над кожным кароткае простае на ап…рацыйны стол. Суровы прысу… ампутац…я абе(д, дз)в…х ног. Можна ўявіць што а…чуў чалавек (у, ва) узрос(т, ц)е два…аці аднаго года пас(?)ля такога прысуд…, — чалавек (з, с) фантазі…й поўны душэўнай эн…ргіі высокіх парыва…яў імкне…яў. Заста…а бе… ног калека(й, м) на ўсё жы…ё… Але ўрач ніжэйшага ранг… які за двое сутак пас(?)пеў палюбіць жыцц…стойкага в…сёлага хлопца што (н…)гледзячы на ця…кае ране…е знахо(д, дз)іў сілы жартаваць шапнуў Андрэю (Н…) зга…айся на ампутац…ю. Гангрэны няма. Ногі можна ўратаваць. Няхай …вакуіруюць (у, ў) тылавы шпіталь.

Атакуючы (не)задоўга да сва…го ране…я н…мецкія пазіцыі Андрэй зняў (з, с) забітага н…мецкага афіц…ра парабе…ум і як пам…тны трафей прывё… яго ў пал…вой сум… ў шпіталь. Калі пры(і, й)шлі ўрачы і санітары (з, с) насілкамі каб забраць яго ў ап…рацыйную Андрэй паказаў ім парабе…ум.

У шпітал… (у, ў)зняўся вэрхал афіц…р камі…ар роты пагражае пісталетам абараняючы сва… ногі. (З, с)беглася ўсё начал(?)ства. Угаворы пагрозы хітрасці (н…)чога (н…)памагло. Мало…шы палітрук быў (не)пахісны і (н…)хто (не)адважыўся а…няць у яго зброю.

Галоўнаму хірургу напэўна …падабалася такая св…еасаблівая мужнас(?)ць маладога чалавека і ён загадаў тут(жа) на самалё(т, ц)е разам з паране…ымі ген…раламі адве…ці яго ў тылавы шпіталь. Ногі былі ўратаваны.

*І. Шамякін. «Партрэт чалавека, драматурга, сябра»*
*(233 словы)*

## Варыянт 3

***Дыктант.***

### Касачы

Калі прыязджаю дамоў у сваю вёску, абавязкова выберу хвілінку, каб наведацца ў бібліятэку. Не так рупіць паглядзець, якія там ёсць кнігі, ці пачытаць свежыя газеты, часопісы, а больш за ўсё цягне мяне само месца, дзе стаіць бібліятэка. Вабіць яно яшчэ з далекаватага пасляваеннага дзяцінства. Як помню сябе, дык не было таго дня, каб я не пабываў тут. На гэтым месцы, дзе цяпер бібліятэка, да вайны стаяла школа. Казалі, прыгожая была — цагляная, двухпавярховая — гонар не толькі нашых вяскоўцаў, але і суседзяў. Школу гэтую будавалі яшчэ пры цару.

Школы я зусім не памятаю: яна згарэла ў вайну. Потым, ужо адступаючы, літоўскія ці латышскія легіянеры спалілі і вёску. І пасля вызвалення людзі, будуючыся, разабралі мур згарэлай школы на цэглу для печаў. Таму нам, равеснікам вайны, на пацеху застаўся толькі высокі падмурак, дзе мы любілі гуляць у хованкі ды шукаць розныя абгарэлыя жалезкі, цвікі і выкалупваць імі з падмурка вапну, якой размалёўвалі ўсё, што трапляла пад рукі.

Але сама больш нам не давалі спакою кветкі. Пажарышча з усіх чатырох бакоў акружалі кусты бэзу, ружаў, шыпшыны. А ў двары, на колішніх клумбах — цяпер кругленькіх утравелых узвышшах — раскашавалі вяргіні і касачы. Касачы цвілі і жоўтымі кветкамі, і сінімі. Можна было толькі дзівіцца, як ацалела ўся гэтая прыгажосць ад пажару.

О, як нам, малым, тады хацелася нарваць лістатых галінак бэзу з белымі, ружаватымі, блакітнымі свечкамі іскрыстых суквеццяў, чырвоных, як жар, з непаўторным, саладзейшым за мядовы, пахам ружаў, каб хоць крыху аблегчыць і голад, і холад!

Але хоць і нічыйнае было гэтае багацце, дарослыя не дазвалялі нам калечыць такую прыгажосць. Казалі, што не мы саджалі, не нам і рваць, што, можа, тут яшчэ пабудуюць школу.

*І. Стадольнік. «Касачы»*
*(268 слоў)*

## ВАРЫЯНТ 4

***Дыктант.***

### Востраў слёз

Пасля бабінага лета, калі адыходзіць цяпло прасвечаных ужо халаднаватым сонцам асенніх дзянькоў, калі ў парках і скверах дагараюць клёны і патухаюць свечкі бярозак, калі дружна і густа сыплецца пасля начных замаразкаў лістота, надыходзіць сырая восеньская пара з дажджамі і пранізлівымі, парывістымі вятрамі, з-за якіх так не хочацца выходзіць з дома на вуліцу.

У такі вось шэры, дажджлівы дзень, гуляючы па Траецкім прадмесці, я выйшаў на ўзбярэжжа Свіслачы, акурат насупраць гарбатага моста, што калісьці злучаў два берагі нешырокай тут ракі. Гэта ўжо потым, у васьмідзясятых гадах, пачынаючы ад Палаца спорту, раскапалі, расшырылі рэчышча, пакінуўшы астравок, на які цяпер абапіраецца адным канцом стары гарбаты мост. Дзіўнае ўражанне пакідае гэты мост. Ён як параненая птушка з адным крылом. Перайшоўшы яго, бачыш, што дарогі далей няма — тупік. І адзінае, што ты можаш зрабіць, — гэта вярнуцца назад. Масты, як і дарогі, павінны кудысьці весці, а калі яны вось так неспадзявана абрываюцца ці заканчваюцца тупіком, то на душы застаецца адчуванне нейкай безвыходнасці і смутку.

Вось такое адчуванне было ў мяне на душы, калі, перайшоўшы цераз гарбаты мост, я апынуўся насупраць невялікага храма-помніка. Пад купалам з крыжам наверсе адлітыя ў бронзе постаці жанчын з жалобнымі тварамі самотна глядзелі на шэры асенні горад, на халодную, у рабацінні невысокіх хваляў, ваду Свіслачы. Кроплі дажджу сцякалі па іх тварах, і здавалася, што бронзавыя жанчыны плачуць.

«Востравам слёз» назвалі астравок у цэнтры Мінска пасля таго, як тут збудавалі гэты помнік. Помнік мацярынскага гора і жальбы па забраных у іх дзяржавай і забітых невядома дзе і невядома за што сынах.

Я раптам успомніў, што на той афганскай вайне загінуў і мой аднавясковец, сусед Сцяпан Сіліцкі. У памяці пачалі ўсплываць паўзабытыя малюнкі далёкага дзяцінства: палеская вёсачка над нешырокай рачулкай, усмешлівы, прыгожы афіцэр-танкіст з маленькай дзяўчынкай на руках.

*Сяргей Сцяпан. «Востраў слёз»*
*(287 слоў)*

## Кантрольная работа № 4

### Варыянт 1

**1.** ***Устаўце у ці ў.***

Памятная …ніверсіяда, Люблінская …нія, жыць ва …шачах, цёця …ладзя, прэзіды…м, бра…нінг, новая …ніформа, ма…залей, стра…с, а…дыторыя, Да…гава, кансілі…м, па…за, фа…на, ка…бой, а…кцыён, а…тограф, А…рора, ла…р, тры…мф, За…ралле, а…тсайдар.

**2.** ***Запішыце па-беларуску.***

Выигрыш, проигрыватель, нейрохирург, подойти, безынициативный, мастер, безымянный, ходатайство, найти, местоимение, подход, наниматься, заикаться.

**3.** ***Запішыце роднасныя словы для праверкі напісання зычных.***

**Узор:** *стужка — стужачка.*

Перабе…чык, ву…кі, пя…чаны, падстры…чы, разбе…, бара…біт, выла…ка, дзе…ка, бяро…ка, ло…ка, про…ьба, наро…, гру…ка, наўзры…, зы…ка, манта…, міра…, сле…, ры…ка, лё…ка, мала…ьба.

**4.** ***Перакладзіце на беларускую мову.***

Пьедестал, воробьи, бьёт, подъём, батальон, перья, разъярённый, съезд, семьянин, карьера, Водопьянов, здоровье, щавель, курьер, погода, Гурьев, Григорьев, миллион, верфью, меньше, созвездия.

**5.** ***Запішыце па 3 поўныя назвы беларускіх вышэйшых навучальных устаноў, заводаў, фабрык, тэатраў.***

**6.** ***Пастаўце наступныя назоўнікі ў родным і месным склонах.***

**Узор:** *горад — горада, (у) горадзе.*

Сухавей, хмызняк, самалёт, лоб, вецер, білет, Васіль, класіцызм, узгорак, аловак, грам, тыдзень, палац, Рагачоў, факультэт, калектыў, тэлефон, чай, Сяргей, Мазыр, міраж, скарб, рой, падручнік, Мележ, Калумб.

**7.** ***Раскрыйце дужкі.***

(Віцэ)прэзідэнт, (авія)білет, (аўта)прабег, (электра)сетка, (вела)трэк, (метэа)служба, (віцэ)губернатар, (лейб)драгун, (агра)тэхніка, (аўта)пілот, (штаб)афіцэр, (фота)дакумент, (неа)рэалізм, (мота)пяхота, (вела)гонка, (фота)студыя, (Бялыніцкі)Біруля, (Картуз)Бяроза.

**8.** ***Дапішыце канчаткі назоўнікаў.***

Дапамагу (Цімашэнка Вася), пазнаёмлюся з (Канапелька Галя і Шыла Каця), слухаў (Манюшка Алег), артыкул аб (Юрый Хадыка), падрыхтаваў падарунак (Марыя Недасека), жыў побач з (Анікеенка Коля), успомнілі (Пётр Мацвіеня), уручылі грамату (Дзюбайла Максім).

Репозиторий БГПУ

**9.** ***Утварыце прыметнікі з дапамогай суфікса -ск- ад прыведзеных назоўнікаў.***

Цюрых, Баранавічы, сусед, людзі, салдат, Брэст, Уладзівасток, Парыж, Чыкага, даследчык, універсітэт, ткач, Мухавец, камендант, лабарант, Гродна, восень, Любань, рыбак, Нью-Ёрк, Беласток, інгуш, турак, кіргіз, Налібокі, Глыбокае.

**10.** ***Спішыце, раскрываючы дужкі.***

(Адкрыта)здзеклівая ўсмешка, (паўднёва)ўсходні вецер, (шчыра)выказаныя думкі, (цёмна)шэрая качка, (вузка)калейная чыгунка, (права)бярэжныя землі, (светла)зялёная трава, (сардэчна)сасудзістая сістэма, (хлеба)булачныя вырабы, (мутнавата)зялёны колер, (адзіна)правільны вывад, (мала)вядомы верш, (чорна)бурая лісіца, (нямецка)рускі слоўнік, (чыгуна)ліцейны завод, (высока)развітая прамысловасць, (добра)ўпарадкаваная кватэра, (века)помныя дні, (праца)здольнае насельніцтва.

**11.** ***Спішыце, устаўце прапушчаныя літары. Раскрыйце дужкі.***

1. Думка аб Махнач… не давала спако… Лемяшэвічу. 2. Браце, адна ёсць дарога табе: шлях той у (праца) і ў (барацьба), заўжды з народам у (згода). 3. Тры дні ў іх не было ніякага (клопат). 4. Ад (іней) вішняк перахіліўся за парканы. 5. За акном ця…ка пагойдваюцца галінкі маладога (сад). 6. Усе сумавалі па вясёлым (гарманіст). 7. Усе будынкі ставіліся яшчэ пры (цар) (Гарох). 8. Аб (хлопец) ішла слава як аб найлепшым (студэнт). 9. Іван Васільевіч быў удзячны (дачка). 10. Да нашага (самалёт) сп…шаліся людзі. 11. Гадзіннік на (вежа) гулка выбіў дзве гадзіны. 12. Адна толькі Іванава халупа засталася, як уцёс на (Волга). 13. Захар ляжаў, углядаючыся ў той бок, дзе час ад час… чуўся трэск галля і нейкага бязладнага, паспешлівага рух… . 14. І без час… ў цвёрдай глебе спее грэчка і лянок. 15. У гэтым голасе не чутно ні задор… маладосці, ні злосці і крыўды сталага чалавек… .

## Варыянт 2

**1.** ***Устаўце у ці ў.***

А…тaралі, ваку…м, га…птвахта, пакга…з, шлагба…м, Ка…каз, ва …ніверсітэце, па…лін, аквары…м, аквана…т, ка…чэг, малады …нтэр-афіцэр, буда…нікі-…дарнікі, а…страліец, ла…рэат, шэдэ…р, сімпозі…м, ла…сан, джо…ль, па…днёва-…сходні, спяваць ва …нісон.

**2.** ***Запішыце па-беларуску.***

Поиронизировать, Таиланд, проигрывать, окраина, Таити, несущественно, автоинспектор, мединститут, санинструктор, придут, не иначе, исходный, разыгрывать.

**3.** ***Запішыце роднасныя словы для праверкі напісання зычных.***

**Узор:** *будка — будачка.*

Ка…ьба, ха…ка, лы…ка, маро…, дзя…ька, кні…ка, наро…, сле…чы, на лава…цы, у вёса…цы, сту…ка, разно…чык, гру…чык, палё…ка, галу…ка, пака…чык, зма…ка, мянта…ка, ука…ка, зага…ка, рэкар…смен.

**4.** ***Перакладзіце на беларускую мову.***

Восемь, четвёртый, пьеса, объявление, Закавказье, больше, Прокофьев, взморье, Кондратьев, Марьяна, Воробьёв, Дементьев, Мольер, Севилья, сафьян, барьер, барельеф, бриллиант, верховья, раздолье, обындеветь.

**5.** ***Запішыце па 3 поўныя назвы літаратурных газет, часопісаў, мастацкіх твораў, узнагарод, бібліятэк.***

**6.** ***Пастаўце наступныя назоўнікі ў родным і месным склонах.***

**Узор:** *сшытак — сшытка, (у) сшытку.*

Шакалад, бераг, народ, двор, арэшнік, поплаў, гнеў, эгаізм, абшар, час, грамадзянін, торф, калідор, ураган, даклад, авіяатрад, гушчар, алень, цукар, далягляд, Брэст, госць, Ігар, гараж, апетыт, суфікс, універмаг, верабей.

**7.** ***Раскрыйце дужкі.***

(Буда)Кашалёва, (Гусь)Хрустальны, (экс)чэмпіён, (штаб)кватэра, (прыма)балерына, (аўта)стаянка, (праца)дзень, (прэм′ер)міністр, (сарві)галава, (Дунін)Марцінкевіч, (Янаў)Палескі, (гідра)цэнтраль, (Цянь)Шань, (Днепра)пятроўск, (Нава)ельня, (авія)сувязь, (кілават)гадзіна.

**8.** ***Дапішыце канчаткі назоўнікаў.***

Працаваў з (Левановіч Андрэй), сябрую з (Кляўчэня Сярожа і Лапата Надзя), перадам пакеты (Лінкевіч Саша, Мажэйка Оля), вучыўся з (Яўсеенка Віця), сумую па (Глебаў Косця, Кананчук Таня), ездзілі з (Кісель Ганна і Грыцкевіч Алег).

**9.** ***Утварыце прыметнікі з дапамогай суфікса -ск- ад прыведзеных назоўнікаў.***

Барысаў, горад, Адэса, таварыш, латыш, узбек, Каўказ, жнівень, Гарынь, Лепель, дзівак, юнак, мецэнат, Тыбет, асветнік, кандыдат, Маларыта, выдавец, Смалявічы, Умань, Будапешт, фашыст, адвакат, дворнік, Арбат, чэркес, Каўнас, Галандыя, Буг, Грэнада, Добруш.

**10.** ***Спішыце, раскрываючы дужкі.***

(Адмыслова)зробленая рэч, (вышэй)згаданыя факты, (хутка)цечны дзень, (мала)выразны малюнак, (агульна)адукацыйная школа, (грамадска)карысная праца, (вышэй)сказаныя словы, (хутка)дзеючы прэпарат, (глыбока)думны выгляд, (шмат)павярховы дом, (густа)населены пункт, (чыста)вымытыя рукі, (мяса)малочная прамысловасць, (стара)славянская мова, (руса)валосая дзяўчынка, (торфа)брыкетны завод, (чарна)морскі клімат, (літаратурна)мастацкі часопіс.

**11.** ***Спішыце, устаўце прапушчаныя літары.***



Репозиторий БГМУ

1. Бабка Наста не спала, гаруючы аб дзед… Талаш… . 2. Вялікае задавальненне адчуў дзед Талаш пасля ўдалага стрэл… . 3. Ногі па калені тонуць у ружовай пене верас… . 4. Нідзе — ні агеньчык…, ні чалавечага голас… . 5. На сухіх галінках дуб… вольнай пташцы сесці люба. 6. Становішча бацькоў пры зяц… не такое моцнае, як пры сын… . 7. Замаркоціўся дзед, асабліва па Андрэ… . 8. Васіль даехаў да свайго надзел…, спыніў каня, саскочыў з воз… . 9. Роўненькая сце…ка дробных слядкоў прашыла раку ад бераг… да бераг… . 10. І неба, і зямля зліліся ў суцэльным віхр… снежнага пыл… і цемрадз… . 11. Захар з тугою паглядзеў на сіні зубчык лес…, які адсюль, з алешнік…, здаваўся далёкім і недасягальным. 12. Шум агн…, калі гарыць лес, чуваць за вярсту. 13. Моладзь пасля канцэрт… знайшла свае месца адразу. 14. Былі першыя дні верасн… . 15. Сена з атавы нават не дае таго водар…, які звычайна напаўняе луг у чэрвені.

## Варыянт 3

### Тэст

**1.** ***Адзначце словы, дзе пішацца канчатак -і ў давальным і месным склоне назоўнікаў адзіночнага ліку:***

1) мачыха; 4) біяграфія;
2) зямлянка; 5) заваёва;
3) пустыня; 6) дыскатэка.

**2.** ***Адзначце словы, дзе пішацца канчатак -ы ў давальным і месным склоне назоўнікаў адзіночнага ліку:***

1) медзяніца; 4) расянка;
2) абноўка; 5) дачка;
3) рака; 6) падказка.

**3.** ***Адзначце словы, дзе пішацца канчатак -у(-ю) у родным склоне назоўнікаў адзіночнага ліку:***

1) размаўляць пасля канцэрт...;
2) пільнуецца правіла пераход... ці пераезд...;
3) з параднага ўваход...;
4) каля драўлянага ганк...;
5) пачырванеў ад сорам...;
6) пах сасновага бор... .

**4.** ***Адзначце словы, дзе пішацца канчатак -а(-я) у родным склоне назоўнікаў адзіночнага ліку:***

1) выйшлі з Батанічнага сад...;
2) пераможца марафон...;
3) чалавек вялікага розум...;



Репозиторий БГПУ

4) сцежка пятляе пасярод луг... і лес...;
5) гоніць гусей з поплав...;
6) не варта спаць да абед... .

**5.** ***Адзначце словы, дзе пішацца канчатак -е ў месным склоне назоўнікаў адзіночнага ліку:***

1) адпачывае ў (санаторый);
2) сустрэліся ў (леспрамгас);
3) працуе ў (гай);
4) не стой на (дождж);
5) жыве пры (Кобец);
6) змешчаны ў (альбом).

**6.** ***Адзначце словы, дзе пішуцца падоўжаныя зычныя ў творным склоне назоўнікаў адзіночнага ліку:***

1) сенажаць;
2) вольнасць;
3) прыгажосць;
4) Пціч;
5) роўнядзь;
6) верф.

**7.** ***Адзначце словы, дзе пішацца літара ы:***

1) кошыч...к;
2) пясоч...к;
3) капялюш...к;
4) месяч...к;
5) арэш...к;
6) ганач...к.

**8.** ***Адзначце словы, дзе пішацца літара а:***

1) кубач...к;
2) дождж...к;
3) чалавеч...к;
4) ключ...к;
5) конч...к;
6) замоч...к.

**9.** ***Адзначце няправільна напісаныя словы:***

1) блокпост;
2) самалёта-вылет;
3) экспрэзідэнт;
4) лейбгвардыя;
5) сарвігалава;
6) Іванава-Палескае.

**10.** ***Адзначце чацвёртае «лішняе» слова:***

1) [1]суддзя, [2]дыпламат, [3]пракурор, [4]настаўнік (род назоўніка для абазначэння прафесіі);
2) [1]малайчына, [2]зазнайка, [3]выдатніца, [4]гарэза (тып скланення);
3) [1]варта, [2]стараста, [3]памочніца, [4]мінчанка (род назоўнікаў);
4) [1]ільвяня, [2]стрэмя, [3]сведка, [4]радыё (тып скланення);
5) [1]ТАСС, [2]ДТСААФ, [3]ТБМ, [4]ЭВМ (род);
6) [1]абцугі, [2]клешчы, [3]акуляры, [4]вітаміны (лік).

**11.** ***Адзначце назоўнікі, род якіх не супадае ў рускай і беларускай мовах:***

1) шампунь;
2) жырафа;
4) шынель;
5) піяніна;



Репозиторий БГМУ

3) лебедзь; 6) шаль.

**12.** ***Адзначце назоўнікі, лік якіх не супадае ў рускай і беларускай мовах:***

1) непаладкі; 4) манеўры;
2) вароты; 5) каноплі;
3) дзверы; 6) чарніла.

**13.** ***Адзначце назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў адзіночным ліку:***

1) вучнёўства; 4) жалеза;
2) атрад; 5) урачыстасць;
3) натоўп; 6) паліто.

**14.** ***Адзначце назоўнікі 2-га скланення:***

1) мужчына; 4) бервяно;
2) заданне; 5) метро;
3) дагавор; 6) антраша.

**15.** ***Адзначце выпадкі няправільнага дапасавання:***

1) неразборлівы подпіс;
2) непрыхаваная фальш;
3) залатая медаль;
4) шарсцяная шаль;
5) неабсяжная шыр;
6) старадаўні рукапіс.

**16.** ***Адзначце назоўнікі ніякага роду:***

1) канферансье; 4) хіндзі;
2) асарці; 5) авеню;
3) эмбарга; 6) мікада.

**17.** ***Адзначце назоўнікі мужчынскага роду:***

1) тарнада; 4) какаду;
2) фіяска; 5) кальрабі;
3) сорга; 6) цунамі.

**18.** ***Адзначце назоўнікі жаночага роду:***

1) алібі; 4) круп'е;
2) урду; 5) івасі;
3) рэле; 6) сапрана.

**19.** ***Адзначце назоўнікі 1-га скланення:***

1) маруда; 4) стайня;
2) ванная; 5) парахня;
3) запявала; 6) мацыёла.

**20.** ***Адзначце назоўнікі з памылковым напісаннем:***

1) дойлідства; 4) рэкруччына;

2) перабежчык; 5) Брэстчына;
3) верталётчык; 6) аб’езчык.

**21.** ***Адзначце назоўнікі, утвораныя суфіксальным спосабам:***
1) брытва; 4) узгорак;
2) падказка; 5) слухач;
3) пяцігодка; 6) атрыманне.

**22.** ***Адзначце назоўнікі, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам:***
1) падвячорак; 4) перапісваць;
2) контрнаступленне; 5) падвыванне;
3) БелАЗ; 6) неўгамонны.

**23.** ***Адзначце слова, якое не ўваходзіць у словаўтваральны суфіксальны рад:***
1) шкаляр; 4) пчаляр;
2) вясляр; 5) цясляр;
3) футляр; 6) разьбяр.

**24.** ***Адзначце словы, якія пішуцца з малой літары:***
1) (Дз, дз)ень адчыненых дзвярэй;
2) (А, а)льма-матар;
3) (Д, д)ом настаўніка;
4) твой сябар сапраўдны (Г, г)еркулес;
5) знойдзецца які-небудзь (М, м)ецэнат;
6) вывучаю мовы (У, у)сходу.

**25.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара:***
1) таварыс...кі; 4) інгу...скі;
2) балха...скі; 5) студэн...цкі;
3) беларус...кі; 6) вільнюс...кі.

**26.** ***Адзначце слова з памылковым напісаннем:***
1) слабадскі; 4) пухавіцкі;
2) узбецкі; 5) суражскі;
3) кандыдацкі; 6) чувашскі.

**27.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара*** *н****:***
1) гасцін...ы; 4) перамен...ы;
2) раўнабедран...ы; 5) свяшчэн...ы;
3) спалохан...ы; 6) раўнадзенствен...ы.

**28.** ***Адзначце словы, якія пішуцца разам:***
1) (конна)спартыўны; 4) (вечна)малады;
2) (сельска)гаспадарчы; 5) (даўно)мінулы;
3) (сімваліка)алегарычны; 6) (верхне)сілезскі.

**29.** ***Адзначце словы, якія пішуцца асобна:***
1) (вышэй)адзначаны;
2) (свежа)узараны;
3) (востра)дэфіцытны;
4) (геолага)разведачны;
5) (абсалютна)празрысты;
6) (рэзка)кантынентальны.

**30.** ***Адзначце няправільную форму прыналежнага прыметніка:***
1) ад братава сына;
2) Толін падарунак;
3) бабуліну параду;
4) Скарынін друк;
5) праметэеваму агню;
6) з жончынага крэсла.

## Варыянт 4

### Тэст

**1.** ***Адзначце словы, дзе пішацца ь:***
1) кон...скі;
2) смаргон...скі;
3) студзен...скі;
4) цянь-шан...скі;
5) лёген...кі;
6) фаніпал...скі.

**2.** ***Адзначце словы, якія пішуцца з вялікай літары:***
1) (А, а)ўгіевы стайні;
2) (Б, б)азедава хвароба;
3) (К, к)оласаўскі герой;
4) (Л, л)арысіна здароўе;
5) (Г, г)анкураўская прэмія;
6) (Б, б)роўнаўскі рух.

**3.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара:***
1) тавары...скі;
2) каўка...скі;
3) беларус...кі;
4) студэн...цкі;
5) інгу...скі;
6) вільнюс...кі.

**4.** ***Адзначце словы з памылковым напісаннем:***
1) слабацкі;
2) кандыдацкі;
3) узбецкі;
4) пухавічскі;
5) суражскі;
6) чувашскі.

**5.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара н:***
1) імен...ы;
2) драўлян...ы;
3) кішэн...ы;
4) фірмен...ы;
5) палымян...ы;
6) сцюдзён...ы.

**6.** ***Адзначце словы, якія пішуцца разам:***
1) (кіслародна)зварачны;
2) (свежа)спечаны;
3) (яўна)памылковы;
4) (ніжэй)прыведзены;
5) (выпукла)увагнуты;
6) (строга)канфідэнцыяльны.

**7.** ***Адзначце няправільную форму прыналежнага прыметніка:***



Рэпазітарый БДПУ

1) ад Алегава каня;
2) матчына дапамога;
3) Нінчын партфель;
4) пляменнікаву дому;
5) Рубіновічаў эцюд;
6) Кіплінгавы твор.

**8.** ***Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок:***
1) (нерацыянальна)размешчаны;
2) (ніжне)дняпроўскі;
3) (ніжэй)згаданы;
4) (прыўзнята)рамантычны;
5) (тэхніка)арганізацыйны;
6) (прычынна)следчы.

**9.** ***Адзначце лічэбнікі:***
1) [1]тры, [2]тройка, [3]тройчы, [4]трацічны, [5]трэці;
2) [1]пяты, [2]пяцярык, [3]пяцёрка, [4]пяць, [5]пятак;
3) [1]дзясяты, [2]удзесяцёх, [3]дзясятак, [4]дзесяць, [5]дзесяціна;
4) [1]сто, [2]адна сотая, [3]сотня, [4]соценны, [5]соты;
5) [1]шасцярня, [2]шасцярык, [3]шасцёра, [4]шосты, [5]ушасцёх.

**10.** ***Адзначце памылковыя формы лічэбнікаў:***
1) васьмістам бібліятэкам;
2) стам вучням;
3) двухстамі экзэмплярамі;
4) тры восьмых;
5) адна сёмая;
6) паўтары тоны.

**11.** ***Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы напісаны і ўжыты правільна:***
1) *Шасцідзесяціпяцігадовы* пенсіянер працаваў не горш за маладых.
2) Мы спыніліся на *трыстадвaццатым* кіламетры Маскоўскай шашы.
3) Я захапілася *двума* апошнімі аповесцямі Івана Шамякіна.
4) За *дзвюма* зайцамі пагонішся — ніводнага не зловіш.
5) *Сямёра* аднаго не чакаюць.
6) Карабель з *тысяча чатырыста дваццаццю* пасажырамі выправіўся ў падарожжа.

**12.** ***Адзначце словазлучэнні з граматычнымі памылкамі:***
1) за паўтара кіламетра;
2) дзве новыя кнігі;
3) тры шостых літра;
4) чатыры чыстых сшыткі;
5) абодвума рукамі;
6) з траімі сяброўкамі.



Репозиторий БГМУ

**13.** ***Адзначце сказы, у якіх лічэбнікі пішуцца з вялікай літары:***

1) Кацярына (Д, д)ругая вяла перапіску з французскімі мысліцелямі Вальтэрам і Дзідро.

2) Дзеці павіншавалі настаўніцу са святам (В, в)осьмае сакавіка.

3) У канцы (Д, д)ваццатага стагоддзя Масква адсвяткавала сваё васьмісотпяцідзесяцігоддзе.

4) Незлічоную колькасць ахвяр чалавецтву прынесла (Д, д)ругая сусветная вайна.

5) Улетку 1697 года ў Амстэрдам прыбыло рускае пасольства на чале з Пятром (П, п)ершым. (*І. Сац.*)

6) Мы з задавальненнем слухалі (П, п)ершую баладу Шапэна.

**14.** ***Адзначце сказы, у якіх трэба ўставіць склонавыя формы займеннікаў*** *самы (самая)**:***

1) Для паспяховага вырашэння справы трэба звярнуцца да ... дырэктара.

2) Хлопец падплыў да ... глыбокага месца ў возеры.

3) На ... справе, ці варта шуму ўся аблава? (*К-с*)

4) Ноч з 21 на 22 чэрвеня ... кароткая ў годзе.

5) Трэба ... змагацца за сваё месца пад сонцам.

6) Ад ... дзядзькі доўгі час не было ніякіх вестак.

**15.** ***Адзначце сказы з памылковым ужываннем займеннікаў:***

1) Ніхто іншы табе так не дапаможа, як бацька.

2) Будынак аказаўся нічым іншым, як кнігарняй.

3) Той нічога не страціць, хто нічога не мае. (*Прык.*)

4) Хачу падзякаваць за дапамогу вам, а нікому іншаму.

5) Не ўсё то збываецца, на што чалавек спадзяваецца. (*Прык.*)

6) Хто позна ходзіць, той сам сабе шкодзіць. (*Прык.*)

**16.** ***Адзначце выпадкі няправільна ўказанай пачатковай формы займеннікаў:***

1) самога — сам;
2) нечага — нішто;
3) кім-небудзь — хто-небудзь;
4) кімсьці — хтосьці;
5) самым — самы;
6) намі — вы.

**17.** ***Адзначце, займеннікі якіх разрадаў адсутнічаюць у творы:***

1) асабовыя;
2) зваротныя;
3) адмоўныя;
4) неазначальныя;
5) пытальныя;
6) указальныя.

**Крок**

Адзін крок — ад мяне да цябе.
Як шмат — адзін крок… Не пераадолець.
Не ўзяць далонь тваю ў рукі,
не прыціснуць да вуснаў.



Рэпазіторый БГПУ

Што змянілася?
Нічога не змянілася.
Ты зрабіла крок назад: усяго адзін крок.
Мне не зрабіць крок да цябе: сцяна.
Я размаўляю з табой, ты мне
ўсміхаешся.
Такая ж блізкая. Адзін крок.
Адзінае выратаванне: верыць, што
калі-небудзь ты зробіш адзін крок —
насустрач.

*В. Слінко «Апошні снег»*

**18.** ***Адзначце выпадкі няправільна ўтвораных форм дзеясловаў незакончанага трывання:***

1) прыкупіць — прыкупляць;
2) пахадзіць — пахаджаць;
3) прыклеіць — прыклейваць;
4) адламаць — адломваць;
5) падказаць — падказываць;
6) адпрасіцца — адпрашвацца.

**19.** ***Адзначце сказы, дзе ў дзеясловах трэба ўставіць літару і:***

1) Вова зусім не сором...цца, не баіцца яшчэ адной мянушкі, якая можа прыліпнуць да яго. (*Федар.*)

2) Міхал пругка падняўся на ногі, агледз…ў сцены будана. (*Федар.*)

3) Ізноў трэба хавацца! Толькі не ў куток — гэты праныра ўсё разгледз…ць. (*Федар.*)

4) Кожны раз новыя здарэнні, таму і нельга ўсяго прадугледз…ць. (*Я. М.*)

5) І кожны пазнаў бы, каб тады спецыяльна прыгледз…ўся. (*Я. М.*)

6) Вось прыгледз…мся спачатку, што тут яшчэ можна знайсці. (*Я. М.*)

**20.** ***Адзначце сказы, у якіх усе дзеясловы належаць да І спражэння:***

1) Жыць трэба не збоку, не з краю, браць зло і хлусню на таран і быць ручаём, што ўпадае ў народа свайго акіян. (*Л. Д.*)

2) Патапчык зразумеў, што зло мае многа варыянтаў: гэта і гультайства, і баязлівасць, і махлярства, і авантурызм, — і як мог змагаўся супраць гэтага зла. (*М. К.*)

3) Але і ў бальніцы Мікола Рыжанкоў рыхтаваўся да экзаменаў: то ляпіў, то маляваў партрэты хворых. (*М. К.*)

4) А за цёмным акном гуляў, сваволіў халодны вецер ды сыпаўся чысты, колеру беленькай мукі, сухі і шорсткі снег. (*Дал.*)

5) Мікола палюбіў анатомію і стараўся ведаць гэты нялёгкі прадмет як свае пяць пальцаў. (*М. К.*)

6) І ўсё цікава тут і нова: пабачыць іх, сваіх братоў, пачуць братэрскае іх слова, чым ён спаткаць цябе гатоў. (*К-с*)

Рэпазіторый БДМУ

**21.** ***Адзначце сказы, у якіх дапушчаны памылкі ў напісанні дзеясловаў:***

1) Р. Р. Шырма належаў да тых людзей, сустрэўшыся з якімі ўжо не хацелася расставацца. (*Шам.*)

2) Юнак з дзяцінства ўзненавідзеў прыгнёт і несправядлівасць.

3) У эпоху перамен больш за ўсё пакутвае культура — вечная бюджэтная палонніца.

4) Хлопчык вельмі ўзрадваўся нечаканай сустрэчы з былым аднакласнікам.

5) Віктар агледзеў мясціну, перагледзеў пер’е, то чорнае, то чорнае з белым. (*Я. М.*)

6) Ад Ніжэвіча, па сутнасці, нічога не залежала і не залежыць. (*В-х*)

**22.** ***Адзначце словазлучэнні з пераходнымі дзеясловамі:***

1) не прачытаў канспекта;

2) насыпаць цукру;

3) павітацца з настаўнікам;

4) здзекуецца з хлопца;

5) пазычыць грошай;

6) працаваць над сачыненнем.

**23.** ***Адзначце чацвёрты «лішні» дзеяслоў:***

1) [1]бегчы, [2]клікаць, [3]есці, [4]даць (спражэнне);

2) [1]адзначыць, [2]заўважыць, [3]праязджаць, [4]прыляцець (трыванне);

3) [1]фарміраваць, [2]накіраваць, [3]рэпеціраваць, [4]рэпрэсіраваць (спосаб утварэння);

4) [1]заедзьце, [2]лежыце́, [3]сцеражыце, [4]давайце (лад);

5) [1]апавядаць, [2]адсутнічаць, [3]замінаць, [4]гарантаваць (трыванне);

6) [1]сядзець, [2]лячыць, [3]зелянець, [4]церусіць (спражэнне).

**24.** ***Адзначце словазлучэнні з дзеепрыметнікамі:***

1) пякучыя слёзы;

2) пачырванелыя рукі;

3) трасіруючая куля;

4) ляжачы камень;

5) неабдуманы ўчынак;

6) пагодная восень.

**25.** ***Адзначце словазлучэнні з правільным ужываннем дзеепрыметнікаў:***

1) ідучы насустрач чалавек;

2) узрадаваны бацька;

3) выдаваўшаяся газета;

4) засеяная дзялянка;

5) пішучая машынка;

6) прыгарэлая бульба.

**26.** ***Адзначце сказы з памылковым ужываннем дзеепрыслоўяў:***

Репозиторий БГМУ

1) У 1271 годзе малады шукальнік прыгод з Венецыі Марка Пола выправіўся ў вандроўку, апісваючы ў сваіх мемуарах «Кніга цудаў» неверагодныя гісторыі. (*З друку*)

2) Разумеючы каштоўнасць прыроднага багацця Індыі, імператар Ашока выдаў шэраг указаў з мэтай абароны прыроды. (*З друку*)

3) Слухаючы чароўны голас маладога італьянскага спевака, мае думкі вярталіся да першага юнацкага кахання.

4) Таленавіты паэт, жывучы ў Мінску і бавячыся паблізу літаратурных колаў, не дужа часта дакучаў выдаўцам. (*Гардз.*)

5) Знайшоўшы пасля доўгага блукання лодку, вялікая радасць ахапіла хлопчыкаў.

6) Удыхаючы на поўныя грудзі свежае веснавое паветра, на душы ў Антона Рыгоравіча прыкметна палягчэла.

**27.** ***Адзначце выпадкі злітнага напісання прыслоўяў:***

1) выразаў (на)хаду;
2) кінуліся (на)пярэймы;
3) знаходзіцца (на)водшыбе;
4) зрабіць (па)свойму;
5) (так)сама дапамог;
6) уцякае (без)аглядкі.

**28.** ***Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з’яўляюцца прыслоўямі:***

1) Вучні расселіся на траве, *насупраць*, і пачалі расказваць, як здалі экзамен па беларускай літаратуры.

2) Будынак нашага ўніверсітэта знаходзіцца *насупраць* гандлёвага цэнтра.

3) І мы, вясёлыя, *дадому* прыцягнем кош баравікоў. (*К-с*)

4) Гаспадар з гаршком, у якім быў жар з вуголлем, уваходзіў у хату, абносіў гаршчок *уздоўж* сцен. (*Т. Кухаронак*)

5) Пайшоў Якуб дамоў *усцяж* ракі. (*Зар.*)

6) *Насустрач* бегла жанчына з малым дзіцем на руках. (*Наб.*)

**29.** ***Адзначце сказы, у якіх часціца*** *не* ***мае сцвярджальны сэнс:***

1) Не раз і не два пісалася ў літаратуры пра брылёўскі стыль. (*Янк.*)

2) Дзед бачыў, што роспытаў не трэба: кажа не хто, а настаўнік, тутэйшы чалавек. (*Янк.*)

3) Размова з Пятром Глебкам пра роднае слова была не проста карысная, цікавая. (*Янк.*)

4) Ён, гэты твор, быў не раман, не аповесць, а хроніка прыватнага жыцця. (*Дал.*)

5) Але чаго не зробіш, каб засцерагчы дарагога чалавека ад памылак. (*Асіп.*)

6) З крыніцаў тваіх вадзіцай ніколі не наталіцца. (*Э. Акулін*)

**30.** ***Адзначце пропускі, дзе часціца*** *ні* ***пішацца асобна:***

1) І да канца вайны н…$^{1}$ адзін з партызан н…$^{2}$ разу больш н…$^{3}$ зайшоў на гэты хутар. (*Янк.*)

2) Н…$^{1}$ дзіўна, што н…$^{2}$задоўга да развітання адзін з гасцей паказаў на тую, н…$^{3}$ агледжаную н…$^{4}$ адным госцем, палічку. (*Янк.*)

3) Цяпер вось н…$^{1}$ хочацца паўтарыць з ранейшага н…$^{2}$ воднага слова. (*Дал.*)

4) Калі вы такім, як я, н…$^{1}$ верыце, дык вы н…$^{2}$кому н…$^{3}$ верыце. (*Дал.*)

5) Н…$^{1}$ назад, н…$^{2}$ убок н…$^{3}$ пабяжыш: усюды тут ён як на далоні. (*Дал.*)

6) Ён [Сцяпан] н…$^{1}$ мог н…$^{2}$ зачапіцца наскамі ботаў за зямлю ды затрымацца, н…$^{3}$ падхапіцца і вырвацца: н…$^{4}$ меў н…$^{5}$ волі, н…$^{6}$ сілы. (*Дал.*)

## Кантрольная работа № 5

### Варыянт 1

**1.** ***Ад наступных колькасна-іменных злучэнняў утварыце складаныя прыметнікі і запішыце іх.***

**Узор:** *7 сутак — сямісутачны.*

18 тон, 378 кілаграмаў, 16 міліметраў, 25 гадоў, 28 дзён, 5–6 гадзін, 250 кватэр.

**2.** ***Ад колькасных лічэбнікаў утварыце парадкавыя і запішыце з імі словазлучэнні.***

**Узор:** *54 — пяцьдзясят чацвёрты год.*

816, 45, 214, 375, 35 000, 245 000 000, 19.

**3.** ***Спішыце сказы, выбраўшы патрэбны займеннік і паставіўшы яго ў адпаведным склоне. Укажыце разрады займеннікаў, якія ўжыты ў сказах.***

Дома Гаркуша (нейкі, ніякі) размоў са мной не заводзіў. Затое ў лесе яму абавязкова трэба было мяне знайсці, каб яшчэ раз на (ніякі, нейкі) новым прыкладзе паказаць мне, які ён цёрты-перацёрты жыццём «практык». Зоя павітаецца, а значыць, і я, павітаўшыся, магу кінуць ёй (нейкі, нейчы) жарт. Яна адкажа, глядзіш, (нішто, нешта) ўжо і завязваецца. Ну, а жарт сам на язык прасіўся: не страшна табе ісці лесам, а раптам ваўкі напярэймы? Але Зоя і брывом не павяла, адказала: «Цяпер не Піліпаўка, дык і (нейчы, ніякі) ваўкоў я не баюся».

*М. Кусянкоў. «Явар з калінаю»*

**4.** ***Утварыце ад указаных дзеясловаў формы 1-й і 2-й асобы множнага ліку абвеснага ладу і запішыце іх.***

Репозиторий БГПУ

Вазіць, стрыгчы, браць, берагчы, спаць, смяяцца, мыцца, араць, ляцець, пачаць, мачыць, маўчаць, падмесці.

**5.** ***Спішыце сказы. Выдзеліце суфіксы дзеепрыметнікаў, падкрэсліце аснову, ад якой дзеепрыметнік утвораны.***

1. Вецер шкуматаў на бабулі канцы зношанае шаліноўкі, пранізваў выцертае паліто, пачыналі стынуць ногі ў суконных бурках. 2. Яна ішла паўз самую канаву, забітую набрынялым у адлігу снегам. 3. Разбітая гусеніцамі трактароў і коламі грузавікоў селавая вуліца цягнулася на ўзгорак. 4. У заплюшчаных вачах плылі то сінія, то ружовыя туманы. 5. Адна за адной цягнуліся бясконцыя цёмныя зімы на замеценым снегам хутары. 6. Часам Аўдоцця друкаванымі літарамі піша лісты Паўліку.

*С. Грахоўскі. «А маці не спіць»*

**6.** ***Ад наступных дзеясловаў утварыце дзеепрыметнікі, выдзеліце суфіксы.***

Рассыпаць, вызваліць, устрывожыць, прачытаць, аб’ездзіць, разгледзець, адчыніць, замкнуць, сцерці, выкасіць, расказаць.

**7.** ***Ад дзеясловаў, што ў дужках, утварыце адпаведныя дзеепрыслоўі незакончанага або закончанага трывання, абазначце суфіксы дзеепрыслоўяў.***

1. Іван кінуўся ўбок, да маладой ялінкі, і, (прыгнуцца), выглянуў між галін: цераз бугор, (мільгаць) у траве спіной, па ягоных слядах імчалася аўчарка. 2. На хвіліну расслабіў мускулы, (старацца) раўней дыхаць. 3. Іван зацяў дыханне, (старацца) як найлепш пацэліць, і, трошкі не (падпусціць) сабаку да каменя, стрэліў. 4. Тады ён, амаль не (цэліцца), але фізічна (адчуваць) напрамак яго страшнага бегу, паспешліва стрэліў другі раз. 5. Не (злазіць) долу, яны стаіліся за альховым голлем на ўзлеску, (даць) трохі спачыць коням. 6. Але цяпер, (апынуцца) праз адно поле ад хаты здрадніка, Бураў адчуў, як нешта ў ім зноў паднялося ад нецярплівае крыўднае злосці. (*Паводле В. Быкава)*

**8.** ***Перапішыце, раскрываючы дужкі, падкрэсліце прыслоўі.***

1. Ноч была (па)летняму цёплая, зорная. 2. Івану Васільевічу (не)вельмі спадабалася, што стол рыхтуецца (за)лішне (па)святочнаму. 3. (У)рэшце маці адважылася зайсці ў Крэмль. 4. (З)боку, за маленькім столікам, сядзеў чырвонаармеец у зімовай шапцы. 5. (Па)вясноваму вясёлыя, клапатлівыя пары птушак завіхаліся кожная каля сваёй хаткі. 6. А (на)вакол усё ажывае ў прыродзе, цягнецца да святла. 7. (Не)узабаве Алёша пачуў каля рэчкі голас брата. 8. (У)начы ішоў дождж. 9. І вучні і настаўнікі з′явіліся (за)доўга да пачатку заняткаў. 10. Лемяшэвіч (міма)волі любаваўся Марынай Астапаўнай. (*Паводле І. Шамякіна*)



Рэпазіторый БДПУ

## Варыянт 2

**1.** ***Ад наступных колькасна-іменных злучэнняў утварыце складаныя прыметнікі і запішыце іх.***

**Узор:** *7 сутак — сямісутачны.*

70 гадоў, 95 кілаграмаў, 18 вагонаў, 17–19 аркушаў, 4 гадзіны, 10 месяцаў, 59 міліметраў.

**2.** ***Ад колькасных лічэбнікаў утварыце парадкавыя і запішыце з імі словазлучэнні.***

**Узор:** *84 — восемдзесят чацвёрты кабінет.*

200, 116, 64, 28 000, 399 000 000, 17, 87.

**3.** ***Спішыце сказы, выбраўшы патрэбны займеннік і паставіўшы яго ў адпаведным склоне. Укажыце разрады займеннікаў, якія ўжыты ў сказах.***

Напэўна, Гаркуша прадчуваў, што неўзабаве перад ім адбудзецца (нешта, нішто) вельмі цікавае, таму, не паказваючыся з-за дрэў, стаяў і назіраў за мною. Між тым спіне маёй халаднавата было не толькі ад ранішняй золкасці: уперадзе мяне падсцерагала грозная небяспека. Можа (нехта, ніхто) будзе смяяцца, але самы вялікі, (ніякі, нейкі) прыроджаны мой страх — гэта калі насустрач мне ідзе рагатая карова, не свая, канешне, а чужая: так і здаецца, што яна абавязкова пырне ў цябе рогам, ад якога няма (нейкі, ніякі) ратунку. Але хай бы і цяпер гэта была карова, а то ж куды горш: уперадзе, ля самай дарогі, навязаны быў пародзісты калгасны бугай. (*М. Кусянкоў. «Явар з калінаю»)*

**4.** ***Утварыце ад указаных дзеясловаў формы 1-й і 2-й асобы множнага ліку абвеснага ладу і запішыце іх.***

Глядзець, сцерагчыся, высыпаць, прынесці, сядзець, грузіць, касіць, святкаваць, дзьмуць, будзіць, палоць, знайсці.

**5.** ***Спішыце сказы. Выдзеліце суфіксы дзеепрыметнікаў, падкрэсліце аснову, ад якой дзеепрыметнік утвораны.***

1. Вечарам Арына Аляксееўна прыходзіла стомленая пасля вячэрняга прыёму хворых і абходу сваёй маленькай бальніцы. 2. Дома быў поўны парадак: да бляску выцерта памаляваная падлога, разасланы вясёленькія саматканыя палавічкі, на пліце паруе каструлька бульбы. 3. Старанна заплецены коскі ў Галінкі. 4. Па вадасцёку ў пазелянелую кадку струменіў прамень вады. 5. Аўдоцця ўспамінала першую пасляваенную вясну, упрэжаных у плуг жанчын, калі аралі адна адной соткі, а то і калгасны палетак. 6. Маці ляжыць з расплюшчанымі вачыма, слухае, як у запеччы

трашчыць цвыркун, як трымціць ад ветру незакітаваная шыба. *(С. Грахоўскі. «А маці не спіць»)*

**6.** ***Ад наступных дзеясловаў утварыце дзеепрыметнікі, выдзеліце суфіксы.***

Адрэзаць, апрануць, размясціць, акружыць, акрыць, засеяць, аклеіць, узрушыць, спаліць, адгарадзіць, надтачыць, распілаваць.

**7.** ***Ад дзеясловаў, што ў дужках, утварыце адпаведныя дзеепрыслоўі незакончанага або закончанага трывання, абазначце суфіксы дзеепрыслоўяў.***

1. Грыша пакінуў свайго канька і, болей (зацікавіцца) госцем, пачаў разглядаць Бурава. 2. Нібы (прыпомніць) што, Сушчэня павярнуўся, таропка пацалаваў жонку і рашуча ступіў да дзвярэй. 3. (Страсянуць) капешкай густых валасоў, Марыя падхапіла пад руку сяброўку, і яны, (памахваць) кошыкамі, схаваліся за вуглом суседскае хаты. 4. (Старацца) не кульгаць, Агееў няспрытна ступіў тры крокі з альтанкі і выпрастаўся, (падумаць), што оберст, мабыць, хоча яму падзякаваць. 5. (Выкладваць) са скрынкі інструмент, Агееў маўчаў, усё яшчэ (прыкідваць), як паводзіць сябе, за каго выдаваць. 6. (Устаць) рана, ён абышоў двор. 7. (Разгарнуць) анучку, Агееў сцёр даланёй слабы налёт іржы на затворы. (*Паводле В. Быкава)*

**8.** ***Перапішыце, раскрываючы дужкі, падкрэсліце прыслоўі.***

1. Жанчына, з якой Вольга амаль параднілася за кароткі час, зрабіла незвычайнае ўражанне, яна (не)як (па)свойму, (па)жаночаму дапоўніла тыя асаблівыя пачуцці, якія, магчыма, (у)першыню з'явіліся (у)восень перад калючым дротам лагера… 2. (Ад)некуль дыхнуў ветрык, і загаманілі маладыя дубы. 3. Вясна надышла (не)чакана, (на)суперак прагнозу, які дало бюро надвор'я. 4. Тры дні не (па)сакавіцку, а (па)майску пякло сонца. 5. Сухаверхая сасна стаяла ў калгасным двары, (як)раз (на)супраць канюшні. 6. (У)летку берагі так зарастаюць травой, што і (з)блізку не відаць вады. 7. Максім ішоў (уз)боч, махаючы пугай. 8. Чатыры гады (што)дзень глядзелі яны смерці ў твар. 9. (Па)сярод паляны стаялі два стажкі сена; адзін з іх быў так абскубаны (з)нізу, што нагадваў грыб. 10. Аляксей (так)сама злавіў двух шчупакоў. (*Паводле І. Шамякіна)*

## Варыянт 3

### Тэст А

**А1.** ***Адзначце словы, вымаўленне якіх не супадае з напісаннем:***

| | |
|---|---|
| 1) запрэжка; | 4) каўчук; |
| 2) палягчэла; | 5) дубок; |
| 3) імкнешся; | 6) не піша. |

**А2.** ***Адзначце словы, у якіх аднолькавая колькасць літар і гукаў:***

| | |
|---|---|
| 1) лялька; | 4) утрапенне; |

2) нацыянальны; 5) узброіць;
3) ядловец; 6) ёдзісты.

***А3. Адзначце словы, у якіх пішацца літара я:***
1) м...стачковы; 4) л...гіраванне;
2) м...цёлка; 5) к...лейна;
3) л...горн (парода курэй); 6) Васн...цоў;

**А4.** ***Адзначце словы, у якіх пішацца літара е:***
1) к...дроўнік; 4) Сен...гал;
2) кв...цісты; 5) бук...ніст;
3) с...рвант; 6) тыс...ча.

**А5.** ***Адзначце словы, дзе пішацца літара э:***
1) галіф...; 4) д...сцыпліна;
2) д...сант; 5) др...мучы;
3) р...сора; 6) пан...ль.

**А6.** ***Адзначце словы, у якіх пішацца літара у:***
1) гуляць ... футбол; 4) кансілі...м;
2) са...на; 5) а...дыторыя;
3) кента...р; 6) хачу ...бачыць.

**А7.** ***Адзначце словы, у якіх пішацца літара о:***
1) р...знапланавы; 4) п...ўнаметражны;
2) р...знасцежаны; 5) м...налог;
3) п...ўнагучна; 6) м...тапіла.

**А8.** ***Адзначце словы, у якіх пішацца літара а:***
1) мн...гагалосы; 4) п...ўнакроўна;
2) м...ватворчы; 5) в...даналіўны;
3) ф...таатэлье; 6) с...балегадоўля.

**А9.** ***Адзначце словы, у якіх пішацца літара з:***
1) во...чык; 4) но...ьбіт;
2) а...бест; 5) падка...ка;
3) про...ьба; 6) у...чаць.

**А10*.*** ***Адзначце словы з фанетычным падаўжэннем:***
1) спозніцца; 4) трымацца;
2) тлумачэнне; 5) беззапаветны;
3) каменны; 6) раздолле.

**А11.** ***Адзначце словы, у якіх пішацца літара т:***
1) балас...ны; 4) разнамас...ны;
2) дробнапамес...ны; 5) аблас...ны;
3) помс...лівы; 6) кантрас...ны.



Репозиторий БГПУ

**А12.** ***Адзначце словы, якія пішуцца з вялікай літары:***

1) (З, з)еўсаў гнеў;
2) (С, с)іямскі заліў;
3) (Г, г)лаўберава соль;
4) (Н, н)авагоднія віншаванні;
5) (М, м)іністр сацыяльнай абароны;
6) (Г, г)анаровае званне.

**А13.** ***Адзначце словазлучэнні, у якіх назоўнікі маюць канчатак -у(-ю):***

1) вылецела з (лазняк);
2) вярнулася яснасць (розум);
3) пасля ўзнёслага (маналог);
4) пад'ехаў да роднага (аул);
5) чакае адказу (гаспадар);
6) вызваліў з абрыдлага (хамут).

**А.14.** ***Адзначце словазлучэнні, у якіх назоўнікі маюць канчатак -а(-я):***

1) лямпа без (абажур);
2) на чале (атрад);
3) раскупілі за першы дзень (продаж);
4) заўсёды не стае (час);
5) вярнуўся з германскага (палон);
6) па праве нявольніцкага («стаж»).

**А15.** ***Адзначце словы, у якіх пішацца мяккі знак:***

1) вішан...ка;
2) прыедз...це;
3) п...еса;
4) Вадап...янаў;
5) бар...ер;
6) з дзец...мі.

**А16.** ***Адзначце выпадкі няправільнага чаргавання зычных у аснове слова:***

1) сыпаць – сыплю;
2) малако – у малацэ;
3) рука – у руке;
4) дарога – у дароге;
5) усміхацца – смяшынка;
6) глотка – у глотке.

**А17.** ***Адзначце выпадкі, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў пераносным значэнні:***

1) светлая галава;
2) вые завіруха;
3) чорная здрада;
4) жалезная рыдлёўка;
5) залаты пярсцёнак;
6) дарагое манто.

**А18.** ***Адзначце складаныя словы, якія пішуцца праз злучок:***

1) блок...сігнал;
2) дзярж…гандаль;
3) крэсла…ложак;
4) борт…радыст;
5) салон...магазін;
6) Эпімах...Шыпіла.

**А19.** ***Адзначце складаныя словы, якія пішуцца разам:***

| | |
|---|---|
| 1) хлеба...булачны; | 4) робата...тэхніка |
| 2) ваенна...транспартны; | 5) статус...кво; |
| 3) рэзка...кантынентальны; | 6) ландшафтна...кліматычны. |

**А20.** ***Адзначце радкі, дзе ўсе назоўнікі адносяцца да 1-га скланення:***

1) навіна, пакупка, ралля, дзядуля;
2) абранніца, Тамара, гарэза, галіна;
3) кантора, біяграфія, даліна, казна;
4) знаёмства, трывога, суддзя, настаўніца;
5) прынцэса, гісторыя, туляга, шаля;
6) пастава, рэдакцыя, гаспадыня, цеплыня.

**А21.** ***Адзначце выпадкі няправільнага дапасавання:***

| | |
|---|---|
| 1) едкі гар; | 4) разбуральнае сірока; |
| 2) балючы мазоль; | 5) чыгуначная насып; |
| 3) мудрае гуру; | 6) тлустая гусь. |

**А22.** ***Адзначце дзеясловы, якія ў 3-й асобе множнага ліку маюць канчаткі** -уць, -юць**:***

| | |
|---|---|
| 1) адмераць; | 4) нацярушваць; |
| 2) высветліць; | 5) саромецца; |
| 3) вяршыць; | 6) вызначаць. |

**А23.** ***Адзначце радкі, дзе ўсе дзеясловы адносяцца да I спражэння:***

1) кідаць, лупіць, гаманіць;
2) распрацаваць, папярэдзіць, адкрыць;
3) памятаць, вяртаць, разумець;
4) стушыць, увасобіць, хістаць;
5) хварэць, пакараць, муштраваць;
6) нагрэцца, адагнаць, збочваць.

**А24.** ***Адзначце выпадкі напісання прыслоўяў разам:***

1) рабіць усё па...гаспадарску;
2) будзе дырэктыва з...верху;
3) па...другое, злыселы лес зарасце;
4) будзем жыць па...асобку;
5) зляцеў з сядла на...скаку;
6) на...дзіва выхаваны.

**А25.** ***Адзначце выпадкі напісання прыслоўяў праз злучок:***

1) апынуліся на...версе піраміды;
2) ставілі па...новаму;
3) заступіцца па...сапраўднаму;
4) дзяліліся ўсім па...зямляцку;
5) дасталі вугаль на...гара;



Репозиторий БГМУ

6) вёска на...супраць лесу.

**А26.** ***Адзначце сказы, у якіх часціца*** *не* ***пішацца асобна на месцы ўсіх пропускаў:***

1. У Вялікім княстве Літоўскім, як (н...)дзіўна, напачатку зусім (н...)было сваіх грошай, калі (н...)лічыць малюсенькія срэбныя манеткі — дэнарыі — вагою менш за адзін грам. (*Федар.*)

2. Як бы цяжка яму (н...)было ў жыцці, Іван назапашваў у сваёй душы цеплыню і пяшчоту. (*«Полымя»*)

3. Пастаўлю, бывала, свой ровар у школе пры акне і ўвесь урок гляджу: хаця б хто чаго (н...)адкруціў ці, (н...)дай Божа, украў. (*Кам.*)

4. Васіль (н...)думаў, што гэта зямля (н...)яго, а пана Календы. (*Дубр.*)

5. Як Фёкла (н...)стрымлівала сябе, вочы яе напоўніліся слязьмі. (*Гн.*)

**А27.** ***Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх даданая частка звязана з галоўнай пры дапамозе злучальнага слова:***

1. Пясчаны бераг, куды выйшлі жанчыны, збягаў перакатам пад ваду. (*Самахв.*)

2. Чутно было, як за вокнамі нехта трэнькаў на балалайцы. (*Гн.*)

3. Яшчэ з гары, дзе быў замак Паскевіча, я ўбачыў унізе белы-белы карабель. (*Бар.*)

4. Ды і сяляне не цураліся хаты Багушэвіча, бо і гаворыць іхняй мовай, і справы хутка вырашае. (*Сод.*)

5. Калі ўсе коннікі выехалі на круг, падаецца новая каманда. (*Дубр.*)

**А28.** ***Адзначце сказы, якія адпавядаюць схеме: «П! – а. – П».***

1. Нарэшце мой бацька перапыніў маўчанне трэба будзе заўтра даведацца што дзеецца ў Гараськавай хаце. (*Барыч.*)

2. Вазьмі гэты кавалачак сынок гаварыла маці збіраючы мяне ў дарогу мы тут як-небудзь а табе трэба вучыцца. (*Дам.*)

3. У мяне хутка ваенная рада гучна папярэдзіў Міндоўг кажы хутчэй што табе трэба. (*В. Іп.*)

4. Хіба імя можа прадракаць лёс здзівіўся Жадан бацькі ж даюць яго як ім захочацца. (*В. Іп.*)

5. Я ўжо не дзіця з прыкрасцю адрэзаў Альгерд ідзі дасынай. (*В. Іп.*)

**А29.** ***Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ставіцца коска:***

1. Марысі Сцяпанавы словы ... як мёд на душу. (*Дал.*)

2. Праўда, спачатку панна Ванда цуралася мяне ... як чорт крыжа. (*Дал.*)

3. А цяпер скажу ... Бог не пакрыўдзіў Халяўшчыну зямлёй. (*Дубр.*)



Рэпазіторый БДПУ

4. Канстанцы аглядаў экспанаты культур разам з Люцыяй і больш глядзеў на яе... чым на тыя культуры. (*Дубр.*)

5. Аканом Бржазоўскі ўсё разумеў ... і сам агледзеў выстаўленыя культуры і запісаў іх гаспадарчую карысць (*Дубр.*)

**А30.** ***Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску не ставіцца коска:***

1. Фелікс Кульбакоўскі быў яшчэ малады... як гаспадар і як чалавек. (*Дубр.*)

2. Калі, нарэшце, усё было скончана... і стомлены фельчар цяжка апусціўся на камень каля вогнішча, Айшэ наважылася, падышла да Рэната. (*В. Пр.*)

3. І так балюча мне і горка... што маці ўслед не памахае... (*Башл.*)

4. Тонкі сатырык і гуманіст ... Вячаслаў Дубінка ў сваіх аповесцях імкнецца выкрыць зло, скінуць з носьбітаў яго маску дабрачыннасці, паставіць іх да ганебнага слупа. (*«ЛіМ»*)

5. Мусе не верылася, што ўсё абышлося... і сямейная рэліквія засталася на месцы. (*В. Пр.*)

**А31.** ***Адзначце ўскладненыя простыя сказы:***

1. А сёння нікога не здзіўляе, што за некалькі гадзін можна апынуцца на другім кантыненце. (*В. В.*)

2. Узрушаны, захоплены ўзнёсла-радасным хваляваннем, Іван Серада ўпершыню пасля некалькіх месяцаў, праведзеных у дыспансеры, ужо на «сваіх нагах» крочыў па Мінску. (*В. Пр.*)

3. Пры хаце Арыны быў маленькі агародзік, ускопваць які памагалі суседзі. (*Дубр.*)

4. Фельчар Ахрэм Калінчук не падпусціў гайдукоў да дзяўчыны і сказаў пану Календу, што ён даў клятву Гіпакрата лячыць усіх хворых, хто мае ў гэтым патрэбу, нават сваіх ворагаў. (*Дубр.*)

5. Арына штораніцы, устаўшы з пасцелі, і ўвечары, стоячы на каленях перад абразікам Божай Маці, горача малілася за здароўе Васіля, за яго вяртанне. (*Дубр.*)

**А32.** ***Адзначце сказы, у якіх адсутнічаюць патрэбныя знакі прыпынку:***

1. Завязаў сабе свет з нялюбай жанчынай ні за што ні пра што. (*Дубр.*)

2. Увосень недзе пад Пакровы, калі ўраджай, у тым ліку і бульбы, быў сабраны, Вінцэнт Календа атрымаў ад аграномa Рубцэвіча запрашэнне прыняць удзел у семінары. (*Дубр.*)

3. Кажаце, на гэтай зямлі кветкі і тыя не прыжывуцца? (*Дуб.*)

4. Мост расставіў магутныя ногі-апоры, перакінуўшы шырокія плечы з аднаго берага ракі на другі. (*Дуб.*)

5. Вярніся лёгкай птушкай маладосць! (*Д. Бічэль*)

**А33.** ***Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ставіцца коска:***

1. Іван на адным дыханні, перасільваючы нясцерпны і нейкі рыпучы боль, пераадолеў апошнія дзесяць прыступак і адчуў, што ... калі зараз жа не сядзе, не дасць нагам адпачыць, то больш ніводнага кроку зрабіць не зможа. (*В. Пр.*)

2. Што такое драўляная кабыла ... і для чаго яна патрэбна ў памешчыцкім двары, Філюцін ведаў і без Васіля. (*Дубр.*)

3. Ніхто ў палку ... апроч самых блізкіх сяброў ... не ведаў, што камандзір узвода з'яўляецца членам арганізацыі дзекабрыстаў. (*Дубр.*)

4. На кніжных паліцах ... нягледзячы на пэўныя цяжкасці... з'яўляюцца зборнікі паэзіі. (*«Полымя»*)

5. Дождж імжыць ужо некалькі дзён ... і на свеце так нудна і шэра. (*Н. Арсеннева*)

**А34.** ***Адзначце сказы, у якіх пішацца часціца*** *не:*

1. Цяпер н... лес вабіў Васіля, а цягнула жаданне ўбачыць Арыну. (*Дубр.*)

2. Разарваныя каласы ніколі н... стануць жыць на адной сцябліне. (*Дубр.*)

3. Як тут н... будзеш ладзіць з навукай пасля такога падарунка?! (*Кам.*)

4. Што б мне н... пагражала, я павінен абараніць маці і сястрычак. (*І. Сачук*)

5. Куды н... глянь — усё ў настроі і ў добрай згодзе між сабою. (*К-с*)

**А35.** ***Адзначце сказы, у якіх пішацца часціца*** *ні:*

1. Юнак хоць і вырас у вёсцы, але н... разу не ездзіў конна. (*Дубр.*)

2. Н... ва ўсіх выскокванне на хаду з сядла «рыбкай» выходзіць гладка. (*Дубр.*)

3. Эх, выйдзі ў поле, брат, дасвету: н... будзеш каяцца ніколі. (*К-с*)

4. Кінуўся вядзьмак да дзвярэй, ціскануў на клямку — дзверы н... з месца. (*Казл.*)

5. У паводзінах сінічкі няма н... кропелькі боязі. (*І. Сачук*)

**А36.** ***Адзначце сказы, у якіх адасобленыя члены могуць выдзяляцца як коскамі, так і працяжнікамі:***

1. Убачыўшы конных цівуноў... людзі кідалі работу і разбягаліся па полі хто куды. (*Дубр.*)

2. Доўга стаяць пад дрэўцам... узгадваючы даўнейшае дзядулю не давялося. (*А. Масла*)

Репозиторий БГПУ

3. Крысціна.... Васілёва маці.... устрывожылася і расказала пра сынавы паводзіны бацьку. (*Дубр.*)

4. Старэйшы брат Вінцэнта... біскуп Ян... настойліва раіў яму не ленавацца і з’ездзіць у павятовую земскую ўправу. (*Дубр.*)

5. Паводле статыстыкі... скарбы знаходзяць або людзі выпадковыя, або дзеці. (*Федар.*)

**А37.** ***Адзначце сказы, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку:***

1. Што з намі здарылася і хто ў гэтым вінаваты? (*Лоб.*)

2. Лявон хацеў паклікаць санітараў, каб дапамаглі Навумчыку, але той, здаецца, ужо ачомаўся і праз нейкі час яны дабраліся-такі да сваіх акопаў. (*Гн.*)

3. Праз пэўныя прамежкі часу ў неба ўздымаліся зялёныя ракеты — тады ўсё наваколле асвятлялася прывідным жоўта-зялёным святлом. (*Гн.*)

4. Цётка Маня, напэўна ж, пакрыўдзілася, што яна, Галка, будзе святкаваць свой дзень нараджэння дзесьці ў чужых людзей, хай сабе і ў сяброў. (*Р. Бар.*)

5. Васіль не ведаў адбудавалася вёска, ці не. (*Дубр.*)

**А38.** ***Адзначце складаназалежныя сказы з паслядоўным падпарадкаваннем:***

1. Калі я добра адказвала на пытанні і мяне хваліў настаўнік, здавалася, што і бярозы радаваліся разам са мной. (*Лоб.*)

2. Настаўнік наш прасіў партызан, што наведваліся ў вёскі, каб раздабывалі для нас паперу і кнігі. (*Лоб.*)

3. Па-мастацку ўдала выражае Я. Драздовіч гістарычную тэму ў сваіх графічных і жывапісных творах, што з’яўляюцца адначасова і вынікам археалагічных даследаванняў, якія ён пачаў праводзіць у 1919 г. на беразе ракі Нямігі ў Менску. (*Ю. Малаш*)

4. Калі б запісаў беларускія, рускія, украінскія, польскія, іншыя славянскія песні, якія ведае і спявае Янка Брыль, атрымалася б цікавая і аб’ёмная анталогія народнай славянскай песні. (*Янк.*)

5. Недзе там, за высокімі соснамі, высіўся пятнаццаціпавярховы гмах, на верхатуры якога і знаходзілася мая майстэрня. (*Бар.*)

**А39.** ***Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ставіцца працяжнік:***

1. Жыццё і творчая дзейнасць Напалеона Орды ... яскравая старонка гісторыі нацыянальнай культуры. (*Кул.*)

2. Вочы Ластоўскага ... халодныя, чорныя. (*А. Лойка*)

3. «Заклятая кветка» Янкі Купалы ... верш пра купальскую ноч. (*А. Лойка*)

4. Сціпласць і бескарыслівасць, разнастайнасць высакародных інтарэсаў, няспынная цікавасць да лёсу роднага краю... усё гэта якасці чалавечай постаці буйнога асветніка і мысліцеля. (*Кул.*)

5. Сяржант міліцыі, ці, як кажуць, сяржант службы парадку, убачыў ... на плошчу выйшлі, пабраўшыся пад рукі, тры немаладыя мужчыны. (*Янк.*)

**А40.** ***Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ставяцца дужкі ці працяжнікі:***

1. Рабочыя адразу заўважылі ў новым памочніку ... пры яго непаспешлівых жэстах і рухах ... уважлівасць, цікавасць да кожнага з іх. (*А. Лойка*)

2. У Барысаўскім раёне ... як паведаміла адна з перадач Беларускага тэлебачання ... мясцовы трактарыст знайшоў у лесе перадатчык з аэрастата, запушчанага ў Заходняй Еўропе.

3. А пад канвоем арыштантаў вялі ... гэта і пані Міраслава бачыла, і паэт ... міма бровара на Нясвіж, Мінск ледзь не штодня. (*А. Лойка*)

4. Пра паўстанне Спартака Піліп ведаў яшчэ з прафесарскай лекцыі ў Самарскім універсітэце ... было гэта ў 1920 годзе. (*Гн.*)

5. Цікава .... падумалася мне ў размове з дасведчанай субяседніцай ... а як пачуцці і асобныя словы ўздзейнічаюць на почырк? (*«ЛіМ»*)

## Тэст В

**В1.** ***Адзначце, якая памылка дапушчана ў сказе:***

*Ёсць на свеце вечныя каштоўнасці: каханне, вернасць, спагада, што былі і пры Гамеры, пры Шэкспіры, пры Чэхаве... (М. Ю.)*

1) арфаграфічная; 3) лексічная;
2) пунктуацыйная; 4) граматычная.

**В2.** ***Адзначце словазлучэнні, у якіх від сувязі — дапасаванне:***

1) заўважыў памылку; 4) ляціць высока;
2) тры гады; 5) спрацаваныя рукі;
3) сіняя кветка; 6) сядзіць на дубе.

**В3.** ***Адзначце сказы з граматычна-стылістычнымі памылкамі:***

1. Убачыўшы непрытомную Арыну на зямлі, Сабіна паслала сваіх дзяўчат па фельчара. (*Дубр.*)

2. Прыйшоў фельчар, агледзеў дзяўчыну і налажыў на пераламаную нагу ляшчоткі. (*Дубр.*)

3. Я зусім абыякава выслухаў земляковы словы: «Не ведаю што, голад ці холад, але нехта з іх пагоніць яшчэ вас некалі назад у вёску». (*Кам.*)

4. Аўтадарожнікі па заканчэнні вучобы жаніліся на медычках. (*Шам.*)

5. Пасля, праз паўтары гады, Маша з вясёлым смехам прызналася, што не паверыла ніводнаму слову з майго дзённіка. (*Шам.*)

**В4.** ***Адзначце сказы з памылкай ва ўжыванні ступені параўнання прыметніка:***

1. Гул баёў станавіўся гучнейшы. (*Гур.*)
2. Старэйшыя дзяўчаты рыхтавалі букеты. (*Гур.*)
3. Адразу за Мішам Андрэй пачаў расказваць больш весялейшую гісторыю.
4. Усё гэта паклёп самай чысцейшай вады.
5. Хто ж не ведае, што цёплае паветра лягчэй за халоднае і заўсёды падымаецца ўгару.

**В5.** ***Адзначце выпадкі, дзе лексічнае значэнне слова ўказана правільна:***

1. Агракультура — сістэма мерапрыемстваў, накіраваных на паляпшэнне тэхнікі паляводства, павышэнне культуры земляробства.
2. Эскалатар — збожжасховішча з механічным абсталяваннем для прыему, ачысткі, сушкі і адгрузкі зерня.
3. Элегічны — сумны, журботны, летуценны.
4. Шкіпер — вадкасць з едкім пахам, якая здабываецца перагонкай смалы хвойных дрэў.
5. Феерыя — каляровыя агні ў паветры, якія атрымліваюцца пры спальванні парахавых сумесей у час святаў, урачыстасцей.

**В6.** ***Адзначце радкі, у якіх першае слова з'яўляецца запазычаным, а другое ўстарэлым:***

1) пашпарт, тастамент;
2) спрынтар, гармонік;
3) пацыфіст, чэлядзь;
4) поліфанія, біяграфія;
5) парэнчы, негацыянт.

**В7.** ***Адзначце сказы з састаўным дзеяслоўным выказнікам:***

1. Сястрычкі справіліся з пасяўной і сталі чакаць вызвалення. (*Гур.*)
2. Дзяцей папрасілі рваць кветкі на лузе і складаць ля сваіх хат. (*Гур.*)
3. У той ліпеньскі дзень Герхард быў вельмі пануры. (*Лоб.*)
4. Вікенцій Паўлавіч быў задаволены сваім ранішнім крокам, першым у гэтых сценах (*Шам.*)
5. Губернатар не хацеў верыць таму, што ў пісьме. (*Шам.*)

**В8.** ***Адзначце абагульнена-асабовыя сказы:***

1. З той пары прайшло шмат гадоў. (*Кам.*)
2. Мне з табою ніяк не расстацца.
3. Сем разоў адмерай — адзін раз адрэж. (*Прык.*)
4. Цяжкія гронкі рабіны. Цяжкія алычыны.
5. Старога вераб'я на мякіне не правядзеш. (*Прык.*)

**В9.** ***Выпішыце слова, якое ў прыведзеным радзе з'яўляецца лішнім:*** распіска, заява, даверанасць, аўтабіяграфія, рэпартаж.

**В10.** ***Запішыце запазычаны назоўнік з наступным лексічным значэннем:*** твор паклёпніцкага, зневажальнага характару.

## Варыянт 4

### Тэст А

**А1.** ***Пастаўце па алфавіту наступныя прозвішчы:***

1 — Рубенс. 2 — Маракоў. 3 — Багрыцкі. 4 — Хомчанка. 5 — Васняцоў. 6 — Баравік. 7 — Чыгрынаў. 8 — Рафаэль. 9 — Вашчанка. 10 — Савіцкі. 11 — Дайнека. 12 — Траццякоў. 13 — Лужанін. 14 — Ялугін.

**А2.** ***Адзначце словы, у якіх вымаўленне не супадае з напісаннем:***

1) зборнік;
2) паўстанне;
3) падпісны;
4) сківаца;
5) разлог.

**А3.** ***Адзначце словы з націскным другім складам:***

1) выпадак;
2) параліч;
3) крыху;
4) кішка;
5) асака.

**А4.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара э:***

1) р...стаўрацыя;
2) др...мучы;
3) ш...раваты;
4) д...скатэка;
5) д...густатар.

**А5.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара е:***

1) г...рлянда;
2) з...нітка;
3) камбін...зон;
4) п'ед...стал;
5) пенсн... .

**А6.** ***Адзначце словы з правільным напісаннем:***

1) выгарэлы;
2) секунда;
3) мятровы;
4) капелюшы;
5) хрыбет.

**А7.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара а:***

1) зл...памятны;
2) чырв...нафлоцкі;
3) прыр...дазнаўства;
4) к...негадоўля;
5) пр...цілеглы.

**А8.** ***Адзначце словы з прапушчанай літарай я:***

1) земл...робства;
2) сярэдн...вяковы;
3) сабал...водства;
4) песн...пенне;
5) зерн...нарыхтоўка.



Репозиторий БГПУ

**А9.** ***Адзначце словы з прапушчанай літарай й:***
1) за...грацъ;	4) пра...гравальнік;
2) за...скрыцца;	5) пра...сці.
3) пра...нфармаваць;

**А10.** ***Адзначце словы з прапушчанай літарай с:***
1) пя...чотны;	4) ро...чын (аконны);
2) ра...чыніць (дзверы);	5) про...ьба.
3) у...чуваць;

**А11.** ***Адзначце словы, якія пішуцца з вялікай літары:***
1) засмучаныя (П, п)алешукі;	4) (Г, г)аландскі сыр;
2) (К, к)райняя Поўнач;	5) (Г, г)ерой Савецкага Саюза.
3) (Н, н)ародныя мсціўцы;

**А12.** ***Адзначце сінанімічныя радкі:***
1) філосаф, мысліцель, мудрэц;
2) смутак, самота, скруха;
3) спадзявацца, разлічваць, чакаць;
4) таленавіты, вопытны, дасведчаны;
5) абшар, краявід, далягляд.

**А13.** ***Адзначце назоўнікі з канчаткам -у (-ю):***
1) у час (дождж);	4) не цярпіць (фальш);
2) заключэнне (кансіліум);	5) заканчэнне (раман).
3) перамога (канкурсант);

**А14.** ***Адзначце назоўнікі, у якіх у месным склоне назіраецца чаргаванне зычных:***
1) сукенка;	4) эцюд;
2) універмаг;	5) пагорак.
3) эпоха;

**А15.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара ь:***
1) барэл...еф;	4) прэм...ера;
2) сес...ці;	5) ц...мяны.
3) п...еса;

**А16.** ***Адзначце назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў адзіночным ліку:***
1) ажына;	4) таленавітасць;
2) малако;	5) ламачча.
3) тангенс;

**А17.** ***Адзначце рады, у якіх усе назоўнікі ніякага роду:***
1) дынга, рандэву;	4) авеню, авакада;
2) гарыла, асарці;	5) рэвю, пано.

3) эмбарга, магнета;

**A18.** ***Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок:***

1) хата...чытальня;
2) метэа...прагноз;
3) сельска...гаспадарчы;
4) экс...чэмпіён;
5) паў...акна.

**A19.** ***Адзначце словы з памылковым напісаннем:***

1) шніцаль;
2) энтузіаст;
3) уладзівастокскі;
4) сяржант;
5) добрушскі.

**A20.** ***Вызначце разрады займеннікаў, якія ёсць у прыказках, паставіўшы насупраць кожнага сказа адпаведныя нумары:***

1 — асабовыя;
2 — зваротны;
3 — указальныя;
4 — прыналежныя;
5 — пытальныя;
6 — адносныя;
7 — няпэўныя (неазначальныя);
8 — адмоўныя;
9 — азначальныя.

1. Кожная птушка ляціць у сваю чараду.
2. Кінеш за сабою, знойдзеш перад сабою.
3. Будзеш усё ведаць, хутка пастарэеш.
4. Хто плаціць грошы, той заказвае і музыку.
5. Не бойся госця, які сядзіць, а бойся таго, што стаіць.

**A21.** ***Адзначце сказ, у якім усе дзеясловы належаць да II спражэння:***

1. Калі падасцéся ў Амерыку, гэта будзе вашай прыватнай справай. (*Я. К.*)

2. Сын армяніна Хачатура і рускай жанчыны Пелагеі трапіў служыць у Бабруйск, вызваляў Заходнюю Беларусь. (*Лев.*)

3. Пра тое, куды падзеліся шматлікія славянскія плямёны з Заходняй Еўропы, гісторыя загадкава маўчыць. (*З. Д.*)

4. Полацк старажытны над Дзвіной стаіць, гордая Сафія ў плынь яе глядзіць. (*Індз.*)

5. У леса-балотным комплексе «Чырвоны Бор» праводзіцца збор ягад і паляванне, а сельскагаспадарчая дзейнасць амаль не вядзецца. (*Каз.*)

**A22.** ***Адзначце словазлучэнні, у якіх дзеепрыметнікі ўтвораны і напісаны правільна:***

1) растрэсянае сена;
2) сапсаваўшаяся апаратура;
3) вывучаны верш;
4) адгорнены каўнер;
5) расказаная гісторыя.



Репозиторий БГМУ

**А23.** ***Адзначце словазлучэнні з прыслоўямі, якія пішуцца праз злучок:***

1) жывуць (па)суседству;
2) разбурыць (у)шчэнт;
3) будзь (на)пагатове;
4) зраблю (па) свойму;
5) размаўляе (па)нямецку.

**А24.** ***Адзначце словазлучэнні, у якіх часціца (прыстаўка)*** *не* ***пішацца разам:***

1) словы (не)пачуты;
2) (не)прывабнае сяло;
3) (не)спытаўшы дазволу;
4) (не)памаляваная падлога;
5) (не)абдуманы ўчынак.

**А25.** ***Адзначце сказы, у якіх часціца*** *не* ***на месцы ўсіх пропускаў ужываецца асобна:***

1. Яны ж будуць услед за войскам ехаць, прыніжаныя і пасаромленыя, н… як дзеці князя, а як апошнія рабы, н... здатныя ні на што. (*З. Д.*)
2. Калі з вамі н...шта здарыцца, дык і мне н... жыць. (*З. Д.*)
3. Н... нашы дзяды, н... прадзеды вам даніну н... плацілі. (*З. Д.*)
4. Як бы там н... было, князь, лепш н… брацца за тую справу, якую ты наважыўся зрабіць. (*З. Д.*)
5. Ах, княжыч, я н...хацела б ні на хвіліну разлучацца з табою, але праводзіць мяне н...трэба. (*З. Д.*)

**А26.** ***Адзначце словы, якія маюць у сваім саставе прыстаўку і суфікс (суфіксы):***

1) падарожнік;
2) аблажны;
3) бездараж;
4) пад’есці;
5) настаўнік.

**А27.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць працяжнікам:***

1. Жыццё найдаражэйшы дар, бясспрэчна, нам дадзены аднойчы і навечна, каб неслі мы высокі гэты дар. (*В. Ж.*)
2. Галоўная ўмова свята карысць усім: і дзецям, і настаўнікам. (*«ЛіМ»*)
3. Каханне і кар’ера, бясспрэчна, важныя рэчы ў жыцці чалавека. (*Гаўр.*)
4. Я журналіст, прадстаўнік самай мірнай прафесіі. (*Гаўр.*)
5. Ваша задача спыніць і абясшкодзіць Геракла, ледзьве ён высадзіцца на Крыце. (*Васюч.*)

**А28.** ***Адзначце простыя сказы з некалькімі радамі аднародных членаў:***

1. Буслоў на гнёздах клекатанне і спеў жаўраначка люблю. (*К. Буйло*)

2. Спавядаемся тут, над рэчкаю, хатам, дубам і зорам, вершы чытаем і, грэшныя, пра жанчын, канешне ж, гаворым. (*Мал.*)

3. А ён [конь] любіў бацькоў, мяне, малога, і дома, і ля вогнішча начнога. (*Мал.*)

4. Дзеці адчувалі шчырасць і любоў выхавацелькі, многія называлі яе мамай, лашчыліся да яе, як маленькія кацяняты. (*Лоб.*)

5. Беларускія мастакі вывучалі, даследавалі гісторыю сусветнага мастацтва і засвоенае пераносілі на нацыянальную глебу. (*Альш.*)

**А29.** ***Адзначце сказы з адасобленымі азначэннямі (улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены):***

1. Той час калі Віктар Шніп уваходзіў у літаратуру быў роўны спакойны і бадай яшчэ нічым не азмрочаны. (*«Маладосць»*)

2. Марыя нечакана для сябе пачала расказваць пра сваю вёску калісьці вялікую і шматлюдную пра сям’ю нядаўнія і ўжо незваротныя школьныя гады. (*Бут.*)

3. І толькі Марыя не дазваляла сабе нічога большага за размовы і жарты. (*Бут.*)

4. Збянтэжаныя такой рашучасцю вузы [качэўнікі] спыніліся. (*Я. К.*)

5. Яны паўтаралі і паўтаралі дослед спалоханыя да глыбіні душы. (*У. К.*)

**А30.** ***Адзначце сказы з адасобленымі прыдаткамі (улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены):***

1. Ала Клемянок паэтка і журналістка маці чатырох сыноў жыве і працуе ў Смаргоні. (*«ЛіМ»*)

2. І замест вотуму недаверу кангрэсмены прынялі іншую рэзалюцыю. (*Я. К.*)

3. Іван Серабракоў наводчык зеніткі што атабарылася на Маніным двары пачаў мастаколіцца на начлег. (*Бут.*)

4. Крушынскі ў чым быў не апранаючыся выскачыў на двор. (*Федар.*)

5. Яшчэ вучыў Карна княжычаў як суліцу кароткае кап’ё кідаць як паліцу ў бліжнім баі ўжываць як кісцянём жалезным прутом злучаным ланцугом з палкай варожы шлем праламіць. (*Я. К.*)

**А31.** ***Адзначце сказы, у якіх набраныя курсівам словы выдзяляюцца працяжнікамі ці дужкамі:***

1. Доктар *Пратасевіч было яго прозвішча* ніколі не прамінаў лішні раз нагадаць, што ён беларус. (*Федар.*)

2. І без таго маленькая, вузкая *ў сухое лета яе можна было пераскочыць з месца* з кожным годам рэчка ўсё больш мялела, а гэтай восенню не разлілася зусім, хоць дажджы лілі ўвесь кастрычнік. (*Федар.*)

3. Той меч *як казалі* належаў самому Рагвалоду — заснавальніку полацкай дынастыі. (*Я. К.*)

4. *Як паведаміла газета «Комсомольская правда» ў артыкуле «Чалавек-люстэрка»* ва ўфімкі Ірыны Паповай сэрца знаходзіцца справа, а печань — злева.

5. Мсціслаў *аднак* не даў зразумець сваіх пачуццяў. (*У. К.*)

**А32. *Адзначце сказы, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку:***

1. Лес кончыўся раптоўна маладым падлескам — сасоннікам з бярозкамі і елкамі ўперамешку, і мы сышлі з дарогі па пясчаным насыпе да самай Дзвінасы. (*І. Пт.*)

2. Прыезджы дзядзька нібы мімаходзь, а на самай справе па-сялянску чэпка акінуў позіркам і плот, і агародчык за ім, дзе імкнулася ў рост маладая антонаўка і дзе была ўжо ўскапаная зямля пад раннія кветкі, і хату, і ўвогуле ўсю сядзібу. (*Дал.*)

3. Пакупнік адлічыў грошы — залатыя і срэбныя кружочкі і перадаў гандляру. (*З. Д.*)

4. Другія старыя, як чуў Павел, не раз толькі і вялі размовы пра свае хваробы, але Алесь Трахімавіч які б ні быў хворы, ніколі не стараўся пра гэта гаварыць, усяк бадзёрыўся сам і падвясельваў другіх. (*Дал.*)

5. Калі плылі ў шлюпцы да берага, Касцюшка, адзіны з амерыканскіх афіцэраў, які разумеў, пра што ішла гаворка, растлумачыў Вашынгтону сутнасць французскага фартыфікацыйнага плана. (*Я. К.*)

## Тэст В

**В1. *Выпішыце граматычную аснову з двухсастаўнага няпоўнага сказа:***

1. Над вёскай дымок гаркавы. (*П-ў*)
2. Настоямі роднай зямлі запахла і родна, і востра. (*Кам.*)
3. Пойдзем папараць-кветку шукаць, краю лепшую долю гукаць. (*В. Ж.*)
4. Ад сустрэч, ад цябе адвыкаю. (*Шн.*)
5. За справамі бацькоў не забывайце, не крыўдзіце няўвагай. (*Аўл.*)

**В2. *Вызначце, якім знакам прыпынку трэба дапоўніць пунктуацыю ў складаных бяззлучнікавых сказах. Устанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы:***

| | |
|---|---|
| А. Папаўненне калекцыі наклеек было цікавейшым заняткам яно праходзіла пад поўным кантролем старэйшага брата. (*Альш.*) | 1. Коска ставіцца таму, што часткі не залежаць адна ад другой, але цесна звязаны па сэнсу. |
| Б. Чарот зашаргацеў знадворку забрахалі сабакі. (*З. Д.*) | 2. Двукроп'е ставіцца, бо другая частка ўказвае на прычыну таго, пра што гаворыцца ў першай. |
| В. Гаспадар каровай задаволены | 3. Двукроп'е ставіцца, бо другая частка дапаўняе, раскрывае сэнс першай. |



Рэпазіторый БДПУ

| | |
|---|---|
| і малако тлустае, і амаль цэлае вядро дае. (*З. Д.*)<br>Г. Ведаю ж цяпер адно без кахання не створыш сапраўднай сям'і. (*Гаўр.*) | 4. Працяжнік ставіцца, бо другая частка выражае неадпаведнасць, нечаканы вынік таго, пра што гаворыцца ў першай.<br>5. Працяжнік ставіцца, бо першая частка паказвае на час або ўмову таго, пра што гаворыцца ў другой. |

**В3. *Вызначце суадносіны паміж сказамі і іх характарыстыкай:***

| | |
|---|---|
| А. Пры ўважлівым вывучэнні разумееш: знешнасць — кодавая сістэма інфармацыі пра чалавека, яна ўтрымлівае самыя важныя і дакладныя звесткі пра сутнасць асобы. (*Альш.*)<br>Б. Пясочны гадзіннік нагадвае пра тое, што час ляціць вельмі хутка і чалавек не павінен траціць яго на пустыя і нявартыя справы. (*У. А.*)<br>В. Бацька Уладзіміра Іосіф Іосіфавіч быў родам з-пад Ломжы, што на мяжы Беларусі і Польшчы. (*Дам.*)<br>Г. На сцяне раслі скарлючаныя, вартыя жалю дрэўцы, нібы абпечаныя смяротным подыхам. (*У. К.*) | 1. Складаны бяззлучнікавы сказ.<br>2. Складаназалежны сказ з сузалежным аднародным падпарадкаваннем.<br>3. Складаны сказ з рознымі відамі сувязі.<br>4. Просты ўскладнены сказ.<br>5. Складаназалежны сказ з даданай азначальнай часткай. |

**В4. *Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх лексічным значэннем:***

| | |
|---|---|
| А. Адным мірам мазаны.<br>Б. Толькі свету што ў акне.<br>В. Ні Богу свечка ні чорту качарга.<br>Г. Не разгінаць спіны. | 1. Пасрэдны чалавек, які нічым не вызначаецца.<br>2. Адзіная радасць і турбота ў каго-небудзь.<br>3. Вельмі падобныя ў якіх-небудзь адносінах.<br>4. Знарок не звяртаць увагі на што-небудзь.<br>5. Старанна і доўга працаваць. |

**Тэкст да заданняў В5–В8**

1. Тым часам пакрысе наладжваліся справы ў калгасе. 2. У вёсцы пабудавалі новы кароўнік. 3. Патрэбны былі даяркі. 4. Зінка пайшла на ферму і працавала не **шкадуючы** сябе. 5. Выбілася ў перадавікі, стала нядрэнна зарабляць. 6. Купіла лесу, наняла цесляроў з суседняй вёскі, перасыпала, адрамантавала хату. 7. У пасвятлелай, з новымі вялікімі вокнамі хаце з'явілася сучасная мэбля: шафа з люстэркам, ложак, канапа. 8. Адным словам, выцерабілася жанчына са сваёй беспрасветнай галечы. 9. Не шкадавала яна грошай і на сына. 10. Сцёпка хадзіў зухам — у блакітных джынсах, кашулі-каўбойцы, на руцэ — новенькі гадзіннік

«Ракета». 11. І, гледзячы на прыгожага, статнага хлопца, ніхто не паверыў бы, што гэта той самы Сцёпка з адтапыранымі, чырвонымі вушамі, якому доктар тыцкаў пальцам у брудную худзенькую шыю. 12. Скончыўшы школу, Сцёпка паступіў у танкавае вучылішча.

**В5**. ***Вызначце стыль і тып тэксту.***

**В6.** ***Вызначце часцінамоўную прыналежнасць выдзеленага ў 4-м сказе слова.***

**В7**. ***Выпішыце з тэксту дзеепрыметнік незалежнага стану прошлага часу.***

**В8.** ***Вызначце сродак сувязі 8-га і 9-га сказаў. Укажыце яго часцінамоўную прыналежнасць.***

## Кантрольная работа № 6

### Варыянт 1

**1.** ***Складзіце з кожным словам па два сказы: у 1-м сказе ўжывайце слова ў ролі самастойнай часціны мовы, у 2-м — у ролі прыназоўніка.***

Побач, абапал, вакол, наперадзе, насустрач, дзякуючы.

**2.** ***Раскрыйце дужкі, устаўце патрэбныя літары.***

1. Наракаць, аднак, на (н…)зручнасць падарожжа (н…)даводзілася. 2. Па-першае, таварны вагон быў (н…)блага абсталяваны, а па-другое, Цярпілоўскія везлі з эвакуацыі ўвесь свой скарб. 3. Канстанціну Вячаслававічу аж стала сорамна за свае (н…)ўдзячныя думкі. 4. Усё выклікала (н…)выразную пакуль надзею на змены да лепшага, дзе (н…)будзе перадваеннага страху, пагалоўнага псіхозу з пошукамі ворагаў народа, каманд (н…)дасведчаных людзей. 5. Цяпер ужо (н…)хто (н…)будзе цікавіцца іх сацыяльным паходжаннем, сувязямі з рэпрэсіраванымі сваякамі. 6. (Н…)дзе праз тыдзень на працу ўладкавалася і Аўдоцця Якаўлеўна. (*Паводле А. Асіпенкі. «Клетка для берасцянак»)*

**3.** ***Запішыце сказы, правільна ўжыўшы прыназоўнікі.***

1. А яшчэ было б удачай падчапіць ... Дняпры шчупака ... самаробную вудку ... глінянымі грузіламі. (*Ул. Л.*) 2. Алесь ... злосцю захутаўся ... коўдру, збіраючыся заснуць, але не мог. (*У. К.*) 3. Свята доўжылася далёка ... поўнач. (*Бут.*) 4. ... спартанскі лад жыцця Тадэвуш атрымаў мянушку «Швед ... Брэста». (*Я. К.*) 5. «Дальняму бою» — стральбе ... лука — княжычы вучыліся ... трох гадоў. (*Я. К.*) 6. Абаяльнасць Віктара была такая вялікая, што Алесь раптам падумаў, ці не варта яму ... універсітэце акрамя філалогіі заняцца яшчэ і гісторыяй. (*У. К.*) 7. Гарачае святло ляцела на Гервасія ... аблокаў, блакітных унізе, сляпуча белых уверсе. (*У. К.*)

8. Грамадска-палітычную тэрміналогію складаюць словы — назвы паняццяў ... сферы юрыспрудэнцыі, сацыялогіі, эканомікі, паліталогіі. (*«Р. сл.»*)

**4.** ***Спішыце тэкст. Устаўце патрэбныя знакі прыпынку. Раскрыйце дужкі, устаўце прапушчаныя літары.***

Калі на мове народа ...тв...рае...а на...уковая фантаст...ка то наро... мае буд...ч...ню.

Піс...ме(н, нн)ікі ўзбагача(н, нн)ыя гіст...рычным ...опытам св...ёй нац...і а...метныя ар...г...нал...ным м...нталітэтам прапануюць св...асаблівыя мад...лі і аналі... буд...ч...ні ал...бо іншага ма...чыма пара(л, лл)ел...нага нашаму с(?)вету.

Заз...рнуць у тое што пры...дзе што настане ў тое што будзе а...вечная прага чалавека аднак усё пра...вызначыць дакладна амаль (не)магчыма таму піс...ме(н, нн)ік фантаст піша пра тое што магло (б) быць.

У гісторыі фантастычнай літ...ратуры маецца в...лікая кол...кас(?)ць фактаў супадзе(н, нн)я ма...чымага (з, с) буд...ч...няй. Хр...стаматыйныя прыклады Ж...ль Верн у св...іх р...манах пра...каза... вынаходні...тва самалёта... па...водных лодак Ал...ксей Та...стой у Гіп...рбалоі(д, дз)е інж...нера Гарына лаз...р. Фантазія піс...ме(н, нн)іка і яго а...чува(н, нн)е прагрэ(с, сс)іўнага ал...бо ... некаторых выпа...ках р...грэ(с, сс)іўнага пат...нц...лу чалаве...тва дазваляе фантасту ...тварыць праў(д, дз)івыя кар...іны ма...чымага што ...ражвае і захапляе ...я...ле(н, нн)е чытачо... .

Па долі ч...стай фантазіі ў творы фантастычная літ...ратура па(д, дз)яляе...а на (д, дз)ве асно...ныя плыні фэнтэзійную магічную м...стычную (міфалагічна)казачную (пара(л, лл)ельна)гістарычную і на...уковую фантастыка папярэ...а(н, нн)я (сац...льна)філасо...ская — утопіі (анты)утопіі …

Сябры Адама Міцкевіча ўспаміналі што ў два...атых гадах (д, дз)евятна...ага ст...го(д, дз)я ён напісаў вел...мі ар...г...нал...ны твор (д, дз)е апісваў (Л, л)ітву (д, дз)вухтыс...чнага год... . Твор (не)захаваўся але па с(?)ціплых з(?)вестках можна меркаваць што ...эта была сац...льная фантастыка (з, с) эл...ментамі на...уковай бо ў твор... было паказана што планета (З, з)ямля мела ...носіны з іншымі планетамі (С, с)онечнай сіст...мы. (*Паводле С. Мінскевіча)*

## Варыянт 2

**1.** ***Складзіце з кожным словам па два сказы: у першым сказе ўжывайце слова ў ролі самастойнай часціны мовы, у другім — у ролі прыназоўніка.***

Напярэдадні, паблізу, поруч, пасля, упоперак, выключаючы.

**2.** ***Раскрыйце дужкі, устаўце патрэбныя літары.***

1. Аўдоцця адмахвалася ад успамінаў, як ад жахлівых прывідаў, спрабавала засланіцца (н…)чым святлейшым, але так і (н…)здолела ўспомніць (н…)чога радаснага ў сваім доўгім і горкім жыцці. 2. А (н…)хта ж гэтаю парою сядзіць у цёплай хаце і (н…)дбае, што (н…)дзе адзінокая душа (н…)можа прыбіцца (н…) да якога прытулку. 3. Чаго ж цяпер бедаваць, і ўпікнуць (н…)ма каго, і (н…)пажалішся (н…)кому. 4. (Н…)чога (н…)вернеш і (н…)перайначыш. Але ж трэба (н…)куды ісці. 5. І яна пайшла далей, (н…)адважваючыся папрасіцца, каб падвезлі, а сам (н…)хто і (н…)думаў спыняцца. 6. Ці (н…)сюды гэта (н…)калі ездзіў яе Анікей на кірмаш? (*Паводле С. Грахоўскага*)

**3.** ***Спішыце, раскрываючы дужкі.***

1. Былы лейтэнант аказаўся (з) сталіцы. (*Ю. Ст.*) 2. Пабудова храма ажыццяўлялася (на)працягу сарака чатырох год і закранала часы чатырох імператараў. (*Ю. Ст.*) 3. Скончыўся лівень, (з)за воблакаў выкацілася сонца. (*Я. К.*) 4. Генерал угледзеўся ў мапу, ухваліў: — (З) стратэгічнага пункту гледжання месца выдатнае. (*Я. К.*) 5. Спярша мяне хрысцілі (у) уніяцкай царкве. (*Я. К.*) 6. А дзіця (з)пад матчынай апекі не вырвецца, бо не справіцца адно. (*І. Т.*) 7. Людзі мала чаго знайшлі (з) зброі, хоць абшукалі ўжо ўвесь дом. (*У. К.*) 8. Броўкавы бацька і дзядзькі былі вядомымі музы́камі (па) за межамі сваёй воласці. (*«Маладосць»*)

**4.** ***Спішыце тэкст. Устаўце патрэбныя знакі прыпынку. Раскрыйце дужкі, устаўце прапушчаныя літары.***

У ш...с(?)ці(д, дз)ясятыя г...ды два...атага ст...го(д, дз)я чалаве...тва ўступіла ... кас(?)мічную эру што дало на...в...лікшы імпул...с для на...уковай фантастыкі.

Трэба а...даць належнае белару...каму піс...ме(н, нн)іку фантасту Ула(д, дз)іміру Шы(т, ц)іку творчас(?)ць якога пераконвае што ўяўле(н, нн)е белару...кіх піс...ме(н, нн)ікаў можа (не)толькі бараз(?)ніць уласныя пале...кі але мае моц і імпэт каб вы...с(?)ці на прасторы (С, с)ус(?)вету. (З)пад яго п...ра вы...шлі (шмат)лікія фантастычныя апав...да(н, нн)і і аповес(?)ці. Зах...пляе прыгодніцкім сюж...там і выс...к...ро...ствам г...рояў Апошняя арбіта. Характ...рная назва кнігі што была выда(д, дз)ена ў тыс...ча дзев...ц...сот с...мідз...сятым го(д, дз)е Парсекі за к...рмой. Шмат якія псіх...лагічныя рысы наднац...нал...нага т...рарызму пра...бачыў У. Шы(т, ц)ік ... фантастычнай аповес(?)ці Сл...ды в...дуць на (З, з)ямлю. Розн...ца ў тым што ц...перашнія фана(ты, ці)кі (д, дз)ейнічаюць на нашай плане(т, ц)е а не ... а...дале(н, нн)ых кутках (С, с)онечнай сіст...мы.

Зв...ртаю...а да фантастыкі і піс...ме(н, нн)ікі што (да)гэтуль зар...кам...ндавалі с...бе як творцы р...лістычнага кірунку ... літ...ратуры. Юрый Станкевіч у 2004 го(д, дз)е апублікаваў у час...пісе «Маладос(?)ць» раман Пятая цэнтурыя трыццаць другі катрэн. Насамрэч р...лістычныя

творы Станкевіча з...я...ляю...а аналітычнымі. Яны в...дуць да пра...бача(н, нн)яў і пра...чува(н, нн)яў часам тр...вожных. Сюж...т апошняга рамана творцы цалкам фантастычны ў гора... што нагадвае Мінск на «чорным гелікаптэры» прыл...таюць ці іншаплан...(т, ц)яне ці прышэл...цы з буд...ч...ні ці наведвал...нікі (з, с) пара(л, лл)ел...нага с(?)вет... .

Яны губляюць часавы сінт...затар які выпа...кова трапляе да лю(д, дз)ей… .

Сюж...тная канва аднак тол...кі нагода для ас...нсава(н, нн)я найноўшых (фізіка)мат...матычных т...орый будовы с(?)вет... і ...пробаў тлумачэ(н, нн)я (пара)нармал...ных з...яў. Раман мае т...палагічную сув...зь (з, с) фантастычнымі (блок)бастэрамі Лю(д, дз)і ў чорным і Матрыца. І на наш погл...д між ра...камі твора Станкевіча праступае лё...кая іронія а...тар н...злосна кпіць (з, с) тых хто хоча ра...гадаць а...вечныя тайны (С, с)ус(?)вету. *(Паводле С. Мінскевіча)*

## Варыянт 3

### Тэст А

**А1.** ***Адзначце словы, у якіх колькасць гукаў і літар не супадае:***
1) дуэль; 4) крытэрый; 5) кветкавоз.
2) асамблея; 3) бурдзюк;

**А2.** ***Адзначце словы, у якіх вымаўленне не супадае з напісаннем:***
1) гасцінны; 4) не трэба; 5) без дапамогі.
2) продкі; 3) дзявочы;

**А3.** ***Адзначце словы з націскным першым складам:***
1) весці; 4) ігрышча;
2) вусы; 5) статут.
3) знахар;

**А4.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара ы:***
1) д...бют; 4) бл...шыны;
2) пр...тэндэнт; 5) р...цэнзія.
3) інж...нер;

**А5.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара я:***
1) з...ландскі; 4) м...дзведзь;
2) каз...мат; 5) н...дбайны.
3) выгл...д;

**А6.** ***Адзначце словы з няправільным напісаннем:***
1) спектакль; 4) Бялынічы;
2) канцэлярыя; 5) балярына.
3) Бялград;

Репозиторий БГПУ

**А7.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара о:***

1) пр...цiболевы; 4) пл...данашэнне;
2) чырв...насцяжны; 5) т...нкаструнны.
3) раб...тадавец;

**А8.** ***Адзначце словы з прапушчанай літарай е:***

1) вогн...устойлівы; 4) сярэдн...развіты;
2) собал...гадоўля; 5) вугл...коп.
3) заходн...рускі;

**А9.** ***Адзначце словы з прапушчанай літарай і:***

1) раз...сціся; 4) аб...граць;
2) мед...нстытут; 5) пан...сламізм.
3) звыш...мклівы;

**А10.** ***Адзначце слова з прапушчанай літарай ц:***

1) дзя...ька; 4) у вёса...цы;
2) мала...ьба; 5) бало...ца.
3) спове...ь;

**А11.** ***Адзначце словы, якія пішуцца з вялікай літары:***

1. (К, к)андыдат філасофскіх навук;
2. (М, м)інскі метрапалітэн;
3. (Г, г)ерой грамадзянскай вайны;
4. (П, п)ецярбургская акадэмія навук;
5. (Е, е)гіпецкія піраміды.

**А12.** ***Адзначце сінанімічныя рады:***

1) талісман, амулет, прэзент;
2) адзінокі, адзінкавы, бязродны;
3) адгаворка, апраўданне, прычына;
4) тканіна, матэрыя, мануфактура;
5) наўскапыта, паспешліва, вобмельгам.

**А13.** ***Адзначце назоўнікі, якія ў родным склоне маюць канчатак -а:***

1) сшытак; 4) горад;
2) дым; 5) іпадром.
3) страх;

**А14.** ***Адзначце назоўнікі з канчаткам -ы (-і):***

1) рухаюцца ў (пустыня); 4) плыве па (рака);
2) трымаць на (плячо); 5) працуе на (фабрыка).
3) аб (сябар);

**А15.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара ь:***

1) кан...ён; 4) Лавуаз...е;



Рэпазіторый БДМУ

2) лез...ці; 5) сям...я.
3) дз...вюма;

**А16.** ***Адзначце назоўнікі, якія маюць форму адзіночнага ліку:***
1) шпроты; 4) кансервы;
2) крупы; 5) яблыкі.
3) дзверы;

**А17.** ***Адзначце рады, у якіх усе назоўнікі мужчынскага роду:***
1) шасі, візаві; 4) урду, бюро;
2) фламінга, эму; 5) пенальці, круп'е.
3) хіпі, фарсі;

**А18.** ***Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок:***
1) анты...фашыст; 4) снежна...белы;
2) лаціна...амерыканскі; 5) паў...Еўропы.
3) лейб...гвардыя;

**А19.** ***Адзначце словы з правільным напісаннем:***
1) элеватар; 4) нярвовы;
2) безкампрамісны; 5) дэмабілізацыя.
3) гарналыжны;

**А20.** ***Адзначце прыказкі, у якіх ёсць прыналежныя займеннікі:***
1. Кожны кулік сваё балота хваліць.
2. Каму пашанцуе, той і ў лапцях патанцуе.
3. Пазнаюць нашу дачку і ў андарачку.
4. Хто б дзятла пазнаў, каб не яго доўгі нос.
5. Хто ўлетку спіць, той узімку не есць.

**А21.** ***Адзначце сказы, у якіх усе дзеясловы належаць да I спражэння:***

1. Калі збіраліся ўсе разам, Іван расказваў пра свае ваенныя дарогі, пра Курск, Белгарад. (*Бут.*)

2. Хлопцы паверылі і пайшлі супакоеныя. (*Федар.*)

3. У Церабеях мы збіраліся зняць на стужку свята Івана Купалы. (*«Маладосць»*)

4. Падзякаваў Архіповіч жанчыне, пайшоў з двара. (*Сач.*)

5. Вельмі добра было б выявіць, на чым засноўваў свае творы Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. (*К. Цвірка*)

**А22.** ***Адзначце словазлучэнні, у якіх дзеепрыметнікі напісаны і ўтвораны правільна:***
1) адгароджаны шафай ложак;
2) перададзенная маёмасць;
3) закладзены падмурак;
4) апладзіраваўшыя гледачы;

5) недаацэненая спадчына.

**А23.** ***Адзначце словазлучэнні з прыслоўямі, якія пішуцца разам:***

1) чытае на...памяць;
2) раз...пораз выцірае;
3) вучоба ідзе ў...ахвотку;
4) пазнаёміліся ў...зімку;
5) арыентуецца з...большага.

**А24.** ***Адзначце сказы, у якіх часціца*** *не* ***на месцы ўсіх пропускаў пішацца асобна:***

1. Рамейка ведаў Арсеня як далікатнага, тактоўнага чалавека, які н... можа дазволіць сабе н…якай грубасці. (*Дам.*)

2. Мы яшчэ пра н...шта пагаварылі, і ён [Рамэля] пайшоў сваёй н...таропкай, н...па гадах цяжкаватай хадой. (*З. Пр.*)

3. Н...раны страшныя, н...тое, што пакалечыла, шчаслівы ад таго, што душа н...скалечана, што ў Крушнікі свае вярнуўся і магу смела хадзіць і глядзець людзям у вочы. (*Бар.*)

4. У адным выпадку чалавек н...змог адчуць, убачыць, расшыфраваць знакі свайго лёсу і пайшоў н...сваёй дарогай. (*З. Пр.*)

5. У мове мастацкай літаратуры псіхалагічныя метафары выконваюць н...столькі інфармацыйную, колькі эстэтычную функцыю, характарызуюцца н...стандартнай спалучальнасцю. (*«Полымя»*)

**А25.** ***Адзначце сказы, у якіх на месцы ўсіх пропускаў пішацца часціца*** *ні:*

1. Мы застаемся хазарамі, як бы жыццё н... ламала і н... перакоўвала нас. (*З. Д.*)

2. Такі бурнос мог сагрэць і ў н...пагадзь, напэўна, і пад дажджом н... адразу прамокне. (*З. Д.*)

3. Узяў ды кінуў варту назаўжды, н... ў кога н... пытаючыся і н... адпрошваючыся. (*І. Пт.*)

4. Фалітар н...гучным голасам пракаментаваў падзею. (*В-х*)

5. Мы ж н...якага кепства н...кому не зрабілі. (*В-х*)

**А26.** ***Адзначце словы, утвораныя прыставачным спосабам:***

1) завострываць;
2) найглыбейшы;
3) заваявальнік;
4) прынаджванне;
5) адслужыць.

**А27.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць працяжнікам:***

1. Агульны продак моўных сем’яў прамова, або мова нашых прабацькоў, што існавала раней і знікла зараз. (*Энц.*)

2. А твае вочы як азёры, узгадаваныя ракой. (*Ю. Новік*)

3. У 1772 годзе тры краіны: Расея, Аўстрыя і Прусія дамовіліся паміж сабой падзяліць Рэч Паспалітую. (*У. А.*)

4. З бальшака не зварочваў бы і ўсё было б добра. (*В-х*)

5. Наш этнаграфічны ансамбль «Харошкі» высокапрафесійны і глыбока нацыянальны. (*Гр.*)

**А28.** ***Адзначце простыя сказы з некалькімі радамі аднародных членаў:***

1. Свет адмовіў паэту ў каханні, а самога ўсё роўна прызнаў. (*В. Гадулька*)

2. Вігі згаджаліся надаць калоніям статус дамініёнаў і шырокую ўнутраную аўтаномію. (*Я. К.*)

3. Бабуля абмыла Любцы і мне твары, выцерла ручніком і папрасіла збегаць на выган, да рэчкі, паглядзець гусей. (*Альш.*)

4. Толічак за восень і зіму з выгляду перамяніўся, пасталеў. (*В-х*)

5. Хочацца мне, як буслам, пакружляць над нашым сялом, лесам, ракой, балотцам, палётаць у гэтым чыстым сінім небе. (*В-х*)

**А29.** ***Адзначце сказы з прыдаткамі, у якіх дапушчаны недакладнасці ва ўжыванні злучка і двукосся:***

1. Расяная атава рэзалася лёгка, услед за касцом цягнуліся дзве рудавата-зялёныя дарожкі-сляды і бухматыя валкі-пракосы. (*Лев.*)

2. Ён [Міхась] ледзьве падняўся па ўсходах, прыйшоў у свой пакойчык катушок стомлены і разбіты. (*В-х*)

3. З дзейнасцю Мялеція Сматрыцкага філолага добра суадносіцца эпітэт «упершыню». (*Энц.*)

4. Леса-балотны комплекс Альманскія балоты знаходзіцца на тэрыторыі Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. (*Каз.*)

5. Апавяданне народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава «Дапякло» ўбачыла свет у часопісе «Вожык». (*«ЛіМ»*)

**А30.** ***Адзначце сказы з адасобленымі дапаўненнямі (улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены):***

1. Нашы пасланцы павінны быць як след падрыхтаванымі мець акрамя іншага развіты інтэлект грунтоўны падмурак ведаў. (*В-х*)

2. На выгляд гэта былі звычайныя вясковыя хлопчыкі амаль яе аднагодкі. (*Федар.*)

3. Акно выходзіла ў невялікі сквер засаджаны ліпамі таполямі каштанамі. (*Сач.*)

4. Распраўляючы звялыя пялёсткі чырвонай кропляй разгаралася на грудзях Гервасія кветка шыпшыны. (*У. К.*)

5. Каскады выключаны акрамя «Пераможанага Левіяфана». (*У. К.*)

**А31.** ***Адзначце сказы з адасобленымі акалічнасцямі (улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены):***

1. Даводзілася трымацца як надалей адно ад аднаго. (*У. К.*)

2. Ноч і святло з акон чаргуючыся беглі па танюткай постаці. (*У. К.*)

3. Барс віляючы хвастом падышоў і паклаў Крушынскаму на калена лапу. (*Федар.*)

4. Каля калодзежа нерухома стаяла маладзіца трымаючы паўнюткі цэбрык вады. (*З. Д.*)

5. Першыя вырабы з медзі знойдзеныя ў Месапатаміі датуюцца сёння пятым тысячагоддзем да нашай эры. (*«Полымя»*)

**А32.** ***Адзначце сказы, у якіх набраныя курсівам словы трэба выдзеліць коскамі:***

1. *Нарэшце* ў мяне з’явіцца час сур’ёзна заняцца драматургіяй. (*Я. К.*)
2. Дзедава хата *здавалася* хадуном хадзіла ад раскатаў грому і трэску маланкі. (*Альш.*)
3. Ратавала мяне ад самоты *па сутнасці* толькі мая маладосць. (*Г. Ч.*)
4. Князь *мусіць* штодня на сваім двары прымаць падданых, слухаць іх скаргі і судзіць па праўдзе. (*Я. К.*)
5. Мы гулялі па Мазыры *гэта другая Швейцарыя* плавалі на маторнай лодцы да Пхова, адкуль не так даўно плыты ганялі. (*Лоб.*)

## Тэст В

**В1.** ***Выпішыце граматычную аснову з няпэўна-асабовага сказа:***

1. Абход сваіх лясных уладанняў звычайна пачынаю з Бабчына. (*Т. Дз.*)
2. Нездарма ўсё-такі ў добрых паляўнічых гаспадарках наладжваюць кабанам падкормку. (*Т. Дз.*)
3. Вялікая паляна на шэсцьдзясят тысяч гледачоў. (*Васіл.*)
4. Бясконцая дарога высока ў гарах. (*Альш.*)
5. Чытала казкі, асабліва ў доўгія зімовыя вечары. (*Альш.*)

**В2.** ***Вызначце, якім знакам прыпынку трэба дапоўніць пунктуацыю ў складаных бяззлучнікавых сказах. Устанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы:***

| | |
|---|---|
| А. Ірынка засвяцілася ўсмешкаю і замілаваннем, супакоілася адбылося тое, чаго яна чакала. (*Янк.*) | 1. Коска ставіцца таму, што часткі не залежаць адна ад другой, але цесна звязаны па сэнсу. |
| Б. Вароны нізка лётаюць, сарокі сакочуць зменіцца надвор’е, задажджыць. (*Лоб.*) | 2. Двукроп’е ставіцца, бо другая частка ўказвае на прычыну таго, пра што гаворыцца ў першай. |
| В. У трэцім класе Бялевіцкай пачатковай школы я ўжо ведаў жадаю маляваць і стану мастаком. (*Альш.*) | 3. Двукроп’е ставіцца, бо другая частка дапаўняе, раскрывае сэнс першай. |
| Г. Дзеда на Першай сусветнай вайне моцна кантузіла ён | 4. Працяжнік ставіцца, бо другая частка з’яўляецца вынікам дзеяння першай, выражае неадпаведнасць, нечаканы вынік таго, пра што гаворыцца ў першай. |



Репозиторий БГПУ

| | |
|---|---|
| стаў недачуваць. (*Ул. Сц.*) | 5. Працяжнік ставіцца, бо першая частка паказвае на час або ўмову таго, пра што гаворыцца ў другой. |

**В3.** ***Вызначце суадносіны паміж складаназалежнымі сказамі і тыпамі даданых частак:***

| | |
|---|---|
| А. Усе глядзелі на змрочнага Янку Камара — галоўнага чалавека ў той справе, што яны збіраліся рабіць. (*У. К.*)<br>Б. Як адлютавалі маразы ды мяцеліца аціхла, то з Лёсікам разоў колькі хадзілі ў кар’ер на санках катацца. (*В-х*)<br>В. Каманда на выступленне прагучала так нечакана, што многія і развітацца не паспелі. (*Бут.*)<br>Г. Усе, хто праходзіў побач, не ўзнімалі на яго вачэй. (*Г. Ч.*) | 1. Спосабу дзеяння.<br>2. Азначальная.<br>3. Акалічнасныя часу.<br>4. Дзейнікавая.<br>5. Уступкі. |

**В4.** ***Устанавіце адпаведнасць паміж назоўнікамі і іх характарыстыкай:***

| | |
|---|---|
| А. Кансервы<br>Б. Салата.<br>В. Калега<br>Г. Плато. | 1. Назоўнік агульнага роду.<br>2. Не мае роду.<br>3. Адрозніваецца ў родзе ад рускага адпаведніка.<br>4. Не мае формы множнага ліку.<br>5. Назоўнік мужчынскага роду. |

## Тэкст да заданняў В5–В8

## Гучанне Купалавай ліры

1. У той красавіцкі вечар я нечакана, па запрашэнні сябра, трапіла ў Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі на рок-оперу «Адвечная песня» паводле Янкі Купалы. 2. Ад першай ноткі заварожваюць таямніцы «калядак» з нацыяльным каларытам, з магіяй масак-ідалаў, гульнямі, весялосцю. 3. Дзея плаўна пераносіць нас на прасторы тагачаснай вёскі з яе насельнікамі, з вобразамі роднага краю, занатаванымі Купалам з такой любоўю і болем. 4. Праз біяграфію сялянскай сям’і (ад нараджэння да труны) ажывае гаротны лёс загнанага простага Чалавека — ва ўсіх праявах (побыт, будні, свята), гісторыя жыцця беларускай вёскі. 5. Стваральнікі рок-оперы, акцёры з такім майстэрствам перадаюць **быццё**, з такой цеплынёй і сімпатыяй даносяць годнасць, высакароднасць Чалавека працы, што мы нібыта робімся не сведкамі, а ўдзельнікамі падзей, «пражываем лёс» персанажаў да апошніх хвілінак, адчуваем подых таго часу. 6. Уся вясковая «адысея» разгортвалася на адным подыху. 7. Захопленыя гледачы не хацелі



Репозиторий БГПУ

развітвацца, зноў і зноў выклікалі акцёраў «на біс». 8. Рэакцыя слухачоў сведчыць: лёс простага люду, старонкі мінулага роднай Бацькаўшчыны, данесеныя да сучасніка, «прайшлі» праз нас, закранулі глыбіні душы. 9. І поспех спектакля заслужаны. 10. Гучанне Купалавай ліры добра пакладзена на мову музыкі. 11. Думкі песняра ўдала ўвасобленыя стваральнікамі рок-оперы. 12. У канву дзеяння трапна **ўплеценыя** народныя традыцыі, музычны фальклор. 13. Цікава пададзены вясновыя, восеньскія замалёўкі вясковых свят. 14. Па-майстэрску створаныя партрэты-характарыстыкі, з пачуццём спагады раскрыты лёс герояў. 15. Адчуваецца творчая еднасць аўтараў пастаноўкі з выдатнымі выканаўцамі-акцёрамі. 16. З галерэі сялянскіх вобразаў вылучаецца вобраз галоўнага героя, прадстаўлены надзвычай адораным акцёрам Ігарам Сігавым.

**В5.** ***Вызначце стыль тэксту і яго жанр.***

**В6.** ***Якім членам сказа з’яўляецца выдзеленае ў 5-м сказе слова? Адказ запішыце ў творным склоне.***

**В7.** ***Вызначце спосаб утварэння выдзеленага ў 12-м сказе слова. Адказ запішыце ў назоўным склоне.***

**В8.** ***Сярод сказаў 5–8 вызначце просты ўскладнены сказ. Укажыце нумар сказа.***

## Варыянт 4

### Тэст А

**А1.** ***Адзначце правільныя сцвярджэнні пра колькасць літар і гукаў у словах:***

1) архідэя — 7 літар, 7 гукаў;
2) сюіта — 5 літар, 5 гукаў;
3) кансультацыя — 12 літар, 12 гукаў;
4) егер — 4 літары, 4 гукі;
5) функцыянер — 10 літар, 11 гукаў.

**А2.** ***Адзначце пары слоў, у якіх націск служыць для адрознення іх граматычнай формы:***

1) спыні́цца – спыніцца;
2) на́сып – насып;
3) будзі́ць – бу́дзіць;
4) выраша́ць – вырашаць;
5) ту́га – туга́.

**А3.** ***Адзначце словы з націскным другім складам:***



Репозиторий БГПУ

1) вярба;
2) ракурс;
3) балаваць;
4) засцежка;
5) спаянасць.

**А4.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара э:***
1) світ...р;
2) р...чытатыў;
3) д...спансер;
4) ц...рымонія;
5) д...каратар.

**А5.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара е:***
1) галіф...;
2) в...рацяно;
3) эл...ксір;
4) пацв...рджэнне;
5) пал...мічны.

**А6.** ***Адзначце словы з няправільным напісаннем:***
1) флегматычны;
2) беразняк;
3) арэндаваць;
4) навэла;
5) майстраваць.

**А7.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара а:***
1) абар...наздольнасць;
2) выс...карослы;
3) в...данапорны;
4) зак...напраект;
5) д...бразычлівы.

**А8.** ***Адзначце словы з прапушчанай літарай я:***
1) заходн...германскі;
2) сярэдн...азіяцкі;
3) вугл...здабыча;
4) зерн...ток;
5) жыцц...радасны.

**А9.** ***Адзначце словы з прапушчанай літарай і:***
1) ня...начай;
2) за...кнуцца;
3) сан...нструктар;
4) пра...граць;
5) па...менны.

**А10.** ***Адзначце словы з прапушчанай літарай ж:***
1) аб’е...джаны;
2) перабе...чык;
3) му...чына;
4) ра...жалаваць;
5) адва...ся.

**А11.** ***Адзначце словы, якія пішуцца з вялікай літары:***
1) ордэн «(М, м)ацярынская слава»;
2) (Г, г)амерычны смех;
3) (Н, н)ародны артыст;
4) (С, с)авет Міністраў;
5) (М, м)іністр лясной гаспадаркі.

**А12.** ***Адзначце сінанімічныя рады:***
1) агароджа, загарадка, плыт;

Репозиторий БГМУ

2) аварыя, крушэнне, катастрофа;
3) авангард, аванпост, ар’ергард;
4) абавязак, павіннасць, абавязацельства;
5) абмеркаваць, разгледзець, абдумаць.

**А13.** ***Адзначце назоўнікі з канчаткамі*** *-а (-я):*
1) дзялянка (лён);
2) пакутаваў ад (мароз);
3) на п’едэстале (гонар);
4) у захапленні ад (верш);
5) цень ад (плафон).

**А14.** ***Адзначце назоўнікі, у якіх у месным склоне адбываецца чаргаванне зычных:***
1) страха;
2) кнігаўка;
3) арганаўт;
4) мурог;
5) бумеранг.

**А15.** ***Адзначце словы з прапушчаным апострафам:***
1) п...яўка;
2) медал...ён;
3) кар...ер;
4) сузор...е;
5) Мал...ер.

**А16.** ***Адзначце назоўнікі, якія маюць форму множнага ліку:***
1) эгаізм;
2) дождж;
3) паліва;
4) крылле;
5) семестр.

**А17.** ***Адзначце рады, у якіх усе назоўнікі мужчынскага роду:***
1) какаду, менцік;
2) івасі, верф;
3) алібі, мерынос;
4) вета, фураж;
5) зебу, фальш.

**А18.** ***Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок:***
1) бела...снежны;
2) даўно...мінулы;
3) максі...паліто;
4) Мінск...Таварны;
5) віцэ...прэзідэнт.

**А19.** ***Адзначце словы з правільным напісаннем:***
1) кампосны;
2) вокаімгненны;
3) безвыездна;
4) ільсніцца;
5) меца-сапрана.

**А20.** ***Адзначце прыказкі, у якіх ёсць адносныя займеннікі:***
1. Кожны плача па сваім бацьку, як умее.
2. Хто дбае, той і мае.
3. Ведае кошка, чыё сала з’ела.

Рэпазіторый БГМУ

4. Ад самога сябе не ўцячэш.

5. Хоць лядашчы мужычок, ды затулле маё, схаваюся за яго, не баюся нікаго.

**А21.** ***Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-й асобы множнага ліку цяперашняга ці будучага простага часу маюць канчаткі** -ацé (-яцé):*

1) абуджаць; 4) сцерагчы;
2) расказваць; 5) выганяць.
3) класці;

**А22.** ***Адзначце словазлучэнні, у якіх дзеепрыметнікі напісаны і ўтвораны правільна:***

1) няпрошаны госць; 4) скамянеўшая душа;
2) забытая песня; 5) даўшая волю слязам.
3) згубленая раўнавага;

**А23.** ***Адзначце словазлучэнні з прыслоўямі, якія пішуцца асобна:***

1) на...урад ці дадасць адвагі; 4) спалохаўся да...смерці;
2) азіраецца без...канца; 5) скаціўся з...верху.
3) скочыў з...разбегу;

**А24.** ***Адзначце сказы, у якіх часціца** не **на месцы ўсіх пропускаў пішацца асобна:***

1. Калі б вяроўкі н...звязвалі рукі, можна было б парадавацца гэтай прыгодзе, але н...вядомасць н...тое што лёсу, але нават наступнага імгнення палохала ўсіх. (*З. Д.*)

2. Княжыч доўга абмацваў кожны каменьчык, каб знайсці такі, які н...надта б трымаўся, і знайшоў н... адзін, а нават некалькі каменьчыкаў. (*З. Д.*)

3. Справа ў тым, што, давучыўшыся да пятага класа на круглыя пяцёркі, Валік, як н...сорамна, н...ведаў на памяць парадкавых нумароў размяшчэння літар у алфавіце. (*Федар.*)

4. Н..., першае ўражанне ад хлопчыкаў н...было памылковым. (*Федар.*)

5. А мо каб н...Бабенчык, дык Флораўна ўжо па гэтым свеце н...хадзіла б. (*В-х*)

**А25.** ***Адзначце сказы, дзе часціца** ні **пішацца асобна:***

1. Тым не менш, што б нам н... пагражала, а горай ужо не будзе, нельга скарацца жорсткім абставінам, трэба шукаць выйсце. (*В-х*)

2. Я н...колі н...на якія залатыя горы н...прамяняю ўчарашні наш кар'ер, наш лес, нашу рэчку. (*Федар.*)

3. Нясцерпна хацелася есці, але жаліцца н...было каму. (*З. Д.*)

4. Н...звычайны быў гэты твар, н...які аж задужа прыгожы — н...жывой, гіпсавай прыгажосцю. (*Федар.*)

5. Усюды, куды н...паглядзі, куды н...кінь вока — груды цэглы, развалiны дамоў, арматура, галавешкі. (*Сач.*)



Рэпазіторый БДМУ

**А26.** ***Адзначце словы, утвораныя суфіксальным спосабам:***

1) ізаляванасць;
2) з'яднанне;
3) пашкодзіць;
4) адключыць;
5) адлічваць.

**А27.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць працяжнікам:***

1. Галінка бэзу сум і радасць, што вечна ў памяці жывуць. (*Л. Пранчак*)
2. Сустрэцца са сваім земляком, пагаварыць па-свойму, успомніць тое, як жыў ён некалі на радзіме, вялікае шчасце. (*Сач.*)
3. У 1910 годзе Ядвігін Ш. здзейсніў сваю даўнюю мару зрабіць пешую вандроўку па Беларусі. (*«ЛіМ»*)
4. Човен мой сярод штормаў стагоддзя быццам трэска. (*З. Марозаў*).
5. Жывое ўсё: і мурашы, і зёлкі, і ў расцы акуні і шчупакі стаіліся, прыціхлі. (*В. Яр.*)

**А28.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць коскай паміж аднароднымі азначэннямі:***

1. Перазараджаючы пісталет, Алесь гаварыў з Тромбам ласкавым журлівым голасам. (*У. К.*)
2. І раптам шкадаванне і няўтольная вострая ніколі ў жыцці яшчэ не адчуваная пяшчота авалодалі ёй [Майкай]. (*У. К.*)
3. Алесь толькі на золку заснуў на якую гадзіну цяжкім кашмарным сном. (*У. К.*)
4. Горад Ахен хаваўся за цёмнымі каменнымі сценамі. (*З. Д.*)
5. Паветра пачысцела, зрабілася прасветленым празрыстым, як вымытае шкло. (*Лев.*)

**А29.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць двукроп'ем:***

1. Першая прыступка ратнай навукі валодаць мячом. (*Я. К.*)
2. Юрыдычны факультэт Алеся не вабіў якому праву могуць вучыць у краіне бяспраўя? (*У. К.*)
3. Пры школе была абсталявана пляцоўка для заняткаў па фізкультуры перакладзіна, кольцы, бумы, лесвіца, канат, была і валейбольная пляцоўка. (*Дам.*)
4. Рахіля старалася выхаваць акуратнасць у дзетдомаўскіх дзяцей вучыла іх прышываць гузікі, цыраваць шкарпэткі, падшываць падалы, прыгожа засцілаць ложкі. (*Лоб.*)
5. Металургія, вытворчасць шкла, фарбаў, керамікі ўсе гэтыя галіны не маглі абысціся без хімічных даследаў. (*«Полымя»*)

**А30.** ***Адзначце простыя сказы з недапасаванымі азначэннямі:***

1. Мы ледзь знайшлі больш-менш роўную пляцоўку, каб пасадзіць наш карабель. (*Р. Бар.*)



Рэпазіторый БДПУ

2. Наперад з купкі людзей падаўся хлопец гадоў дваццаці пяці, з доўгімі русявымі валасамі і маленькай вострай бародкаю. (*В-х*)

3. Жыве тут сягоння мінулых часін нясходлівым ценем паданне. (*Мятл.*)

4. З цікавасцю разглядваў Раман франтавыя трохкутнікі. (*Бут.*)

5. За гады міжволі вырасла нейкая дзіўная адчужанасць. (*У. К.*)

**А31.** ***Адзначце сказы з адасобленымі прыдаткамі (улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены):***

1. Кожная ладдзя-насад мела сем пар вёслаў а на носе ачаг жалезную скрыню напоўненую пяском. (*Я. К.*)

2. Гэтыя дзіўныя стварэнні вёрткія яшчаркі знаходзяць сабе нейкую ежу і ваду. (*З. Д.*)

3. Сабака паскугольваючы скакаў Крушынскаму на грудзі. (*Федар.*)

4. Адзіная ва ўсім свеце яна не баялася цемры апраметнай і скрыгату зубоўнага. (*У. К.*)

5. Згодна з гістарычнымі звесткамі дрыгавіты жылі на Балканах у ваколіцах горада Салуні. (*З. Д.*)

**А32.** ***Адзначце сказы з адасобленымі дапаўненнямі (улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены):***

1. Кожная полацкая сям'я згодна са звычаем дасылала на вайну ўсіх дарослых сыноў за выключэннем аднаго малодшага. (*Я. К.*)

2. Валік хацеў сказаць што ёсць тысячы цікавых спраў і акрамя расследаванняў. (*Федар.*)

3. Конь убачыў што гаспадар нават не глядзіць у ягоны бок што ў яго нічога няма ў руках акрамя кавалка цукру. (У. К.)

4. Гетман Сасноўскі прайграў у карты князю Любамірскаму адзін са сваіх маёнткаў і вырашыў замест маёнтка аддаць за малодшага сына князя дачку Людвісю. (*Я. К.*)

5. Акрамя дзённікаў сшыткаў «Думкі» артыкулаў пяру паэта Пятра Сеўрука належаць апавяданні аповесці вершы. (*Дзел.*)

## Тэст В

**В1.** ***Выпішыце граматычную аснову з двухсастаўнага няпоўнага сказа:***

1. Тысячу год ім чакаць і не дачакацца. (*У. К.*)

2. Размова касы з атавай. (*П-ў*)

3. Яму было лёгка і радасна. (*Федар.*)

4. Трэба падрыхтавацца добра, запасціся неабходнымі асаднымі машынамі і прыстасаваннямі. (*З. Д.*)

5. Красак дзіўных святло ў агнях патанае. (*Гасп.*)

**В2.** ***Знайдзіце назоўнік, род якога ў рускай і беларускай мовах не супадае. Запішыце гэты назоўнік па-беларуску:***

1) жерло;
2) верфь;
3) бездна;
4) объяснение;
5) россыпь.

**В3.** ***Знайдзіце зборны лічэбнік, які ў форме творнага склону напісаны няправільна. Запішыце лічэбнік правільна:***

1) чатырнаццатым;
2) пяцярмі;
3) васьмюстамі;
4) трыма;
5) дваццаццю двума.

**В4.** ***Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі ў сказах словамі і іх часцінамоўнай прыналежнасцю. Запішыце правільны адказ:***

| | |
|---|---|
| А. У небе высокім Стажары **нібыта** славянская раць. (*Г. Пашкоў*) | 1. Займеннік. |
| Б. Прыхільнікі творчасці Івана Чыгрынава шчыра радаваліся яго мастакоўскаму поспеху, **прытым** у новым для аўтара жанры. (*Кам.*) | 2. Прыслоўе. |
| В. У восені надвор'яў восем на **кожны** дзень. (*Прык.*) | 3. Часціца. |
| Г. **Раніцай** выправіўся ў кругасветную вандроўку. (*Ул. Сц.*) | 4. Злучнік. |
| | 5. Прыметнік. |

## Тэкст да заданняў В5–В8

## Скарб роднай прыроды

1 Грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» штогод праводзіць адметную нацыянальную кампанію «Птушка года». 2. У свой час такімі птушкамі былі бусел, пліска, кнігаўка, верабей, ластаўка, барадатая кугакаўка... 3. Нядаўна птушкай года была абвешчана вялікая белая чапля (Egretta alba L.). 4. Да сярэдзіны XX стагоддзя адбывалася зніжэнне колькасці вялікай белай чаплі на тэрыторыі ўсёй Еўропы. 5. Да канца 1980-х гадоў у Беларусі адзначаліся адзінкавыя рэгістрацыі птушак, больш-менш рэгулярна яны сталі гнездавацца ў нас толькі 15 гадоў таму. 6. З гэтай нагоды вялікая белая чапля ў 1981 годзе занесена ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. 7. Асноўнымі фактарамі пагрозы для віду да гэтага часу з'яўляюцца змяншэнне плошчы і **дэградацыя** натуральных поймаў, а таксама неспакой на месцах гнездавання. 8. Вялікая белая чапля мае даўжыню цела 85–102 см, вагу 1,1–1,5 кг, размах крылаў 1,4–1,7 м. 9. Апярэнне снежна-белае. 10. На плячах два пучкі рассуканых пёраў (агрэтак), якія заходзяць за вяршыню хваста. 11. Гняздуецца чапля як **паасобку**, так і ў змяшаных калоніях разам з шэрымі чаплямі і вялікімі бакланамі ў цяжкапраходных лазнякова-трысняговых зарасніках, радзей у астраўных лясах у поймах рэк. 12. Пашырэнне арэала пражывання і павелічэнне колькасці птушак зараз адзначаецца ў многіх краінах

Репозиторий БГМУ

Еўропы, у тым ліку і ў Беларусі. 13. Сёння вялікую белую чаплю можна ўбачыць значна часцей і практычна паўсюдна, але выпадкі гнездавання да гэтай пары былі вядомыя толькі на поўдні Беларусі.

**В5.** ***Вызначце стыль і тып тэксту:***

1. Мастацкі, апісанне.
2. Публіцыстычны, разважанне.
3. Навуковы, апісанне.
4. Навуковы, апавяданне з элементамі апісання.

**В6.** ***Сярод сказаў 4–7 знайдзіце складаны бяззлучнікавы сказ, вызначце тып выказніка ў другой частцы гэтага сказа. Запішыце адказ у назоўным склоне.***

**В7.** ***Вызначце спосаб утварэння выдзеленага ў 11-м сказе слова. Запішыце адказ у назоўным склоне.***

**В8.** ***Вызначце беларускі адпаведнік да выдзеленага ў 7-м сказе слова. Пастаўце адпаведную лічбу:***

1) разлад, парушэнне нармальнай дзейнасці;
2) знішчэнне заразных мікробаў спецыяльнымі сродкамі;
3) паступовае пагоршанне, страта ранейшых якасцей.

## Кантрольная работа № 7

### Варыянт 1

***Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі. Устаўце прапушчаныя літары і знакі прыпынку.***

**Чалавек і расліны**

Пэ...ныя батанічныя веды меў ужо перша(бытны) чалавек бо з(?)біра(н, нн)е і ...жыва(н, нн)е ... ежу рас(?)лін давала ма...чымас(?)ць пазнаёмі...а (з, с) іх ...ласцівасцямі. (З)даўна чалавек навучыўся а...роз(?)ніваць ядомыя плады к...рані травы грыбы водарас(?)ці ад (не)ядомых атрутных ведаў як ...з(?)(д, дз)ейнічае тая ці іншая рас(?)ліна на арганізм. Жанчыны якія звычайна з(?)біралі рас(?)ліны і гатавалі (з, с) іх ежу заўважалі што адны рас(?)ліны выклікалі расстройства жывата другія

дапам...галі ад кашл... трэ...ія прыво(д, дз)ілі ... узбуджа(н, нн)ы стан. Лю(д, дз)і запаміналі ...этыя ...лас(?)цівас(?)ці і св...дома выкарысто...валі іх пры л...чэ(н, нн)і розных хваро... . Так пара(л, лл)ел...на (з, с) батанічнымі ...з(?)нікалі і першыя веды ... галіне мед...цыны. Пра ступень веда(н, нн)я рас(?)лі(н, нн)ага с(?)вет... гаворыць той факт што за (не)кал...кі апошніх тыс...чаго(д, дз)яў чалаве...тва (не)а...крыла (ні)воднай новай ядомай рас(?)ліны.

Беларусы як і іншыя народы нашай планеты выкарысто...валі зерн... пл...ды к...рані рас(?)лін для харчава(н, нн)я а дрэвы для будаўні...тва. З рас(?)лін нашы про...кі выраблялі а(д, дзе)(н, нн)е абутак а пл...ды ліс(?)це карэ(н, нн)е ...жывалі як лекі.

Для буда...ніцтва жытла беларусы бралі ... асноўным хвойныя пароды дрэў сасну елку ра(д, дз)ей асіну і ду... . Бандарныя вырабы ма...стравалі час(?)цей (з, с) дуб... бочкі (д, дз)е...кі каду...кі і ліпы ліпаўкі для захо...ва(н, нн)я мёд... . Посу... хатняе начы(н, нн)е лы...кі міскі мака(т, ц)ёры масл...бойкі ступы (д, дз)іцячыя цацкі выраблялі (з, с) ліпы клён... б...розы ...ольхі.

В...лікае месца ... гаспадарчай (д, дз)ейнас(?)ці беларусаў займала з(?)біра(н, нн)е л...сных дароў грыбоў яга... кл...новага і б...розавага сокаў. За 5–6 (д, дз)ён да таго як ра...пус(?)ця...а пупышкі ... дрэве пракруч...валі (д, дз)ірачку і ...ста...лялі ... яе спец...л...ны ж...лабок. За 6–10 (д, дз)ён (з, с) аднаго дрэва атрымлівалі да 40 вёдраў сок... . Каб дрэва (не)гніло пракручан...ю (д, дз)ірачку потым забівалі калком ці замаз...валі глінай. Такі эк...лагічны спoса... ...дабычы б...розавіку быў ра...паўсюджа(н, нн)ы апрача Беларусі і ў Польшчы Чэхіі Югаславіі Балгарыі.

*(Паводле К. Шумскага)*

## Варыянт 2

***Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі. Устаўце прапушчаныя літары і знакі прыпынку.***

### «Добрыя» і «ліхія» дрэвы

Беларусы добра ведалі пра в...г...таты...ны п...ры...д рост... рас(?)лін хуткас(?)ць іх рост... . Напрыклад ду... на двар... каля дом... забар...нялася выс...ваць ж...лудом «той хто паса(д, дз)іць ду... ж...лудом памрэ раней чым дрэва дасягне яго рост... ». На першы погл...д такое тлумачэ(н, нн)е ...даецца памылковым але цяпер ужо дакладна в...дома што ду... (з, с) ж...лудоў рас(?)(т, ц)е вел...мі павол...на асабліва на (П, п)алес...кай пя...чанай з...млі.

Усе дрэвы с...ляне па(д, дз)ялялі на «добрыя» і «ліхія» «праклятыя» «н...чыстыя». «Добрымі» дрэвамі л...чыліся в...рба б...роза клён ліпа дуб

елка. Іх забар...нялася се...чы (без)патрэбы. В...рбу ас(?)в...чалі на (В, в)ербніцу ў цэрквах і кас(?)(т, ц)ёлах галінкамі б...розы клён... ліпы аздаблялі д...мы на (С, с)ёмуху. Беларусы ахвотна са(д, дз)ілі на св...іх с...(д, дз)ібах б...розы клёны ліпы лічылася што яны прыносяць лю(д, дз)ям шчас(?)це. Ссекчы дрэва што расло (па)блізу хаты на двар... ці на ...уліц... было в...лікім гр...хом.

Секчы (не)каторыя дрэвы на...огул забар...нялася. Так нел...га было ...нішчаць ч...ромху бо «пчолам (не)бу(д, дз)е адкуль браць в...сновы мё...» а (так)сама яс...нь бо «(з, с) яго нашыя про...кі атрымалі св...шчэ(н, нн) агонь».

Н...гатыўныя ўяўле(н, нн)і былі ...вяза(н, нн)ы (з, с, са) значна мен...шай кол...кас(?)цю відаў дрэў і на...перш (з, с) асінай. Па...сюдна лічылася што на ёй павесіўся Іуда. Асіну клалі на м...гілу чар...ўнікам асінавымі к...ламі прабівалі іх у труне каб яны (не)уставалі. Страшным прakля...ем былі словы Павіс(?)ні ты на горкай асіне. Гэтае дрэва забар...нялася выкарысто...ваць у (гаспадарка) апроч будо...лі см...лакурань бо беларусы трапна за...важылі што «ўсё адно ад смалы проц...ма ч...р(т, ц)ей дык і ад асіны (не)бу(д, дз)е іх бол...ш».

Веды пра рас(?)лі(н, нн)ы с(?)вет выкарысто...валіся і ў народнай мет...ралогіі. В...дома што перад дажджом (не)каторыя рас(?)ліны закрываюць кветкі другія вылучаюць духмяны н...ктар трэ...ія «плачуць» ліпкімі кроп...л...камі (сок) ча(т, ц)вёртыя м...няюць форму і палажэ(н, нн)е лістоў. Усе ...этыя з(?)мены ў паво(д, дз)інах рас(?)лін былі за...важа(н, нн)ы піл...нымі вачыма людзей што дазв...ляла (да)волі дакладна вызначаць надвор...е на бліж...йшы час.

*(Паводле К. Шумскага)*

## Варыянт 3

***Дыктант.***

### Буслiная радасць маленства

Як радасна-шчымліва было прачнуцца ў той ці іншы веснавы дзянёк і ўбачыць: буслы прыляцелі! Гэтая вестка імкліва неслася ад хаты да хаты, пераскокваючы лужыны, а то і проста плюхаючыся па вадзе. І не было на тое імгненне больш значнай падзеі, чым гэта.

Праходзіў дзень-другі агульнага дзіцячага ўзрушэння, а потым зноў усё станавілася прывычным, нібыта і не было таго млоснага чакання. І жыццё зноў уваходзіла ў звычайнае рэчышча: мы бавілі час у сваіх дзіцячых гульнях-клопатах, буслы жылі ўласнымі птушынымі турботамі. Але гэта, пэўна, толькі здавалася так, што мы, сваволячы, не заўважалі сваіх крылатых суседзяў, бо варта было ўвосень апусцець буслянцы, як

у той жа дзень мы адчувалі: нечага не хапае на нашай вуліцы. І разумелі: не хапае буслоў, іх клёкату, святла іх крылаў.

Буслiная радасць маленства… У тое імгненне, калі, прачнуўшыся і выбегшы на вуліцу, мы ўбачылі стары вяз, які, быццам перакуліўшыся цераз плот, лёг наўскасяк дарогі, нашы позіркі выхапілі верхавіну дрэва, а на ёй — разварушаную і паўраскіданую буслянку. Гэта ж так нечакана нам адкрылася тайна буслінага гнязда, што некалі ўзнімала ўгару нашы галовы, прыцягвала як магнітам нашы дапытлівыя позіркі. Ды толькі нярадасна было ад зведанай тайны гэтай, бо мы ведалі: вось-вось вернуцца буслы і, не ўбачыўшы на звыклым месцы роднай буслянкі, назаўсёды зляцяць з нашай вёскі. І таму ніякавата было глядзець, як бацька з дзядзькам Іванам распілоўвалі на роўныя цурбакі зламаны ствол вяза і, быццам слёзы з нашых вачэй, сыпаліся з-пад пілы-двухручкі зярняты-апілкі.

А калі назаўтра ўбачылі, як птушкі пачалі ладзіць сабе гняздо на электрычным слупе, што стаяў воддаль іх былога жытла, мы былі ашаломленыя. Так і застылі, не верачы сваім вачам.

*А. Зэкаў «Развагі для раўнавагі»*
*(258 слоў)*

## Варыянт 4

### Тэст А

**А1.** ***Адзначце словы, у якіх літара е абазначае два гукі:***

1) лесавод;
2) аселішча;
3) валжане;
4) своечасова;
5) егіпецкі.

**А2.** ***Адзначце словы, у якіх падкрэсленыя спалучэнні вымаўляюцца як гук [цц]:***

1) у абвестцы;
2) на лавачцы;
3) суседскі;
4) у куртцы;
5) грамадства.

**А3.** ***Адзначце словы, якія адрозніваюцца націскам у беларускай і рускай мовах:***

1) аўкцыён;
2) долата;
3) чатырнаццаць;
4) вугор;
5) магазін.

**А4.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара а:***

1) характ...р;
2) д...канат;
3) літ...ратурны;
4) секр...тэр;
5) ш...равокі.



Репозиторий БГПУ

**А5.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара е:***
1) ...фрэйтар; 4) эн...ргетык;
2) эл...ватар; 5) ...ўрэйскі.
3) этаж...рка;

**А6.** ***Адзначце словы з правільным напісаннем:***
1) ветэран; 4) Чалябінск;
2) рэфарматар; 5) элемент.
3) крэпасны;

**А7.** ***Адзначце словы з прапушчананй літарай о:***
1) пат...лагаанатамічны; 4) в...стразубы;
2) в...даварот; 5) глыб...кадумны.
3) паўн...чнаамерыканскі;

**А8.** ***Адзначце словы з прапушчаным спалучэннем літар ія:***
1) шар...т; 4) д...лектыка;
2) імпрэс...нізм; 5) ак...н.
3) калан...льны;

**А9.** ***Адзначце словы з прапушчанай літара ў:***
1) Барна...л; 4) архівары...с;
2) а...тамабіль; 5) філасо...скі.
3) чароўная ...верцюра;

**А10.** ***Адзначце словы, якія пішуцца паводле толькі фанетычнага прынцыпу:***
1) цяплейшы; 4) вобласць;
2) бяскрайні; 5) археолаг.
3) разжыцца;

**А11.** ***Адзначце словы, якія пішуцца з малой літары:***
1) сузор'е (В, в)аласы Веранікі;
2) (Н, н)оеў каўчэг;
3) (С, с)вятое Пісанне;
4) (С, с)кандынаўская сага;
5) (Б, б)рылёўскі раман.

**А12.** ***Адзначце сінанімічныя рады:***
1) яда, корм, закуска;
2) сухарэбры, сухастоіна, кастлявы;
3) хлопец, дзяцюк, дзядзіна;
4) дзядзінец, дзядоўнік, дзядзькаванне;
5) надакучаць, назаляць, надаядаць.

**А13.** ***Адзначце назоўнікі з канчаткам -ы(-і):***
1) не стой на (дождж);

2) гняздо ў (асака);
3) пры (брыгадзір);
4) сядзець на (конь);
5) падарыць (сястра).

**А14.** ***Адзначце словы, у якіх у месным склоне назіраецца чаргаванне зычных:***

1) дыспут; 2) рота; 3) віядук; 4) Вольга; 5) квадрат.

**А15.** ***Адзначце слова, у якіх прапушчана літара ь:***

1) кан...юнктывіт;
2) студзен...скі;
3) астрахан...скі;
4) тайван...скі;
5) п...еса.

**А16.** ***Адзначце чацвёртае «лішняе» слова, якое ўжываецца ці толькі ў адзіночным, ці толькі ў множным ліку:***

1) дыскусія, парытэт, экспедыцыя, альтанка;
2) хованкі, хрэсьбіны, сківіцы, суткі;
3) сэнс, турызм, сыр, тынк;
4) валасы, кудзеры, насілкі, пошукі;
5) дзявоцтва, арэлі, заручыны, дажынкі.

**А17.** ***Устанавіце адпаведнасць паміж іншамоўнымі словамі і іх беларускімі сінонімамі:***

| | |
|---|---|
| А. Абстрактны. | 1. Адцягнены. |
| Б. Прыярытэт. | 2. Здарэнне, непаразуменне. |
| В. Інцыдэнт. | 3. Ветлівы, правільны. |
| Г. Карэктны. | 4. Перабольшванне. |
| | 5. Перавага, першынство. |

**А18.** ***Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок:***

1) кніга...гандаль;
2) парнікова...цяплічны;
3) прыма...донна;
4) чорна...белы;
5) дзед...мароз.

**А19.** ***Адзначце словы з памылковым напісаннем:***

1) палерына;
2) караблебудаванне;
3) капрыччыо;
4) шавецкі;
5) бангкокскі.

**А20.** ***Адзначце прыказкі, дзе трэба ўставіць займеннік*** *табе:*

1. Не шукай бяды, яна сама .. знойдзе.
2. Гора .. , воле, калі цябе карова коле.
3. На .. , Божа, што нам нягожа.
4. Не мне казаць, не .. слухаць.
5. Не ідзі туды, куды .. не просяць.



Репозиторий БГМУ

**А21.** ***Адзначце прыметнікі, ад якіх нельга ўтварыць формы ступеняў параўнання:***

1) птушыны; 4) светлы;
2) зручны; 5) руды.
3) фіялетавы;

**А22.** ***Адзначце словы, будова якіх адпавядае схеме: прыстаўка + корань + суфікс + канчатак***

1) азіміна; 4) скрыўлена;
2) супадзенне; 5) патасоўка.
3) выцягнуць;

**А23.** ***Адзначце сказы, у якіх ужываецца часціца*** *ні:*

1. Як бы н... склалася яго творчая біяграфія, Мікола заўсёды будзе імкнуцца ўвасобіць гераічныя ўчынкі людзей, іх самыя высокія душэўныя парывы. (*М. К.*)

2. Куды б Міша н ... хадзіў з Ірай, заўсёды стараўся своечасова вярнуцца ў інтэрнат. (*Гіг.*)

3. Як н... стараецца злачынца замесці сляды, злачынства выдае яго. (*М. К.*)

4. Грукат капытоў, які нарастаў, быў н ... утаймавана грозны. (*У. К.*)

5. Ехаў жа я н... экскурсантам, н... турыстам, н... простым валацугам, а з тайным і сакрэтным заданнем ад працоўнага калектыву. (*Бар.*)

**А24.** ***Адзначце сказы, у якіх ёсць недакладнасці ва ўжыванні злучка ці двукосся:***

1. Тысячы «чаму» грызлі мяне і тачылі маю душу штодня. (*Бар.*)

2. Ад Эмінага пяшчотнага «Валодзька» я плавіўся, як воск пад сонцам. (*Бар.*)

3. Руіны фальварка Якуба Наркевіча-Ёдкі, электрычнага чалавека. (*Кам.*)

4. За нешырокай вуліцай з адна- і двухпавярховымі дамамі горбіўся абгарэлы, у камуфляжнай фарбе Дом урада. (*Асіп.*)

5. А мы з вамі давайце зазірнём у таямнічую хатку лесьнічоўку. (*Федар.*)

**А25.** ***Адзначце сказы, у якіх аднародныя члены звязаны супраціўнымі злучнікамі:***

1. Нянькі ціха войкнулі, але тут жа спалохана замоўклі. (*В. Іп.*)

2. Ціўканне тое як нечакана пачалося, так нечакана і скончылася. (*М. Гіль*)

3. Язэпка пасталеў, паспакайнеў, але да раз'юшанага бацькі так і застаўся ў яго не то страх, не то нянавісць. (*М. Гіль*)

4. А гады тыя пасляваенныя хоць і цяжкія, галодныя былі, а беглі. (*М. Гіль*)

5. Нельга было зразумець, ці то вечар, ці то ноч за вокнамі. (*Бар.*)



Репозиторий БГМУ

**А26.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю неабходна дапоўніць працяжнікам:***

1. Вёска наша сэрца, пульс краіны, і дарэмна горад нос задраў, на яе глядзіць, як на руіны, — будзе ў вёскі светлая пара! (*Кар.*)

2. Але гады няўмольныя, бо яны памалу адбіраюць усё тое, што міласціва падараваў Бог чалавеку розум, сілу, слых, зрок... (*Лоб.*)

3. Робіш за вала ясі за камара. (*В-х*).

4. Рве раб ланцуг, а путы конь. (*Кар.*)

5. На кожнай градцы добра выгабляваная дошчачка, на ёй па-лацінску і па-руску запісана назва расліны, час пасеву, догляд словам, як у нашых цяперашніх юннатаў. (*«Р. сл.»*)

**А27.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю неабходна дапоўніць двукроп'ем:***

1. Мастацкае адкрыццё і засведчанне цудаў вось што вылучае творчы метад пісьменніка А. Федарэнкі. (*М. Верціхоўская*)

2. Назаўтра стары правадыр ліваў з падручнымі выйшаў з пушчы і прапанаваў Усяславу хаўрус даў клятву вернасці, абавязаўся плаціць даніну, як і раней, дасылаць сваіх вояў у полацкае войска ў час вайны. (*Я. К.*)

3. У чатыры гадзіны, у цемры, пан Юры заспяваў, ідучы ў збройную, і толькі ля дзвярэй сына змоўк успомніў, што той не едзе і гэты радасны спеў можа на цэлы дзень засмуціць сына. (*У. К.*)

4. Пасля халоднага душу галава ў Бусла прасвятлела куды падзеўся боль, цела паступова налілося сілай, начная стома пачала забывацца. (*В. Пр.*)

5. Справа ў тым што я апошнія тры гады рабіў з геолагамі і нават кіраваў геалагічнай партыяй. (*Асіп.*)

**А28.** ***Адзначце складаназалежныя сказы з паслядоўным падпарадкаваннем:***

1. Князь павінен быў вітаць караля, пад'ехаць да яго, але конь нізавошта не хацеў стаяць спакойна, таму яго трымалі за вуздэчку двое слуг. (*Ю. Кр.*)

2. Я ішоў у гушчар, ледзь не за хвасты цягнуў дурных лабатых цялят і думаў пра Язэпку, думаў пра тое, што гэта ж ён паказаў мне, дзе ў нашым лесе лепшыя грыбныя куткі, дзе раней за ўсё выспяваюць суніцы і арэхі, дзе лепш за ўсё аблюбаваць сасонку, каб надраць з-пад яе на кошык пахучых, гнуткіх каранёў. (*М. Гіль*)

3. Хаця Жывена перавезла Відэвута і яго маці ў новы дом, дзе пра іх сталі клапаціцца двое слуг, спакою там не было. (*В. Іп.*)

4. Сцежка, якой рушылі далей, бачылася выразна, бо над лесам вісеў зыркі рог маладога месяца. (*Дуб.*)

5. Неабходна адзначыць, што ў 1226 годзе магістр Тэўтонскага ордэна заручыўся прывілеем імператара Фрыдрыха II, які ўсе тэрытарыяльныя заваёвы ў землях прусаў «перадаваў» ва ўласнасць крыжакоў. (*К. Т.*)

**А29.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю неабходна дапоўніць працяжнікамі ці дужкамі:***

1. Але вось, паказаўся о, якое гэта шчасце! выратавальны астравок. (*П. С.*)

2. Мінуўшы масток, Пятро аднак не пайшоў вуліцаю дахаты, а завярнуў у вулачку, што ішла ўздоўж рэчкі. (*М. Гіль*)

3. На добры лад дык і ці трэба было б забірацца з трактарам так высока, так ашчадна абворваць гэты пясчаны грудок. (*М. Гіль*)

4. І вось яшчэ нехта схіляецца ў сне нада мною страшэнна баліць галава! высокі, стары, з хваляй карункаў на грудзях. (*У. К.*)

5. Не чакаючы світання а чаго чакаць: цяпер, у глыбокую восень, аж да самага паўдня вось такая цемра, Пракоп амаль навобмацак пачаў запрагаць. (*Сіп.*)

**А30.** ***Адзначце сказы з пунктуацыйнымі недахопамі:***

1. Ранічкай, у нядзельку, а шостай гадзіне, хаця ішоў на вуліцы праліўны і халодны дождж, я, накінуўшы на плечы плашч і ўзяўшы стары парасон, які мне некалі падараваў матрос з рыбацкага сейнера (быў у далёкіх краінах), папраставаў у сабор святых Пятра і Паўла. (*Бар.*)

2. Тут, у дачным пасёлку, ціха і светла, асабліва, калі прайсці якіх сто метраў да лесу, засыпанага шыльнікам і бярозавым лісцем. (*Т. Бондар*)

3. З велізарнейшым пачуццём удзячнасці расказваў бацька пра Вольгу Сцяпанаўну Багдановіч, сваю першую настаўніцу, якая працавала ў школьным пакойчыку адразу з чатырма групамі дзяцей рознага ўзросту, падзеленых на чатыры класы. (*В. Казлова*)

4. Васіль Зубрыцкі з першага позірку вызначыў чаму не ідуць справы ў брыгадзіра, пачаў тлумачыць, паказваць, адначасова і папракаючы яго ў няўменні арганізаваць работу. (*Бар.*)

5. Прыслужніца фізічна моцная дзяўчына, і яе дух, характар — што гранітны падмурак у гэтым замку. (Казл.)

**А31.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць дзвюма коскамі:***

1. Як падымаўся-апускаўся ўваходны полаг-дыван шатра і хто-небудзь заходзіў свечкавыя агеньчыкі выцягваліся ў доўгія языкі. (*Дал.*)

2. З лесу выбегла мноства сялянскіх вояў яны атачылі разгубленае рамейскае войска якое і не спрабавала нікуды ўцякаць. (*З. Д.*)

3. Міжвольна Драгамір зразумеў што і сам стаў падобны да камення якое вымушана ляжаць там дзе яго паклалі, пакуль валуны не сатруцца ў пыл і прах і не знікнуць без сляда. (*З. Д.*)

4. Мясціна была новая незнаёмая і таму здавалася хлопцам таямнічай. (*Дубр.*)

5. Пакуль Мая бегала па білеты Вадзім сядзеў у зале гартаў стары часопіс без пачатку і канца. (*Асіп.*)

**А32.** ***Адзначце сказы з правільна афармленай чужой мовай:***

1. Камедыя-лубок «Альдона, Анфіса» — смелы зварот Георгія Марчука да глядзельнай залы ў красамоўным прызнанні-парадзе: «Шчасце не ў тым, чаго няма ў цябе, а ў тым, што ты ёсць». (*«ЛіМ»*)

2. Паехалі, — пераступіў з нагі на нагу шафёр і, хаваючы вочы, стрымана дадаў: — Толькі дай ачомацца, паджылкі трасуцца, быццам курэй краў. (*В. Пр.*)

3. У Ляўках Янка Купала, па словах цёці Уладзі, «мог доўга слухаць шум бору, глядзець на Дняпро». (*Сіп.*)

4. Антон дадаў: Усім астатнім заставацца на караблі да нашага вяртання. Калі якая небяспека, сігналізуйце, выходзьце на мабільную сувязь. Думаю, мы хутка ўсё высветлім, — і папрасіў лабаранта: «Зрабіце замеры на наяўнасць паветра. Калі яно ёсць тут, магчыма, што скафандры і не спатрэбяцца». (*Р. Бар.*)

5. – Ты ж вельмі разумная істота, ці не так, Паўзунок? — дапытваўся ў вужыка хлапчук. — Ты ўсё чыста разумееш, ды сказаць не можаш. (*Бар.*)

## Тэст В

**В1.** ***Адзначце, якім членам сказа з'яўляецца фразеалагізм у ніжэйпрыведзеным сказе:***

Будзь ты вунь які таленавіты, але, калі ты гультаяваты, калі ты не працуеш да сёмага поту, ты вялікіх вышынь не дасягнеш. (*Дам.*)

1) дзейнікам; 3) азначэннем; 5) акалічнасцю.
2) выказнікам; 4) дапаўненнем;

**В2.** ***Знайдзіце граматычны недахоп у прыведзеным дыялогу. Запішыце слова ў правільнай форме:***

– А хто ў мяне на полі працаваць будзіць? — вёў сваё Пракоп.

– А не балабонь ты, стары, абы-чаго, — умяшалася ў размову Пракопішка. (*Сіп.*)

**В3.** ***Выпішыце са сказа лічэбнік у патрэбнай склонавай форме, замяніўшы лічбы словамі:***

Здаецца, Мітка павінен быў быць сярод тых вояў, якіх, схаваўшы ў (300) вазах сена, прывезлі ў Трокскі замак змоўшчыкі супраць Жыгімонта. (*Сіп.*)

**В4.** ***Адзначце, якая памылка дапушчана ў сказе:***

У вершы няма глыбакадумных сінтэнцый, што прэтэндуюць на філасофскія абагульненні, няма патугі на ўяўную заглыбленасць і нейкія незвычайныя высновы. (*В. М.*)



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1) арфаграфічная; 3) пунктуацыйная;
2) граматычная; 4) лексічная.

**B5.** ***Вызначце, калі ставіцца коска (коскі) пры зваротах са злучнікам*** *як*, ***і ўкажыце суадносіны паміж слупкамі табліцы:***

| | |
|---|---|
| А. Наверсе галіны елкі як перакладзіны лесвіцы. (*Бар.*)<br>Б. Былую нямецкую асаду выдалі Сымону Чачотку як удзельніку вайны і добраахвотніку войска польскага. (*В. Адамчык*)<br>В. Водзіць вецер як скрыпач смык галіны. (*К. Жук*)<br>Г. Гэта было як зачэпка да размовы. (*Асіп.*) | 1. Коска не ставіцца, бо зварот мае значэнне «ў якасці».<br>2. Коска не ставіцца, бо зварот з'яўляецца выказнікам.<br>3. Коскамі выдзяляецца параўнальны зварот, які паясняе выказнік і з'яўляецца акалічнасцю.<br>4. Коска не ставіцца, бо параўнальны зварот уваходзіць у склад выказніка.<br>5. Коска ставіцца перад злучнікам *як*, які звязвае часткі складаназалежнага сказа. |

**Тэкст да заданняў В6–В8**

**Вытокі «Пінскай шляхты»**

1. Зрэшты, чаго мне далёка было хадзіць, каб даведацца пра існаванне рэальных герояў «Пінскай шляхты». 2. Аказваецца, я даўно ўжо ведаў, і не толькі ведаў, а нават пахаўрусаваў з адным Цюхаём-Ліпскім! 3. Кажу не пра каго іншага, як пра нашага вядомага беларускага пісьменніка, старшыню Беларускага дзіцячага фонду Уладзіміра Ліпскага! 4. Вось толькі не папытаўся я яшчэ ва Уладзіміра, на якой дарозе згубіў ён свой родавы прыдомак Цюхай. 5. Пра Цюхай-Ліпскіх, пра ваколіцу Ольпень, пра паездку туды Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча я ўзахлёб прачытаў у «ЛіМе» ў нарысе Уладзіміра Ліпскага «Дунін-Марцінкевіч і пінская шляхта». 6. Нашчадак Марцінкевічавых герояў намерыўся дакапацца і дакапаўся-такі да вытокаў, да жыццёвай асновы знакамітай камедыі. 7. Аказваецца, зачэпкай для яе паслужыла адна вельмі гучная судовая справа пра ольпенскіх Цюхаёў-Ліпскіх, якіх самыя высокія ўлады змушалі перакінуцца з каталіцкай у праваслаўную веру. 8. Заведзеная ў Мінскай духоўнай кансісторыі загадам губернскага кіраўніцтва, гэтая справа («Справа № 39»), якая была распачата 17 лістапада 1837 года, цягнулася трыццаць тры гады! 9. Трыццаць тры гады абараняліся ўпартыя Цюхай-Ліпскія ад неадчэпнага націску высокіх чыноўнікаў, якім вельмі карцела вярнуць у «истинную веру» гэтыя «заблудшие души». 20. Не адзін раз цягалі ольпенскіх неслухаў у Мінск да самога праваслаўнага архіепіскапа. 21. А калі і гэта не памагло, ольпенскімі Цюхаямі заняліся ўсемагутны Сінод і нават сам гасудар Расійскай імперыі. 22. Ды, як выявілася, пінскай

шляхце і намеснік Бога на зямлі быў не ўказ! 23. Не паслухаліся нязломныя Цюхай-Ліпскія цара-бацюшку! 24. Не здрадзілі веры сваіх продкаў!

**В6.** ***Вызначце стыль і тып тэксту.***

**В7.** ***Знайдзіце сказ з адасобленым азначэннем і укажыце нумар сказа.***

**В8.** ***У сказах 6–8 знайдзіце прыметнік, ужыты ў найвышэйшай ступені параўнання, і выпішыце яго.***

## Кантрольная работа № 8

### Варыянт 1

**1.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць працяжнікам.***

1. Галінка бэзу сум і радасць, што вечна ў памяці жывуць. (*Л. Пранчак*) 2. Сустрэцца са сваім земляком, пагаварыць па-свойму, успомніць тое, як жыў ён некалі на радзіме, вялікае шчасце. (*Сач.*) 3. Але ж як гэта нецікава жыць без тайны! (*Федар.*) 4. Адно падабалася Глебу ў Полацку кожны месціч клапаціўся пра сваё жытло. (*Я. К.*) 5. Сэрца Элачкі забілася часцей вось ён яе аддany рыцар. (*І. Т.*)

**2.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць коскай паміж аднароднымі азначэннямі.***

1. Перазараджаючы пісталет, Алесь гаварыў з Тромбам ласкавым журлівым голасам. (*У. К.*) 2. І раптам шкадаванне і няўтольная вострая, ніколі ў жыцці яшчэ не адчуваная пяшчота авалодалі ёй [Майкай]. (*У. К.*) 3. Алесь толькі на золку заснуў на якую гадзіну цяжкім кашмарным сном. (*У. К.*) 4. Горад Ахен хаваўся за цёмнымі каменнымі сценамі. (*З. Д.*) 5. Паветра пачысцела, зрабілася прасветленым празрыстым, як вымытае шкло. (*Лев.*)

**3.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць двукроп'ем.***

1. Першая прыступка ратнай навукі валодаць мячом. (*Я. К.*) 2. Юрыдычны факультэт Алеся не вабіў якому праву могуць вучыць у краіне бяспраўя? (*У. К.*) 3. Пры школе была абсталявана пляцоўка для заняткаў па фізкультуры перакладзіна, кольцы, бумы, лесвіца, канат, была і валейбольная пляцоўка. (*Дам.*) 4. Рахіля старалася, каб дзетдомаўскія дзеці былі акуратныя вучыла іх прышываць гузікі, цыраваць шкарпэткі, падшываць падалы, прыгожа засцілаць ложкі. (*Лоб.*) 5. Металургія, вытворчасць шкла, фарбаў, керамікі ўсе гэтыя галіны не маглі абысціся без хімічных доследаў. (*«Полымя»*) 6. Я слухаў паданні азёраў старых маўклівую чэрвеньскай ноччу аб белых палацах, аб цёмным бары, аб лёсах зламаных дзявочых. (*Ваб.*)

**4.** ***Адзначце простыя сказы з недапасаванымі азначэннямі.***

1. Мы ледзь знайшлі больш-менш роўную пляцоўку, каб пасадзіць наш карабель. (*Р. Бар.*) 2. Наперад з купкі людзей падаўся хлопец гадоў дваццаці пяці, з доўгімі русявымі валасамі і маленькай вострай бародкаю. (*В-х*) 3. Жыве тут сягоння мінулых часін нясходлівым ценем паданне. (*Мятл.*) 4. З цікавасцю разглядваў Раман франтавыя трохкутнікі. (*Бут.*) 5. За гады міжволі вырасла нейкая дзіўная адчужанасць. (*У. К.*)

**5.** ***Адзначце сказы з адасобленымі азначэннямі (улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены).***

1. Вочы дзеда былі ласкавыя і сумныя. (*У. К.*) 2. Не цешаць такія ўспаміны а толькі сівым туманам суму ахутваюць мяне поўнячы тугой і шкадаваннем. (*А. Яскевіч*) 3. Перад Міхасём высіўся будынак у некалькі паверхаў звонку вельмі падобны на гіганцкую шпакоўню. (*В-х*) 4. Доўга будуць помніцца гэтыя поўныя ўрачыстай велічы сосны і яліны абсыпаныя снегам ад макаўкі да самага нізу і некранутае палатно снегу паабапал сцежкі і пахрустванне цішыні ледзь кранутай марозам. (*Т. Бондар*) 5. Бяроза сынава равесніца шумі пад ветрам над ракой імкні да сонца зор і месяца гайдай зялёны неспакой. (*В. Яр.*)

**6.** ***Адзначце сказы з адасобленымі прыдаткамі (улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены).***

1. Кожная ладдзя-насад мела сем пар вёслаў а на носе ачаг жалезную скрыню напоўненую пяском. (*Я. К.*) 2. Гэтыя дзіўныя стварэнні вёрткія яшчаркі знаходзяць сабе нейкую ежу і ваду. (*З. Д.*) 3. Сабака паскугольваючы скакаў Крушынскаму на грудзі. (*Федар.*) 4. Адзіная ва ўсім свеце яна не баялася цемры апраметнай і скрыгату зубоўнага. (*У. К.*) 5. Згодна з гістарычнымі звесткамі дрыгавіты жылі на Балканах у ваколіцах горада Салуні. (*З. Д.*)

**7.** ***Адзначце сказы, у якіх ёсць недакладнасці ва ўжыванні злучка і двукосся.***

1. Царква ў Мілым была храмам-крэпасцю. (*У. К.*) 2. Іншых тут бадай што і не будавалі чатырыста пяцьсот год назад. (*У. К.*) 3. Лашковіч быў у шапцы-вушанцы з апушчанымі доўгімі вушамі і завязанымі пад падбародкам чорнымі тасёмачкамі, у чорным, добра паношаным бушлаце, які называў «марынаркай». (*І. Пт.*) 4. І раптам так заманулася кінуць рынуць усё і паехаць у Арменію. (*Лев.*) 5. Зёлкі вылучаюць дыханне матухны-зямлі, якая нас корміць, поіць і лечыць. (*З. Д.*)

**8.** ***Адзначце сказы з адасобленымі акалічнасцямі (улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены).***

1. Сабака стаміўшыся проста вярнуўся дамоў. (*Федар.*) 2. Трыццаць восем год жыў у самоце нічога не патрабуючы ад жыцця. (*У. К.*) 3. Дрэвы

стаялі не варушачыся раскашаваліся. (*У. К.*) 4. Безумоўна гэтыя воі былі апранутыя ў што Бог паслаў. (*З. Д.*) 5. Так што мелі рацыю зарэчанцы. (*Федар.*)

**9.** ***Адзначце сказы з адасобленымі дапаўненнямі (улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены).***

1. Кожная полацкая сям'я згодна са звычаем дасылала на вайну ўсіх дарослых сыноў за выключэннем аднаго малодшага. (*Я. К.*) 2. Валік хацеў сказаць што ёсць тысячы цікавых спраў і акрамя расследаванняў. (*Федар.*) 3. Конь убачыў што гаспадар нават не глядзіць у ягоны бок што ў яго нічога няма ў руках акрамя кавалка цукру. (*У. К.*) 4. Гетман Сасноўскі прайграў у карты князю Любамірскаму адзін са сваіх маёнткаў і вырашыў замест маёнтка аддаць за малодшага сына князя дачку Людвісю. (*Я. К.*) 5. Акрамя дзённікаў сшыткаў «Думкі» артыкулаў пяру паэта Пятра Сеўрука належаць апавяданні аповесці вершы. (*Дзел.*)

**10.** ***Адзначце сказы з прамымі дапаўненнямі.***

1. Гарады засталіся маўклівымі і загадкавымі сведкамі мінулага. (*З. Д.*) 2. Я паспрабаваў уявіць прыгожы драўляны дом. (*Р. Бар.*) 3. Збіліся конныя лавіны, загрымелі жалезам, затрашчалі шчытамі. (*Я. К.*) 4. Справядлівасць чалавек павінен адчуваць сэрцам, а не законамі. (*У. К.*) 5. Па дарозе дахаты хлопец у думках складаў справаздачу для маці, для строгага бацькі і ўсмешлівага брата. (*Г. Ч.*)

**11.** ***Адзначце аднасастаўныя безасабовыя сказы.***

1. Тысячу год ім чакаць і не дачакацца. (*У. К.*) 2. Размова касы з атавай. (*П-ў*) 3. Яму было лёгка і радасна. (*Федар.*) 4. Трэба падрыхтавацца добра, запасціся неабходнымі асаднымі машынамі і прыстасаваннямі. (*З. Д.*) 5. Красак дзіўных святло ў агнях патанае. (*Гасп.*)

**12.** ***Адзначце сказы, у якіх набраныя курсівам словы выдзяляюцца працяжнікам ці дужкамі (улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены).***

1. У Агульніцы *так называлася пасека за маладым яшчэ лесам дзе быў леспрамгасаўскі ўчастак* я ўбачыў у шэрай цемнаце доўгую цёмную канюшню на белым снезе. (*І. Пт.*)

2. Пасля заканчэння службы Сяргей паслужыў у дывізіі яшчэ год «макароннікам» *так называюць тых хто застаўся на звыштэрміновую службу*. (*В-х*)

3. Ты ж канагон *як кажуць* па прызванні а я брат паняволі канагон. (*М. Аўрамчык*)

4. У апошні час у нас з'явілася *так бы мовіць* наіўная проза. (*Запр.*)

5. Так, нагляднасць — на дошку! *Дарэчы* як можна называць такім жалезабетонным словам маю прыгожанькую *паўночы малявала ажно сама разабралася* схему? (*«Маладосць»*)

**13.** ***Адзначце сказы, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку.***

1. Бравусаў уторкнуў касу, нібы вітку, касільнам у зямлю, каб здалёку было відаць і нетаропка пайшоў да ракі. (*Лев.*)

2. Чытаў паэму і лёгка адгадваў, якія падзеі, якіх асобаў меў на ўвазе бабруйскі езуіт-прапаведнік — лепшы тагачасны паэт на Літве. (*Я. К.*)

3. Я, нібы тая лодка, у якой перабілі ланцуг, што трымаў яе ля берага. (*Лоб.*)

4. Адхінуліся бліскучыя на сонцы дзверцы ў «студары» — студар быў як новенькі, з двума заднімі мастамі і вядучым перадком, — і з кабіны з высокага сядзення саскочыў на дарогу малады, гадоў трыццаці, капітан. (*І. Пт.*)

5. З усходу напаўзала вялізная цёмна-шызая хмара, і дождж неўзабаве лінуў, як з вядра, неба акурат прарвала. (*Лев.*)

**14.** ***Адзначце складаназалежныя сказы з дзейнікавай часткай.***

1. Заслонены конскім целам стаяў, зусім непадалёку ад Мусатава, той, за кім яны гналіся. (*У. К.*)

2. Гаспадар кінуўся ў камору — маленькую прыбудову без акон, якая служыла яму яшчэ і складам, і халадзільнікам, і ПОграбам. (*Федар.*)

3. Мастакі сцвярджаюць, што шэры колер атрымліваецца ад змешвання чорнага і белага. (*Ул. Л.*)

4. Лічылася, што русалка не магла перайсці праз мяжу на полі. (*К-д*)

5. Вядома, што доследамі хіміка і філосафа Парацэльса актыўна цікавіўся і наш Ф. Скарына. (*«Полымя»*)

**15.** ***Адзначце складаназалежныя сказы з сузалежным аднародным падпарадкаваннем.***

1. Лічы сябе шчаслівым смела, хоць часта быў і без граша, калі хоць раз спявалі цела і закаханая душа. (*М. Д.*)

2. Наш славуты зямляк Чэслаў Пяткевіч, які пакінуў у спадчыну сваю манаграфію «Рэчыцкае Палессе», прыгадвае аповед, як дзеўка з дапамогай зелля вярнула да сябе жаніха. (*Ул. Л.*)

3. І раптам, калі пачало ўжо брацца на восень і буслы сталі збірацца разам на бліжнім поплаве, у Вялікай Бярозе з'явіўся Іван Серабракоў. (*Бут.*)

4. Нязвыкла бачыць, што расліны такія зялёныя, поўныя жыцця, калі за акном самы разгул снежня. (*Федар.*)

5. Завітала Бона і ў свой рагачоўскі замак, якому столькі прывілеяў давала і фундатарам касцёла ў якім была. (*У. К.*)

**16. *Вызначце тып памылкі, дапушчанай у сказе.***

Камяніца была старая, з абваленымі зубцамі і без брамы, але вакол белымі ў цемры аблокамі цвіў глог, святлела брызгліна і ўгадваліся па водару шыпшына і бружмель. (*У. К.*)

1) пунктуацыйная;

2) арфаграфічная;

3) граматычная;

4) лексічная.

**17. *Адзначце складаныя сказы з living рознымі відамі сувязі.***

1. Як планеты на зорным небе могуць знаходзіцца толькі ў пэўных сузор’ях, так і людзі не ў стане вырвацца з вярыгаў свайго часу: гэта не дадзена нікому, як ні «сні», ні фантазіруй, ні арыгінальнічай. (*Запр.*)

2. Калі нарэшце паказалася леснічоўка, Крушынскі быў да таго змораны, што нават не адчуваў радасці. (*Федар.*)

3. Людзі не сумняваліся: іх уратаванне адбылося адзіна па волі Усявышняга, які пачуў іх адчайныя перадсмяротныя маленні. (*Масл.*)

4. Вараны стаяў спакойна, пакуль Глеб на яго караскаўся, аднак, калі княжыч закінуў нагу, рэзка адбегся — і хлопец паваліўся на зямлю спінай. (*Я. К.*)

5. У дзвюх-трох строфах паэт можа не тое што паказаць ці ўзнавіць, а неяк шматзначна і выразна намякнуць на драму, што адбылася з чалавекам у яго жыцці. (*В. М.*)

**18. *Адзначце сказы з граматычна-стылістычнымі ці лексічнымі памылкамі.***

1. Каля дзясятка гасцей сабраліся на сімпосіён, невялікую сяброўскую вячэру на мужчынскай палавіне дома ў архонта Фесалоні Мікандра. (*З. Д.*)

2. Я разумею, як нялёгка дамовіцца з гэтым Петручэняй.

3. Учора ўвечары Бабенчык прынёс нам свайго малога рыжага сабаку. (*В-х*)

4. Трэба было ехаць самой у Плешчаніцы на пошту па пасылку. (*І. Пт.*)

5. Убачыўшы гэты цуд скульптурнага мастацтва, на твары з’явілася ўсмешка.

**19. *Адзначце схему, якая адпавядае пастаноўцы знакаў прыпынку ў наступным сказе.***

Ваявода возьме з сабою святара, а не жраца думаў я але я мушу быць там каб не выбралі яны таго клятага месца дзе будзе ліцца кроў (*В. Іп.*)

1. – П, — а. — П.

2. «П! — а: — П».

3. «П? — а: — П».

4. «П, — а. — П».

5. «П? — а. — П».

**20.** ***Адзначце сказы, у якіх чужая мова афармлена правільна.***

1. Паэт Сяргей Карыцька знаходзіць аптымістычныя словы для апраўдання сваіх памкненняў і надзей:

«Ды, мабыць, так прызначана на свеце:
Чым больш сівых валос на галаве,
Становімся, старэючы, як дзеці,
І сэрца зноў надзеямі жыве».

2. Ж. Рэнар гаварыў, што: «Аптыміст паўсюль бачыць зялёнае святло, песіміст — чырвонае, а сапраўды мудры чалавек лічыць за лепшае з'яўляцца дальтонікам». (*«ЛіМ»*)

3. Калі які-небудзь госць назаляў, прымушаў мяне выпіць, я яму так казаў: «Пі вінцо Хрыстова, ды не мялі пустога. Я сам ведаю, што мне трэба». (*Лоб.*)

4. – Пакуль ваш чын не зацверджаны, будзеце лічыцца валанцёрам, — папярэдзіў генерал-лейтэнант. — Вам аплоцяць дарожныя выдаткі, а таксама атрымаеце армейскага каня і вупраж. (*Я. К.*)

5. – Усё, — важна, з разуменнем значнасці моманту сказала Ганна, прыкусіла губу і дадала, — следчыя пыталіся, я ім не паказала, — паклала ключык на накрыўку чамадана. (*Ул. Сц.*)

**21.** ***Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх даданая частка звязана з галоўнай пры дапамозе злучальнага слова.***

1. Гаразд шкадаваў князя, стараўся часцей падмяняць яго, хоць і сам вельмі стамляўся ад аднастайных рухаў. (*З. Д.*)

2. Узгадаліся бацькавы словы, што зоры — дзіркі ў начной заслоне, праз іх з вышыні струменіць Боскае Святло, нагадвае, куды патрапіш, калі пражывеш жыццё сумленна. (*Я. К.*)

3. Каго міліў, каго любіў, я сонейку прызнаюся. (*У. П.*)

4. І я малюся на балота, як на адвечныя агні, што цепляцца ў вачах народа і асвятляюць нашы дні... (*Шн.*)

5. Я заўсёды з вялікай ахвотаю ішоў на заняткі па вайсковай справе, якія праводзіў з вучнямі старэйшых класаў наш ваенрук. (*Дам.*)

**22.** ***Адзначце сказы з адасобленымі ўдакладняльнымі членамі.***

1. Цяпер зімою апошні прытулак афганца ўяўляў сабою белы сумёт. (*Федар.*)

2. Метраў за паўсотні ад Георгія стаяў Даніла Баханькоў. (*Лев.*)

3. Ёсць яшчэ і цяпер людзі, якія вераць, што мясцовыя балоты вельмі глыбокія амаль з недасягальным дном і што яны злучаюцца пад зямлёй з морам. (*Ул. Л.*)

4. Я пачаў прыглядацца і раптам заўважыў у разорцы, зарослай травой, вялікае з добрага катá зайчаня. (*В. Д.*)

5. Толькі ў парк не пускайце нікога нават самых блізкіх. (*У. К.*)

**23.** ***Адзначце сказы, у якіх зваротак аддзяляецца коскай або выдзяляецца коскамі.***

1. Заспявай мне песню, заспявай ты вецер, захвалюйся рэчка, зашумі трысцё! (*Я. Бобрык*)

2. Ганю касец пракос я за пракосам — шырока, вольна, на ўсю моц рукі. (*Я. Каршукоў*)

3. Табе, табе аддам труды о край мой наймілейшы! (*П. Калбыка*)

4. Франтавік услаўлены Еўропай прагнуў працаваць і жыць спакойна. (*Я. Каршукоў*)

5. Ах ты вішня мая ружовая, як магла ты ў золь расцвісці? (*С-к*)

**24.** ***Адзначце нумары сказаў: а) з параўнальнымі зваротамі; б) з дадзенымі параўнальнымі часткамі.***

1. Усяго ты баішся. Пражывеш трасучыся, як загнаны заяц. (*Казл.*)

2. Вось так і мы, як лістапад, згарым у справах і чаканні, як гэты лес, як гэты сад, пагаснем ціха на світанні. (*Л. Пранчак*)

3. Менш чым праз гадзіну шустры «Масквічок» ужо выбраўся з Мінска і паляцеў па шашы, курачы за сабою снежным пылам. (*Федар.*)

4. Рукі Янковіча памкнуліся да стала па нотны сшытак, і неўзабаве тут, як ластаўкі на правадах, размясціліся першыя ноты паэмы. (*В. Ж.*)

5. Яшчэ дзяўчынкай убачыла ў сне гэтую мужчынскую постаць, адкрыты твар з прыцягальнымі, як сіло для галоднай птушкі, зрэнкамі, глыбокім і чыстым, нібы крыніца ля каплічкі, поглядам. (*Казл.*)

**25.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць коскай.***

1. Поле спіць і заснулі туманы ў абдымках чужых халадоў. (*Ваб.*)

2. На вуліцы было цёмна але я добра бачыў брукаваную плошчу, востры шпіль касцёла, сляпыя вокны нізкіх хат. (*К-д*)

3. А нас балоты ратавалі і ў час вайны, і ў недарод і мы з балота паўставалі, — балотны, як трысцё, народ. (*Шн.*)

4. Дарэчы, піва раней лічылася абрадавым напоем і сакрэт яго прыгатавання быў вядомы толькі абраным асобам. (*«Маладосць»*)

5. Ад сталых заняткаў фізкультурай і спортам у Светы быў заўжды добры настрой і яна ніколі нічым не хварэла. (*М. Ю.*)

## Варыянт 2

**1.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць працяжнікам.***

1. У лебядзінай песні вера, якой не страціць, не скарыць. (*Гр.*) 2. Хацела б я верыць яшчэ не канец. (С. Явар) 3. Гаспадары пастараліся падстрэлілі дзвюх качак, утушылі іх з бульбаю, налавілі рыбы, згатавалі духмяную юшку. (*Лев.*) 4. Антабка гэта металічная дужка, за якую

мацуецца рэмень стрэльбы ці аўтамата. (*Лев.*) 5. Без буслоў вясна не вясна, а толькі адна назва. (*В-х*)

**2.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць коскай (коскамі) паміж аднароднымі азначэннямі.***

1. У сціплай непрыкметнай з выгляду хаціне быў масіўны стол з таўшчэзных бялюткіх бярозавых дошак. (*Лев.*) 2. Заўтра ж паеду ў наш цудоўны ціхі чысты сціплы гарадок. (*Г. Ч.*) 3. Процілеглы бераг быў ледзь бачнай тонкай сіняй палоскай лесу. (*З. Д.*) 4. Ля шырокіх акаваных меддзю створкавых дзвярэй застылі вартавыя ў бліскучых шлемах і латах, з дзідамі ў руках. (*Я. К.*) 5. На дварэ стаіць сухое спякотнае лета. (*В-х*)

**3.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць двукроп'ем.***

1. Усяслаў павёў дружыну да галоўнага селішча тубыльцаў разбіў лагер паблізу, выставіў дазоры. (*Я. К.*) 2. Міхасю ўсміхнулася фартуна кіраўнік дыпломнай працы прафесар Галіноўскі запрасіў яго ў дзённую аспірантуру. (*В*-х) 3. У тым найвялікшая мацярынская ахвяра не лічыцца ні з чым, ні з якой на свеце цаной у імя выратавання свайго дзіцяці. (*В-х*) 4. Галоўнае, што ад цябе патрабуецца высокі прафесіяналізм, поўная адданасць сваёй справе. (*В-х*) 5. Кім я толькі не набыўся за сваё жыццё будаўніком, і шафёрам, і майстрам па рамонту машын, і гандляром. (*Лоб.*)

**4.** ***Адзначце простыя сказы з недапасаванымі азначэннямі.***

1. Адзін з мужчын, невысокага росту, лысаваты, з разумнымі вачамі, жвавы, пачуў здалёк нашу размову і загаварыў на добрай рускай мове. (*Альш.*) 2. Вузкая, да смешнага маленькая ручка пані Антаніды кранула дзеда за локаць. (*У. К.*) 3. Пра сваё набліжэнне хрыплымі гудкамі ражкоў папярэджвалі паштовыя дыліжансы. (*Я. К.*) 4. У роспачы брат выкінуў вымененую мною калекцыю шэдэўраў у пясок на вуліцы. (*Альш.*) 5. Каля агню завіхаўся старæваты чалавек з шырокаю барадою. (*З. Д.*)

**5.** ***Адзначце сказы з адасобленымі азначэннямі (улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены).***

1. Даследчыкі схіляюцца да думкі што імператрыца Ірына была з роду хазараў. (*З. Д.*) 2. Мы беглі а здавалася луналі ў прасторы напоенай водарам свежых хваёвых стружак. (*Альш.*) 3. Па-маладому блішчэлі крыху злінялыя вочы акуратная шчотачка вусоў упрыгожвала твар. (*«Маладосць»*) 4. Шаша ляжала перад намі чыстая і белая. (*І. Пт.*) 5. Тут у лесе ізаляванаму ад вялікага свету адгароджанаму дрэвамі ад людзей нішто больш не зможа яму пагражаць. (*Федар.*)

**6.** ***Адзначце сказы з адасобленымі прыдаткамі (улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены).***

1. Пытанне пастаўленае перад кожным патрабавала адказу. (*У. К.*) 2. Алесь Клачкоў аўтар чатырох паэтычных зборнікаў прадставіў чытачам

паэму «Сказ пра зубра» дзе як і Мікола Гусоўскі апісвае прыгажосць нашай роднай Беларусі. (*«ЛіМ»*) 3. Пакутнікі самі з калыскі да скону бяздумна маліліся мы Фараону. (*Гр.*) 4. На пахавальным кастрышчы ён вярхоўны жрэц адчуваў што паліць разам з целам жанчыны і сваю ганьбу хавае яе ў нетрах памяці і часу. (*В. Іп.*) 5. Паэт Пятро Сяўрук быў кіраўніком Гродзенскай павятовай арганізацыі Таварыства беларускай школы. (*Дзел.*)

**7.** ***Адзначце сказы, у якіх ёсць недакладнасці ва ўжыванні злучка і двукосся.***

1. Найбольш удалымі ў зборніку Наталлі Русецкай «Два бяссонні» бачацца некалькі вершаў, сярод якіх «Два бяссонні», «Хто мяне шукаў — не знайшоў», «Вясна». (*«Маладосць»*) 2. Далей лірычны герой верша гаворыць, як ён будзе чакаць каля шашы спадарожны Ікарус. (*В. М.*) 3. Гэтая жанчына не нашага роду племені. (*З. Д.*) 4. Глеб знарок устаў завідна, падаўся па вясковай вуліцы гравійцы ў бок калгаснай канторы. (*Капыл.*) 5. На пляцы перад будынкам высілася аграмадная бронзавая скульптура дракона з пяці ці шасціметровым трызубцам. (*В-х*)

**8.** ***Адзначце сказы з адасобленымі акалічнасцямі (улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены).***

1. Адпрацаваўшы на адным з заводаў Нью-Ёрка восем гадоў бацька прыехаў на радзіму жонкі. (*В. Д.*) 2. Праз некалькі хвілін мужчына не спяшаючыся выйшаў з суседняга двара лёгка несучы сваё ўласнае вядро. (*Г. Ч.*) 3. Усяго Міхась дасягнуў сам дзякуючы ўласным здольнасцям ведам настойлівасці ў спраўджванні мары. (*В-х*) 4. Калодзежная вада як рукою зняла дарожную ўтому. (*Федар.*) 5. Паперы былі аформлены паводле ўсіх правілаў. (*Федар.*)

**9.** ***Адзначце сказы з адасобленымі дапаўненнямі (улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены).***

1. Але ж любога чалавека нават няўклюднага і слабога шкадаваць трэба. (*В-х*) 2. Вось ужо замест ста фланцаў выточваю сто дваццаць потым сто пяцьдзясят потым дзвесце…(*Г. Ч.*) 3. Алесь нічога не бачыў акрамя калон і неба. (*У. К.*) 4. Ноч пакінула замест яго постаці толькі цень узнесены ў неба. (*У. К.*) 5. Ля вогнішча акрамя дырэктара саўгаса і ляснічага быў і вёрткі сухарлявы нібы стручок гароху егер лясніцтва. (*Лев.*)

**10.** ***Адзначце сказы з прамымі дапаўненнямі.***

1. Пяклі хлеб самі, на подзе печы, падсцілаючы дубовае ці кляновае лісце. (*Сач.*) 2. Садзілі хлеб у печ на вельмі чыстай, пасыпанай мукой драўлянай лапаце. (*Сач.*) 3. Цёплы, толькі што спечаны хлеб абмывалі вадой, клалі на стол, акрывалі чыстым ручніком. (*Сач.*) 4. Папракнуць

кавалкам хлеба — самая жорсткая кара. (*Сач.*) 5. Эстэтыка і культура яды ў нашых продкаў была высокая. (*Сач.*)

**11.** ***Адзначце двухсастаўныя няпоўныя сказы.***

1. Як нам патрэбны адукаваныя людзі! (*У. К.*) 2. Не трэба свет прымаць адно як звацу. (*І. Катляроў*) 3. Каля куточкаў вачэй сетачка ледзь прыкметных зморшчын. (*К-д*) 4. Кінь наперад — знойдзеш ззаду. (*Прык.*) 5. Пачне з каменных пірамід і закончыць праектамі з жалезабетону. (*Р. Бар.*)

**12.** ***Адзначце сказы, у якіх набраныя курсівам словы выдзяляюцца дужкамі ці працяжнікамі (улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены).***

1. І гэтая заранка і безнадзейная глыбіня ракі і *галоўнае* словы песні раптоўна ўразілі яго [Алеся] вострай адпаведнасцю з тым што рабілася ў ягоным сэрцы. (*У. К.*) 2. Ля вогнішчаў *там відаць начавалі жнеі* гучаў ціхі смех. (*У. К.*) 3. *Як мы казалі ўжо* толькі за тыдзень перад славутай хакейнай баталіяй выпаў першы снег але які снег! (*Федар.*) 4. Большасць новых слоў ствараецца пісьменнікамі вучонымі журналістамі *напрыклад дакладна вызначана што такія вядомыя сёння ўсім словы як мілагучнасць мэтазгодны дабрабыт ажыццяўленне адлюстраваць увёў у беларускую літаратурную мову пісьменнік У. Дубоўка.* (*Энц.*) 5. З такою прыпіскаю *на яго думку* сімферопальскія чыноўнікі хутчэй будуць варушыцца. (*Федар.*)

**13.** ***Адзначце сказы, у якіх няправільна пастаўлены знакі прыпынку.***

1. Кажуць, характар перадаецца па спадчынных генах, ён можа праявіцца ва ўчынках і паводзінах чалавека, яго мове. (*Ул. Л.*) 2. Як быццам зранку пайшло на адлігу, а па абедзе разгулялася мяцеліца і добра такі ўдарыў мароз. (*В-х*) 3. І ў тое ж імгненне сэрца жанчыны ўзляцела кудысьці высока-высока: ля іхняй сядзібы стаяла машына, але сэрца, як узляцела, так і апусцілася, бо Вольга Пятроўна пазнала сваю машыну. (*Р. Бар.*) 4. Па-добраму ўражвае, што пражыўшы доўгае чалавечае жыццё, пісьменніца [Л. Арабей] захавала беззаганнасць душы і светлы розум. (*«ЛіМ»*) 5. Калі б надарыўся спадарожны вецер, па маіх разліках пад раніцу былі б на месцы. (*З. Д.*)

**14.** ***Адзначце, якія дадаaccount часткі адсутнічаюць у наступным складаным сказе.***

Калі б у яго быў талент і ён, Алесь, пісаў кнігу аб сярэднявеччы, ён не мог бы пакінуць без увагі ні варштатаў, на якіх ткаліся слуцкія паясы, ні тагачасных маслабойняў, ні таго, як і па якіх рэцэптах варылі тады піва, бо гэтага не бачыў ніхто, бо, як бы і што ні казалі, галоўным у эстафеце пакаленняў былі не турніры, не аксамітныя плашчы герольдаў, не мудрыя каралеўскія загады, а чалавек, які адліваў сталь для дзіды, ткаў аксаміты, вырабляў паперу, на якой пісаліся загады. (*У. К.*)

1) даданая акалічнасная часу;

2) даданая акалічнасная спосабу дзеяння і ступені;

3) дадэная акалічнасная ўмовы;

4) дадэная ўступальная;

5) дадэная выказнікавая.

**15.** ***Адзначце складаназалежныя сказы са змешаным (сузалежным і паслядоўным) падпарадкаваннем.***

1. На вуліцы вечар, і снег малады хавае дарогу і нашы сляды, каб мы не вярнуліся заўтра назад у чорны, нібыта звуглелы, наш сад, дзе птушак няма і не будзе вясной, дзе вецер, як воўк на сцяжыне лясной, завые і сціхне… (*Шн.*) 2. Сарандапіх толькі цяпер пачуў абрыдлае ціўканне нейкай птушкі, што хавалася ў галінах персікавага дрэва, заўважыў неба, спрэс зацягнутае хмарамі, адчуў, як забалелі плечы ад напружання, якое ён перажыў за гэты невялікі прамежак часу. (*З. Д.*) 3. У такіх умовах, у якіх ваяваў Дудзіч у пачатку вайны, мог выстаяць той, хто меў моцны хрыбет і цвёрдую перакананасць, што захопніка трэба выгнаць са сваёй зямлі, як бы далёка ён ні прайшоў. (*Дам.*) 4. І толькі жывучы ў Мінску, я даведаўся, што я браў грыбы ў помніку прыроды, хадзіў праз Шоўкаўскую дуброву, якая ахоўваецца дзяржавай і дзе кожны дуб мае свой уласны нумар. (*Ул. Л.*) 5. А мне ўсё-такі хочацца верыць, што людзі мелі мянушку Чысты за тое, што жылі маральна бездакорна, сумленна, без брудных думак і дзеянняў. (*Ул. Л.*)

**16.** ***Вызначце тып памылкі, дапушчанай у сказе.***

Глебу падабалася і як Ліза смяялася — ціхенька, быццам квола, але шчыра, весела, як яна хадзіла — не хадзіла, а лётала, як яна, за што б не ўзялася, рабіла — вязала, лупіла бульбу, мыла посуд, прыбірала ў хаце… (*Сач.*)

1) пунктуацыйная;

2) арфаграфічная;

3) граматычная;

4) лексічная.

**17.** ***Адзначце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі.***

1. Клён маўклівы зіму прадчувае, ападаюць паволі лісты, і салоўка даўно не спявае, і туман разаслаўся густы. (*Ваб.*)

2. У першы дзень прыезду ў Егіпет мяне моцна ўсхвалявала пачуццё, якое раптам узнікла з глыбіні падсвядомасці і падступіла да сэрца: здавалася, піраміды сведчаць, што мой шлях на зямлі вымяраецца стагоддзямі. (*Альш.*)

3. Раней, калі Палессе было адной суцэльнай пушчаю, русалкі скрозь бадзяліся па ўзлесках, гушкаліся на маладых бярозах, уплішчваліся ў карагоды купальскай ноччу, стараючыся зацягнуць у лес якога-небудзь хлопца. (*К-д*)

4. Хлопец крута змяніў сваё жыццё: замест весялосці і танцаў браў сабаку і ішоў з ім у палі, блукаў там, поўны меланхоліі, вёў размовы



Рэпазіторый БДПУ

з сабакам, чытаў сентыментальныя раманы, якія яму зусім не падабаліся. (*У. К.*)

5. Станавілася дзіця на ногі, пачынала хадзіць — і бацькі адразу ж імкнуліся рабіць усё магчымае, каб не дармаедам, гультаём яно расло, а карысным, патрэбным чалавекам, такім жа сем'янінам, як і ўсе. (*Сач.*)

**18.** ***Адзначце сказы з граматычна-стылістычнымі ці лексічнымі памылкамі.***

1. Здавён з усіх грахоў самым страшным, недаравальным было вось гэтае — здрада сваім багам. (*В. Іп.*)

2. Пад столікамі нецярпліва сядзелі тры вялікія сабакі, памахваючы хвастамі і чакаючы, калі хто з гасцей кіне костку ці які агрызак. (*З. Д.*)

3. Былі там яшчэ двое мужчын з высокімі, як у жанчын, галасамі. (*З. Д.*)

4. Нямала хлопцаў нашай школы потым сталі афіцэрамі, звязалі сваё жыццё з войскам. (*Дам.*)

5. Па тварах Радаслава і ведуна было відаць, што яны засталіся не задаволеныя адно адным. (*З. Д.*)

**19.** ***Адзначце схему, якая адпавядае пастаноўцы знакаў прыпынку ў наступным сказе.***

Нікуды я не паеду разважае Антон буду сядзець на беразе Вітольда Каятанавіча ды пісаць без спешкі (*Карам.*)

1. «П! — а: — П».
2. «П? — а: — П».
3. «П, — а: — П».
4. «П? — а. — П».
5. «П, — а. — П».

**20.** ***Адзначце сказы, у якіх чужая мова аформлена правільна.***

1. – Вас, напэўна, цікавіць, дзе вы апынуліся і што вас чакае. Ці не так? — запытаўся мужчына і па-дзелавому пачаў гаворку: — Лічыце, вам здорава пашэнціла. Вас заўважылі і як належыць ацанілі. (*В-х*)

2. Проста, прыгожа і яскрава перадаецца стома маладога чалавека ў вершы Віктара Шніпа:

Я помню смак той першай стомы.
Ішоў дадому, як па кладцы,
Але ўжо зведаў падсвядома,
Што не пражыць і дня без працы. (*«Маладосць»*)

3. – Трэба ляцець да сузор'я Дзевы, — сказаў доктар і праз невялікую паўзу запытаўся:

– Як ты думаеш, мне адмовяць, калі я папрашуся ў гэтае падарожжа? (*Р. Бар.*)

4. Янка Брыль пісаў пра Яна Скрыгана, што: «гэта быў светлы, таленавіты, амаль па-дзіцячы вясёлы чалавек...».

5. І калі «голас пад парасонам пра час запытае сонна», лірычны герой верша А. Пісьмянкова адкажа: «Я замест лічбы восем выдыхну ціха: «Восень...» (*В. М.*)

**21.** ***Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх даданая частка злучана з галоўнай пры дапамозе падпарадкавальнага злучніка.***

1. Паданне ёсць, што пакідае парк яна перад нядобраю падзеяй. (*Індз.*)

2. Ферма, дзе жылі яны, вывезеныя з розных мясцін нявольнікі, была невялікая. (*Сач.*)

3. У Цылеі, сталіцы графства, на невысокай гары стаяў замак, дзе жыла ціхая і сціплая сіротка Ганна Цылейская — унучка Казіміра Вялікага. (*Сіп.*)

4. Колішні хатыніцкі гарманіст нібы чакаў імгнення, каб усёй душой аддацца спевам. (*Лев.*)

5. Усе, хто праходзіў побач, не ўзнімалі на яго вачэй. (*Г. Ч.*)

**22.** ***Адзначце сказы з адасобленымі ўдакладняльнымі членамі.***

1. Зусім побач каля самай леснічоўкі на белым цаліку адбіваўся ланцужок лісіных слядоў. (*Федар.*)

2. У зямлі менавіта ў гэтым унікальным гістарычным музеі вучоныя робяць свае адкрыцці, набліжаюць нас да разумення продкаў, іх побыту. (*Ул. Л.*)

3. І дзе-небудзь у полі ці на балоце, у лесе не вытрымаеш, спынішся, залюбуешся, замрэш: Божа, якая прыгажосць навокал! (*Сач.*)

4. Служыў Аркадзя пасля вайны ў Германіі ў нашай зоне. (*І. Пт.*)

5. Дапамагала Аліне гатаваць ежу зграбненькая студэнтачка з доўгай амаль што не да пят русай касой. (*Лоб.*)

**23.** ***Адзначце сказы, у якіх зваротак аддзяляецца коскай або выдзяляецца коскамі.***

1. Ах вы лебедзі, птахі божыя грацыёзнасцю так прыгожыя! (*В. Ж.*)

2. Няма вас родных нам такіх, пашлі з жыцця вы назаўсёды. (*Я. Каршукоў*)

3. Ах ты пявуння мая галасістая, згадваю часта я спевы твае. (*В. Ж.*)

4. Не хадзі каток па хаце, не будзі майго дзіцяці. (*Нар.*)

5. Хлеб пагаджуся я есці жабрачы, толькі цябе каб каханы мой бачыць. (*Радз.*)

**24.** ***Адзначце нумары сказаў: а) з параўнальнымі зваротамі; б) з даданымі параўнальнымі часткамі.***

1. Несусветная горкая крыўда, як паводка, затапляла яго душу. (*В-х*)

2. Кублы і дзежкі паашпарвала як след, чысцютка вымыла. (*В-х*)

3. Толя ў аўтабазе ўжо другі тыдзень як слясарыць. (*В-х*)

4. У чарнільным адвечным змроку над густой, як дзёгаць, вадой круцілася ў выбухах нястрымнага, як навальніца, рогату ладдзя Роспачы. (*У. К.*)

5. Неадольна, як цемры цемраў, як крыжацкае мора на тры сотні вояў князя Давіда, як асманы на Косавым полі, як рыцары на Белай Гары, рухаліся воі смерці. (*У. К.*)

**25.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць коскай.***

1. Зірне сваімі бяздоннымі вачыма і я ўжо ў палоне. (*Казл.*)
2. На дварэ з-за канторы разанула па твары халодная чырвоная зара і аглушылі мужчынскія галасы. (*І. Пт.*)
3. Аб чым вочы сведчылі і што яны ўтойвалі? (*Т. Бесараб*)
4. Пасля двара, залітага сонцам, у каморы здалося вельмі цёмна аднак святло прасочвалася праз шчыліны паміж рассохлымі дошкамі дзвярэй. (*З. Д.*)
5. Над белаю юртаю ззяла золатам сонца і сінела неба. (*З. Д.*)

## Варыянт 3

### Тэст А

**А1.** ***Адзначце словы з выбухным [г]:***

1) гучны; 2) гонар; 3) гільза; 4) мазгі; 5) дарога.

**А2.** ***Адзначце словы, у якіх адсутнічаюць санорныя гукі:***

1) уцёкі;
2) вуглярод;
3) дзівацкі;
4) факультэцкі;
5) шэсце.

**А3.** ***Адзначце словы з націскным трэцім складам:***

1) дзявяцера;
2) адлежаць;
3) адзінаццаць;
4) грамадзянін;
5) хрысціянін.

**А4.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара а:***

1) ас...нсаваць;
2) р...пертуар;
3) аранж...рэя;
4) эш...лон;
5) ж...лацін.

**А5.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара е:***

1) куп...;
2) сер...нада;
3) вызв...рыцца;
4) гал...чнік;
5) се...нец.

**А6.** ***Адзначце словы з няправільным напісаннем:***

1) жытон;
2) лодар;
3) плаўчыха;
4) галантарэя;
5) калчадан.

**А7.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара а:***

1) к...накрад;
4) м...тадром;

2) р...знагалоссе; 5) ф...тагенічны.
3) д...браякасны;

**А8.** ***Адзначце словы з прапушчанай літарай я:***

1) сярэдн...сутачны; 4) зерн...склад;
2) земл...робства; 5) верхн...сілезскі.
3) зерн...фураж;

**А9.** ***Адзначце слова з прапушчанай літарай ў:***

1) ра...нд; 4) шэдэ...р;
2) кла...нада; 5) ра...т.
3) шлагба...м;

**А10.** ***Адзначце словы з прапушчанай літарай:***

1) бязвыез…на; 4) аб'ез…чык;
2) капус…ны; 5) наез…нік.
3) кантрас…ны;

**А11.** ***Адзначце словы, якія пішуцца з малой літары:***

1) (Г, г)арадоцкі раён;
2) казка пра (П, п)апялушку;
3) (Б, б)еларускі фальклор;
4) (К, к)упалавы паэмы;
5) (Д, д)ацкі прынц Гамлет.

**А12.** ***Адзначце сінанімічныя рады:***

1) статак, чарада, зграя;
2) станок, стойла, варштат;
3) стрэльба, ружжо, фузія;
4) цемра, змрок, прыцемкі;
5) чарка, кілішак, кубак.

**А13.** ***Адзначце назоўнікі з канчаткамі -а(-я):***

1) вытворчасць (абутак); 4) праца (сталявар);
2) гальштук з (шоўк); 5) залежыць ад (дзейнік).
3) гусі ляцяць з (поўдзень);

**А14.** ***Адзначце назоўнікі, у якіх у месным склоне назіраецца чаргаванне зычных:***

1) гадзіннік; 4) гумарэска;
2) падлога; 5) тварог.
3) смуга;

**А15.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара ь:***

1) пic…меннік; 2) кан…юнктура;
3) п…едэстал; 4) парц…е;
5) круп…е.

**А16.** ***Адзначце назоўнікі, якія маюць форму адзіночнага ліку:***

1) акуляры; 4) пярэбары;
2) весніцы; 5) бярвёны.
3) апілкі;

**А17.** ***Адзначце словазлучэнні з адноснымі прыметнікамі:***

1) ціхі завулак; 4) залаты лістапад;
2) зайцаў хвост; 5) бронзавы манумент.
3) сярэбраны ланцужок;

**А18.** ***Адзначце словы, якія пішуцца разам:***

1) борт…праваднік; 4) ват…секунда;
2) генерал…лейтэнант; 5) паў…яблыка.
3) контр…аргумент;

**А19.** ***Адзначце словазлучэнні, у якіх дапушчаны памылкі ў дапасаванні да роду назоўнікаў:***

1) неаглядны шыр; 4) белае кураня;
2) з малым задавакай Грышам; 5) зялёнае чарніла.
3) вопытным калегай Іванам;

**А20.** ***Адзначце прыклады, у якіх лічэбнікі ўжыты няправільна:***

1) адзінаццаты дзень; 4) чатыры сёмых цэнтнера;
2) абедзвюмя сёстрамі; 5) трыма жарабятамі.
3) паўтары стагоддзя;

**А21.** ***Ад прапанаваных дзеясловаў закончанага трывання ўтварыце формы незакончанага трывання. Адзначце тыя, якія ўжываюцца з суфіксамі** -ыва- (-іва-)**:***

1) ацаніць; 4) выбеліць;
2) вылавіць; 5) зачарніць.
3) адмарозіць;

**А22.** ***Адзначце сказы, у якіх дзеепрыметнікі ўтвораны і ўжыты правільна:***

1. Вецер сее пялёсткі ўжо адцвітаючай чаромухі, з гудам разгойдваюць белыя і ружовыя суквецці пчолы. (*Кам.*)

2. Алёна, асветленая вечаровым сонцам, сядзіць з яблыкам у руках пад яблыняй. (*Ул. Сц.*)

3. Не мог я бачыць гэтага самаўлюбёнага генія, паблажліва пахлопваючага мяне па плячы. (*Гап.*)

4. Надзя азірнулася на сядзеўшага моўчкі за сталом Сямёна. (*Гап.*)

5. Хутка пастухі адчулі, што такое помста раздражнёнай дрыяды. (*Васюч.*)

**А23.** ***Адзначце словазлучэнні з прыслоўямі, якія пішуцца разам:***

1) дамовіліся (з)вечара; 4) пазычыў (на)павер;

2) снуе (з)ранку (да)вечара;
3) падскочыў (у)момант;
5) вярнуўся (пад)вечар.

**А24.** ***Адзначце словазлучэнні, у якіх часціца (прыстаўка)*** *не* ***пішацца разам:***

1) нікому (не)вядомы;
2) (не)глыбокая, але бурная рака;
3) сядзіць (не)высока;
4) (не)пераможны народ;
5) дрэвы (не)пасаджаны.

**А25.** ***Адзначце сказы, дзе часціца*** *ні* ***на месцы пропускаў пішацца асобна:***

1. Як н… намагаўся Глеб, а вызваліцца з братавых абдымкаў н…як не мог. (*Я. К.*)
2. Аказалася, н…меншую ўладу, чым князь, мела і гарадское веча. (*Я. К.*)
3. Каб прадухіліць новыя закалоты, Усяслаў на Святым Крыжы пакляўся палачанам, што без згоды веча н…заключыць н… з кім хаўрус, н…аб’явіць н…кому вайны, н…парушыць н…колі гарадскіх звычаяў і парадкаў. (*Я. К.*)
4. Н…з чым вярнуліся на Язавец Люся з Шурай. (*Бут.*)
5. Н…расчаравання, н…крыўды на жанчын не было. (*І. Пт.*)

**А26.** ***Адзначце сказы, у якіх неабходна паставіць працяжнік:***

1. Талент з’ява рэдкая і індывідуальная, унікальная. (*Сач.*)
2. Сінтаксіс і пунктуацыя ахілесава пята абітурыентаў. (*В-х*)
3. Я меў запаветную мару знайсці дзедавы ўзнагароды. (*Ул. Сц.*)
4. Музей-парк валуноў ва Уруччы быў спланаваны на мясцовасці як карта Беларусі. (*Сіп.*)
5. Уласна перажытае, убачанае, пачутае, прааналізаванае ўсё гэта з’яўляецца мастацкай закваскай, дражджамі літаратурнай творчасці пісьменніцы Лідзіі Арабей. (*«ЛіМ»*)

**А27.** ***Адзначце простыя сказы, у якіх прапушчана коска пры аднародных членах:***

1. Сонцам каціўся той год ззяў у душы Радуні, саграваў каханнем, вёў, клікаў і раптам так нечакана і горка абарваўся. (*З. Д.*)
2. У кожнага з маіх родных было асабістае, адметнае жыццё. (*Лоб.*)
3. Пілы бразгалі і звінелі стальным вострым звонам. (*І. Пт.*)
4. Таямнічыя чорныя вочы поўніліся, як калодзеж, цёмнай люстраной вадою, выдавалі балючы смутак. (*В-х*)
5. Іван уздыхнуў, тужэй загарнуў на грудзях і каленях крыссе прапаленага пасечанага асколкамі і станчэлага за гады шыняля, заплюшчыў вочы. (*Бут.*)

**А28.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць двукроп’ем:***

1. Міхась добра ведае дзівосаў не бывае, усё складваецца ў загадзя вызначаным парадку. (*В-х*)

2. Дар інтуіцыі адзін з галоўных складнікаў паэтычнага таленту. (*«ЛіМ»*)

3. Прыходзяць паломнікі я мушу іх пакарміць. (*З. Д.*)

4. Веліч Сафійскага сабора, задуменнасць Дзвіны, музыка і сонца ўсё гэта сфарміравала душэўныя памкненні юнай Нялюбы, адной з гераінь рамана Таісы Бондар «Мечаная». (*«Маладосць»*)

5. Запіска расшыфроўвалася праз алфавіт лічбы трэба было перавесці ў літары. (*Федар.*)

**А29.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць коскай (коскамі):***

1. Над Бесяддзю клубіўся рэдкі белы нібы касмылі ваты туманок. (*Лев.*)

2. Я гатовы прыняць яго як дарагога госця. (*З. Д.*)

3. А быў тады цудоўны, звонкі май, такі ж як зараз варты захаплення. (*М. Бабіч*)

4. Язык у Максіма як мянташка. (*Лоб.*)

5. Я быў самотны як дарога, што на чужыну пралягла. (*Шн.*)

**А30.** ***Адзначце сказы з памылковым ужываннем дзеепрыслоўяў:***

1. Чытаючы раман, увесь час не пакідала спадзяванне, што вобразы маладых таленавітых літаратараў Трухана і Ведрыча стануць «сапраўдным дасягненнем» празаіка А. Федарэнкі. (*Запр.*)

2. Лясы выхадзіў, вытаптаў, пасвячы ў дзяцінстве кароў, збіраючы грыбы ды ягады. (*Ул. Л.*)

3. Праз дзён колькі картаплянік касіць буду, а там, крыху счакаўшы, і картоплю капаць трэба. (*В-х*)

4. Уначы, пралятаючы над хатай, чуецца крык пералётных птушак.

5. Перачытваючы яго вершы, мне яскрава ўяўляецца вобраз паэта. (*Кам.*)

**А31.** ***Адзначце сказы, у якіх набраныя курсівам словы выдзяляюцца працяжнікамі ці дужкамі:***

1. Раённую газету стары згарнуў і запхнуў за халяву бота *пачытае ўжо дома пры газоўцы, начапіўшы на нос акуляры*, а вось што да лістоў, дык не выцерпеў, падаў іх дрыготкай рукой Сцяпану і прамовіў:

– Зірні, ад Адама? (*Дал.*)

2. Даўней самі бацькі часам знарок абзывалі сваіх добрых, здаровых, прыгожых дзяцей імёнамі, якія *паводле іх веравання* аберагалі малых ад чараў, хвароб, напасцяў. (*Ул. Л.*)

3. Яшчэ з часоў славутага Усяслава Чарадзея існаваў такі звычай: пасля нападу на паселішча ўсе мужчыны, што маглі трымаць зброю, пешкі ці конна даганялі ворага, каб вызваліць палонных і паквітацца за забітых *гэты народны звычай называўся Пагоняй; у Вялікім княстве Літоўскім ён стаў законам.* (*У. А.*)

4. Тая настаўніца, якая сядзела крайняй ля Міцкевіча і хацела яму закрыць рукой рот *я ўжо здагадаўся, што гэта Вольга Антонаўна Прачук, настаўніца матэматыкі,* выходзіла апошняй. (*І. Пт.*)

5. Каб Алена папрасіла зорку з неба, Аляксандр *напэўна* дастаў бы і яе. (*К-д*).

**А32.** ***Адзначце сказы, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку:***

1. У куфэрку Касцюшка вёз няшмат рэчаў: кніжкі, бялізну, грошы, пасведчанне аб чыне генерал-маёра амерыканскай арміі, ордэн Цынцыната і футарал з пісталетамі. (*Я. К.*)

2. Аднак закончылася Вялікая Айчынная вайна, як след запрацавалі пошта і адрасны стол, а пра мужаў лёс па-ранейшаму не было ані гуку. (*М. Ю.*)

3. Канстанцін прайшоў па персідскіх дыванах, прылёг на канапу, аздобленую разьбою з выявай паваў, кажуць, гэтыя птушкі здатныя прыносіць шчасце. (*З. Д.*)

4. Хлопцу стала прыкра за сваю дурную пахвальбу і ён пагнаў каня моцным галопам, дружыннікі паляцелі следам. (*З. Д.*)

5. Малы з трывогай паглядаў на дзверы, каб хаця яны не рыпнулі і на парозе не з’явіўся Шура. (*В-х*)

## Тэст В

**В1.** ***Вызначце суадносіны паміж стылямі і жанрамі мовы:***

| | |
|---|---|
| А. Навуковы. | 1. Пратакол. |
| Б. Мастацкі. | 2. Анатацыя. |
| В. Афіцыйна-дзелавы. | 3. Выступленне на мітынгу. |
| Г. Публіцыстычны. | 4. Навела. |
| | 5. Гутарка. |

**В2.** ***Вызначце суадносіны паміж сказамі і адасобленымі членамі ў іх (улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены):***

| | |
|---|---|
| А. Думаў пра падзеі ў Маскве і Бравусаў рытмічна махаючы касою. (*Леў.*) | 1. Адасобленае дапаўненне. |
| Б. Ярка-ружовае сонца падобнае на апельсін нізка вісела над лесам. (*Леў.*) | 2. Адасобленае азначэнне. |
| В. Першую ноч Касцюшка правёў у Трэнтане гарадку галандскіх перасяленцаў на беразе Дэлавара. (*Я. К.*) | 3. Адасобленая акалічнасць. |
| | 4. Адасоблены прыдатак. |
| | 5. Адасоблены |



репозиторий БГМУ

| | |
|---|---|
| Г. Я нікога апрача цябе тут не люблю. (*З. Д.*) | ўдакладняльны член сказа. |

**В3.** ***Вызначце суадносіны паміж выдзеленымі ў сказах словамі і іх сінтаксічнай роляй:***

| | |
|---|---|
| А. Уражаныя адвагай **галоўнакамандуючага**, жаўнеры рынулі ў штыкавую. (*Я. К.*)<br>Б. Хлопец правёў тонкую дзявочую **постаць** позіркам, поўным любасці і пяшчоты. (*З. Д.*)<br>В. Вадзім адразу пазнаў Сымона Чыжа — **настаўніка** біялогіі мясцовай школы. (*В-х*)<br>Г. Гэты чалавек з лісіным вострым тварыкам і глыбока запалымі вачыма даўно зрабіўся верным **збраяносцам** Душэўскага. (*В-х*) | 1. Выказнік.<br>2. Азначэнне.<br>3. Дапаўненне.<br>4. З'яўляецца часткай састаўнога іменнага выказніка.<br>5. Прыдатак. |

**В4.** ***Вызначце суадносіны паміж выдзеленымі ў сказах словамі і іх часцінамоўнай прыналежнасцю:***

| | |
|---|---|
| А. І надзіва ясны ён і цёплы, **гэты** майскі стогалосы дзень. (*Мятл.*)<br>Б. **Часам** з'яўляўся ў снах бацька, маўклівы і засяроджаны. (*З. Д.*)<br>В. **Пасярод** паляны ўздымаўся магутны дуб — абаронца велясітаў. (*З. Д.*)<br>Г. Дачка ўзлезла-**такі** на стол і дастала з аздобы ручнікоў прыгожую ікону. (*Гаўр.*) | 1. Прыметнік.<br>2. Займеннік.<br>3. Часціца.<br>4. Прыслоўе.<br>5. Прыназоўнік. |

**Тэкст да заданняў В5–В8**

1. Прыснілася ў Боне, што мае Шоўкавічы — пупавіна Еўропы. 2. Прачнуўся з такім адкрыццём «Амерыкі», і паляцелі думкі ў вёсачку, дзе спазнаваў для сябе вялікі свет. 3. Наша хата чапурылася якраз жа пасярод вёскі, дзелячы яе на Камзэтаўку і Мацярык. 4. Дык што атрымліваецца? 5. Цэнтр Еўропы пралягае па тым месцы, дзе была наша сядзіба. 6. Вунь чаму насупраць нашага поплаву геолагі некалі закапалі нейкі рэпер з палкай-вытыркачкай над зямлёй. 7. А можа, не проста так вырас на нашым агародзе дуб-волат? 8. Мо гэта прыродная антэна пасылала ў высокі космас сігналы чалавечай надзеі? 9. Слухайце, над нашымі Шоўкавічамі ў поўдзень затрымліваецца само сонца і доўга-доўга стаіць над хатамі і агародамі. 10. Цяпер толькі здагадаўся, што нябеснае свяціла звярае над маёй вёскай свой компас. 11. Паверце, якраз жа над дахам бацькавай хаты сярод зорнага дывана пралягаў Млечны Шлях. 12. А за нашым прыгуменнем, у кашлатым лазняку, цёхкалі самыя галасістыя салаўі. 13. Іх было болей, чым музыкаў у фінбергаўскім аркестры. 14. Калі вам мала гэтых доказаў, дык ведайце: недалёка ад нашай хаты пачыналася

высыпаная жоўтым пяском вулачка, якая за алешнікам нырала ў гонкі дубняк. 15. **Тры кіламетры** дарога віляла паміж векавых дубоў і выводзіла ў доўгую вёску Вузнаж, у якой былі школа, магазін, пошта. 16. А за ёй пачыналіся новыя дарогі, якія выпрасталіся ажно ў самую Рэчыцу, у наш райцэнтр, сталіцу нафты. 17. Калі ж ад вулачкі ўзяцца крыху правей, то праз Восаў, Заходы, Залатуху трапіце ў Васілевічы, якія былі некалі то вотчынай княгіні Вольгі, то райцэнтрам, то месцам тарфяных радовішчаў. 18. За Васілевічамі — Глінная Слабада, а там і рукой падаць да сталіцы беларускага гумару Аўцюкоў.

**В5.** ***Прачытайце тэкст і вызначце, якія з пералічаных ніжэй падтэм знайшлі адлюстраванне ў тэксце:***

1. Гісторыя, якая мне прыснілася.
2. Мая родная вёска — цэнтр Еўропы.
3. Паходжанне вёскі Шоўкавічы.
4. Як даехаць з Шоўкавіч да сталіцы.
5. Наша вясковая вулачка — дарога ў вялікі свет.

**В6.** ***Вызначыць стыль і тып тэксту.***

**В7.** ***Вызначце, колькі ў тэксце складаназалежных сказаў з дададнай азначальнай часткай. Пастаўце адпаведную лічбу.***

**В8.** ***Вызначце від сувязі, якім звязаны выдзеленыя ў 15-м сказе словы.***

## Варыянт 4

### Тэст А

**А1.** ***Адзначце словы, вымаўленне якіх не супадае з напісаннем:***

1) пранікнёны;
2) пранізлівы;
3) снедаць;
4) вучэнне;
5) наперад.

**А2.** ***Адзначце словы, у якіх колькасць літар і гукаў супадае:***

1) абвяшчэнне;
2) ваенгандаль;
3) забіяка;
4) параіць;
5) іміграNT.

**А3.** ***Адзначце словы з націскным першым складам:***

1) блíснуць;
2) загнаны;
3) засланка;
4) дзядзькі;
5) гліняны.

**А4.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара ы:***

1) бр...зент;
2) р...торта;
3) ц...гельня;
4) поч...рк;
5) др...вотня.

**А5.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара*** *я:*

1) кал...ндары; 4) м...ніск;
2) Бес...дзь; 5) м...нташка.
3) купл...тыст;

**А6.** ***Адзначце слова з няправільным напісаннем:***

1) снегавік; 4) цямнейшы;
2) мядзведзяня; 5) метрапалітэн.
3) васямнаццаць;

**А7.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара*** *о:*

1) р...бататэхніка; 4) р...знакаліберны;
2) р...знастайны; 5) ч...рнаскуры.
3) аз...тнакіслы;

**А8.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара*** *е:*

1) сярэдн...ўзроставы; 4) земл...ўладальнік;
2) вол...выяўленне; 5) земл...знаўства.
3) граз...лячэбніца;

**А9.** ***Адзначце словы з прапушчанай літарай*** *у:*

1) За...ралле; 4) на...барці;
2) кля...за; 5) падараваў ...нуку.
3) ранго...т;

**А10.** ***Адзначце словы з прапушчанай літарай*** *ш:*

1) ро...чына (хлебная); 4) дзе...ка;
2) разно...чык; 5) рас...чапіць (палена).
3) пя...чаны;

**А11.** ***Адзначце словы, якія пішуцца з малой літары:***

1) (Д, д)ошка гонару;
2) (Д, д)алёкі Усход;
3) (Н, н)ародны паэт;
4) (Е, е)ўрапейскія сталіцы;
5) (Б, б)арысаўскія ўстановы.

**А12.** ***Адзначце сінанімічныя рады:***

1) завіруха, завея, замець;
2) малебен, імша, вячэрня;
3) пунктуальнасць, дакладнасць, канкрэтнасць;
4) спрыяльны, дабратворны, дабрачынны;
5) бадзёрасць, жыццярадаснасць, мажорны.

**А13.** ***Адзначце назоўнікі з канчаткамі*** ***-у (-ю):***

1) плошча (квадрат);



Репозиторий БГМУ

2) пачырванець ад (камплімент);
3) шклянка (кампот);
4) рух (астэроід);
5) таблетка (валідол).

**А14.** ***Адзначце назоўнікі, у якіх у месным склоне назіраецца чаргаванне зычных:***
1) веранда; 2) аптэка; 3) водгук; 4) Нарач; 5) Мазыр.

**А15.** ***Азначце словы з прапушчаным апострафам:***
1) мадз...яр; 4) двух...павярховы;
2) інтэр...ер; 5) аб...інець.
3) В...етнам;

**А16.** ***Адзначце назоўнікі, якія маюць форму множнага ліку:***
1) студэнцтва; 4) кісларод;
2) кіслата; 5) атрад.
3) кансалідацыя;

**А17.** ***Адзначце прыметнікі, ад якіх утвараюцца ступені параўнання:***
1) мудры; 2) глухі; 3) пярэсты; 4) здаровы; 5) вандроўны.

**А18.** ***Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок:***
1) выстава...продаж;
2) стале...ліцейны;
3) вечна...жывы;
4) яхт...клуб;
5) ярка...асветлены.

**А19.** ***Адзначце правільна напісаныя словы:***
1) адзяленне; 4) панна Ядзвіга;
2) заіскрыцца; 5) помслівы.
3) блакіт льну;

**А20.** ***Адзначце сказы, у якіх ёсць памылкі ва ўжыванні і напісанні займеннікаў:***
1. Колькі часу я ў сябе гэтую страшную таямніцу нашу. (*Гап.*)
2. Усе свае подзвігі я павінен здзяйсняць сам. (*Васюч.*)
3. Як дараваць сябе за тую і сённяшнюю баязлівасць. (*Гап.*)
4. Хіба ў гэтай зацішнай краіне штосьці можа пагражаць чалавеку? (*Васюч.*)
5. Пабудавала школу князіня Ірына Паскевіч на сваі ўласныя сродкі. (*М. Шамякін*)

**А21.** ***Адзначце сказы, у якіх усе дзеясловы закончанага трывання:***

Репозиторий БГМУ

1. Для многіх свядомых беларусаў творчасць Ф. Багушэвіча стала пуцяводнай зоркай, заклікам шанаваць і берагчы сваю мову, свае карані. (*«ЛіМ»*)

2. Вялікія воды не могуць любоў патушыць, і рэкі яе не затопяць. (*Біблія, пер. В. Семухі*)

3. Першым пра набліжэнне вясны абвясціў сваёй жвавай гаворкай ручай, які неспадзявана абудзіўся сярод снежных палеткаў. (*Я. К.*)

4. Выглядваў ліпень, як цыган вясёлы, са стромы коней збеглых — за Дняпром схаваліся ў лугах, далей ад сёлаў з іх плугам, бараной і бізуном. (*В. Яр.*)

5. А гляне з кручы жнівень у турботах — разгледзіць белай масці, вараной уцекачоў і зловіць для работы — зноў з плугам сябраваць і бараной. (*В. Яр.*)

**А22.** ***Адзначце словазлучэнні, у якіх дзеепрыметнікі ўтвораны і напісаны правільна:***

1) адслужыўшая лодка;
2) схаваная вяровачка;
3) задаволенны бацька;
4) парваная калашына;
5) раскладзены агонь.

**А23.** ***Адзначце словазлучэнні з прыслоўямі, якія пішуцца праз дэфіс:***

1) прачнуўся сама...хоць;
2) падыходзіла раз...пораз;
3) спаў двое сутак за...пар;
4) павадзіў галавою сюды...туды;
5) глядзеў некуды ў...далеч.

**А24.** ***Адзначце сказы, у якіх часціца*** *не* ***на месцы ўсіх пропускаў пішацца асобна:***

1. Настаўніца хіміі ледзь н... умлела, але потым што было — н... пераказаць. (*В-х*)

2. Базіліса н...аклікнула Канстанціна, н...памкнулася дапамагчы. (*З. Д.*)

3. Хай н... адразу, а н...дзе на палавіне ўрока Валіку самым н...верагодным чынам перадаліся сябравы думкі. (*Федар.*)

4. Н...пытаюся, куды вядзе дарога, калі ёсць, дык н...куды вядзе. (*Гр.*)

5. Замак за гэтыя гады стаў ужо суровым, н...прыветным, н...падступным, але гараджане ганарыліся ім, і месца на пасадзе ля замка стала каштаваць н...вымерна дорага. (*В. Іп.*)

**А25.** ***Адзначце сказы, дзе часціца*** *ні* ***пішацца асобна:***

1. Стаю і варухнуцца н...магу, рукі і ногі як н...свае парабіліся. (*В-х*)

2. Антаніна Паўлаўна н...вачам, н...вушам веры даць не магла. (*В-х*)

3. Ён назіраў за дзяўчынкай ледзь н...са страхам. (*Федар.*)

4. Сапраўды, Віка адчула, што пагрозы ад хлопцаў ёй чакаць н...варта. (*Федар.*)

5. Н...з песняю, н...з казкаю чароўнай жыцця не параўнаю прыгажосць. (*В. Ж.*)

**А26.** ***Адзначце словы з няправільна вызначаным лексічным значэннем:***

1. Дыялектыка — філасофскае вучэнне аб усеагульных законах руху і развіцця прыроды, чалавечага грамадства і мыслення.
2. Дыяганаль — шчыльная баваўняная або шарсцяная тканіна з косымі рубчыкамі.
3. Амартызацыя — паступовае зніжэнне вартасці машын, абсталявання, збудаванняў з прычыны іх зношвання.
4. Альвас — саюз, аб'яднанне на аснове дагаворных абавязацельстваў.
5. Анапест — трохскладовая вершаваная стапа з націскам на першым складзе.

**А27.** ***Адзначце словы, будова якіх адпавядае схеме:*** *прыстаўка + корань + суфікс + канчатак**:***

1) адкашліванне;
2) дакручванне;
3) зачырванець;
4) разгоністы;
5) унутраны.

**А28.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць працяжнікам:***

1. У лебядзінай песні вера, якой не страціць, не скарыць. (*Гр.*)
2. Хацела б я верыць яшчэ не канец. (*С. Явар.*)
3. Гаспадары пастараліся падстрэлілі дзвюх качак, утушылі іх з бульбаю, налавілі рыбы, згатавалі духмяную юшку. (*Лев.*)
4. Антабка гэта металічная дужка, за якую мацуецца рэмень стрэльбы ці аўтамата. (*Лев.*)
5. Без буслоў вясна не вясна, а толькі адна назва. (*В-х*)

**А29.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць коскай (коскамі) паміж аднароднымі азначэннямі:***

1. У сціплай непрыкметнай з выгляду хаціне быў масіўны стол з таўшчэзных бялюткіх бярозавых дошак. (*Лев.*)
2. Заўтра ж паеду ў наш цудоўны ціхі чысты сціплы гарадок. (*Г. Ч.*)
3. Процілеглы бераг быў ледзь бачнай тонкай сіняй палоскай лесу. (*З. Д.*)
4. Ля шырокіх акаваных меддзю створкавых дзвярэй застылі вартавыя ў бліскучых шлемах і латах, з дзідамі ў руках. (*Я. К.*)
5. На дварэ стаіць сухое спякотнае лета. (*В-х*)

**А30.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць двукроп'ем:***

1. Усяслаў павёў дружыну да галоўнага селішча тубыльцаў разбіў лагер паблізу, выставіў дазоры. (*Я. К.*)

2. Міхасю ўсміхнулася фартуна кіраўнік дыпломнай працы прафесар Галіноўскі запрасіў яго ў дзённую аспірантуру. (*В-х*)

3. У тым найвялікшая мацярынская ахвяра не лічыцца ні з чым, ні з якой на свеце цаной у імя выратавання свайго дзіцяці. (*В-х*)

4. Ад цябе патрабуецца высокі прафесіяналізм, поўная адданасць сваёй справе. (*В-х*)

5. Кім я толькі не набыўся за сваё жыццё будаўніком, і шафёрам, і майстрам па рамонту машын, і гандляром. (*Лоб.*)

**А31.** ***Адзначце простыя сказы з недапасаванымі азначэннямі:***

1. Адзін з мужчын, невысокага росту, лысаваты, з разумнымі вачамі, жвавы, пачуў здалёк нашу размову і загаварыў на добрай рускай мове. (*Альш.*)

2. Вузкая, да смешнага маленькая ручка пані Антаніды кранула дзеда за локаць. (*У. К.*)

3. Пра сваё набліжэнне хрыплымі гудкамі ражкоў папяярэджвалі паштовыя дыліжансы. (*Я. К.*)

4. У роспачы брат выкінуў вымененую мною калекцыю шэдэўраў у пясок на вуліцы. (*Альш.*)

5. Каля агню завіхаўся стараваты чалавек з шырокаю барадою. (*З. Д.*)

**А32.** ***Адзначце сказы з адасобленымі азначэннямі (улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены):***

1. Не адпускала ад сябе рака дзяцінства Бесядзь рака далёкіх і блізкіх прашчураў. (*Лев.*)

2. Мы беглі а здавалася луналі ў прасторы напоенай водарам свежых хваёвых стружак. (*Альш.*)

3. Па-маладому блішчэлі крыху злінялыя вочы акуратная шчотачка вусоў упрыгожвала твар. (*«Маладосць»*)

4. Чыстая і белая ляжала перад намі шаша. (*І. Пт.*)

5. Тут у лесе ізаляванаму ад вялікага свету адгароджанаму дрэвамі ад людзей нішто больш не зможа яму пагражаць. (*Федар.*)

## Тэст В

**В1.** ***Вызначце тып памылкі, дапушчанай у сказе. Пастаўце адпаведны нумар*.**

Глебу падабалася і як Ліза смяялася — ціхенька, быццам квола, але шчыра, весела, як яна хадзіла — не хадзіла, а лётала, як яна, за што б не

ўзялася, рабіла — вязала, лупіла бульбу, мыла посуд, прыбірала ў хаце… (*Сач.*)

1) пунктуацыйная;
2) арфаграфічная;
3) граматычная;
4) лексічная.

**В2.** ***Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі ў сказах словамі і іх сінтаксічнай роляй:***

| | |
|---|---|
| А. Пяклі хлеб самі, на подзе печы, **падсцілаючы дубовае ці кляновае лісце**. (*Сач.*)<br>Б. Садзілі **хлеб** у печ на вельмі чыстай, пасыпанай мукой драўлянай лапаце.(*Сач.*)<br>В. **Цёплы**, толькі што **спечаны** хлеб абмывалі вадой, клалі на стол, акрывалі чыстым ручніком. (*Сач.*)<br>Г. **Папракнуць** кавалкам хлеба — самая жорсткая кара. (*Сач.*) | 1. Дзейнік<br>2. Выказнік.<br>3. Дапаўненне.<br>4. Азначэнне.<br>5. Акалічнасць. |

**В3.** ***Знайдзіце сказ з памылкай ва ўжыванні ступені параўнання прыметніка. Выпраўце памылку і запішыце часціну мовы ў той форме, якой патрабуе сказ:***

1. Успамін з венскім крэслам, якое прынёс дзед для Алёны пад яблыню, застаецца ў маёй душы як адзін з самых каштоўных. (*Ул. Сц.*)

2. Асілак раздумваў пра мізэрную долю людзей, чый страх мацнейшы за ўдзячнасць. (*Васюч.*)

3. Ты можаш уратавацца, калі будзеш больш хутчэйшы за нашых коней. (*Васюч.*)

4. Лявон — высокі і маладзейшы за майго дзеда гадоў на дваццаць пяць мужчына. (*Ул. Сц.*)

5. Наступная пачвара, мусіць, будзе страшнейшая ад ільва, вось і спатрэбіцца табе наш меч. (*Васюч.*)

**В4.** ***Знайдзіце і запішыце па-беларуску словазлучэнне, якое адрозніваецца ад рускага формай залежнага слова:***

1) сидеть над романом;
2) заведующая кафедрой;
3) учить стихотворение;
4) ответить на вопрос;
5) рассказывать волнуясь.

**Тэкст для заданняў В5–В8**

1. Археолагі сцвярджаюць, што яшчэ ў эпоху неаліту, у II–IV тысячагоддзях да н. э., на тэрыторыі сённяшняй Маладзечаншчыны жылі плямёны культуры шнуравой керамікі, г. зн., плямёны ўсходніх балтаў, асноўным заняткам якіх былі жывёлагадоўля і земляробства. 2. У VI–IX

Рэпазіторый БДПУ

стагоддзях н. э. яна становіцца ўскраінай Полацкага княства, заселенай плямёнамі крывічоў. 3. З XIII стагоддзя адна за адной навакольныя тэрыторыі падпадаюць пад уплыў Вялікага княства Літоўскага. 4. І, як усе беларускія гарады, Маладзечна было пабудавана на беразе рэчкі Маладачанкі, што ўпадала ў больш паўнаводную Ушу. 5. З часам яна абмялела і, як Няміга ў Мінску, працягвае сваё жыццё ў калектары пад старой часткай горада. 6. Назву горад, верагодна, атрымаў ад былой ракі. 7. Праўда, імя горада не раз спрабавалі выводзіць ад слоў «маладзец», «малады», «малодшы», аднак усё гэта толькі здагадкі. 8. Сам жа горад узнік у вельмі зручным месцы, на скрыжаванні сухапутных дарог на Мінск, Вільню, Гарадок, Крэва, Лагойск, Ліду, Валожын, Нарач. 9. Зразумела, тут часта затрымліваліся купцы, вялі гандлёвыя справы, што паўплывала на далейшае развіццё горада і яго эканомікі. 10. Адзін з першых уладальнікаў горада Андрэй Заслаўскі зрабіў Маладзечна вялікакняжацкім, пабудаваў на сухім беразе балоцістай Ушы замак, што дало гораду магчымасць стаць у далейшым своеасаблівым духоўна-культурным цэнтрам. 11. Міналіся стагоддзі, і так паступова фарміравалася ўласцівая толькі гэтаму гораду культурная аўра. 12. Не апошнюю ролю тут адыграла ўнікальнае знаходжанне Маладзечна паміж дзвюх сталіц: 75 км да Мінска і 125 — да Вільні. 13. У 1872 годзе праз горад прайшла Любава-Роменская чыгунка, а ў 1960-я гады стала хадзіць і першая ў краіне электрычка. 14. Цяпер Маладзечна не назавеш правінцыяй, бо яно з'яўляецца спадарожнікам сталіцы, бярэ на сябе пэўным чынам яе культурную **перанасычанасць**.

**В5.** ***Вызначце стыль тэксту.***

**В6.** ***Дапішыце сказ:***
*Сродкам сувязі 1-га і 2-га сказаў з'яўляецца ...*

**В7.** ***Сярод сказаў 6–9 знайдзіце складаназалежны сказ з дададнай далучальнай часткай. Укажыце нумар сказа.***

**В8.** ***Вызначце спосаб утварэння выдзеленага ў 14-м сказе слова. Запішыце адказ у назоўным склоне.***

## Кантрольная работа № 9

### Варыянт 1

## Тэст А

**А1.** ***Адзначце словы, у якіх адсутнічаюць глухія зычныя:***

1) Гедымін;
2) спагадлівы;
3) ганак;
4) мазгі;
5) дагадзіць.

**А2.** ***Адзначце словы з няправільна пастаўленым націскам:***

1) чысцільшчык;
2) духо́ўнік;
3) адчыркнуць;
4) па́ніч;
5) хлу́сіць.

**А3.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара** а**:***

1) р...дказубы;
2) с...кратар;
3) бухгалт...р;
4) д...каданс;
5) карц...р.

**А4.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара** е**:***

1) ман...кен;
2) гл...дачы;
3) б...нокль;
4) удал...чынь;
5) бл...ндаж.

**А5.** ***Адзначце словы з памылковым напісаннем:***

1) рыжысёр;
2) трэніроўка;
3) за́мяць;
4) дынастыя;
5) мячэць.

**А6.** ***Адзначце словы з прапушчанай літарай** о**:***

1) р...гападобны;
2) м...натонны;
3) р...ўнабедраны;
4) выс...каквaліфікаваны;
5) м...тагонкі.

**А7.** ***Адзначце словы з прапушчаным спалучэннем** іе**:***

1) пац...нт;
2) абітур...нт;
3) ...зуіт;
4) кл...нт;
5) рад...актыўны.

**А8.** ***Адзначце слова з прапушчанай літарай** ў**:***

1) ка...гас;
2) перад ...раганам;
3) Ганна ...сцінаўна;
4) жанчына-...нікум;
5) фіна-...горскі.

**А9.** ***Адзначце словы, пры напісанні якіх задзейнічаны адначасова фанетычны і марфалагічны прынцыпы напісання:***

1) ад сядзібы;
2) перапісчык;
4) калодка;
5) засцянковы.



Репозиторий БГМУ

3) назбіраць;

**А10.** ***Адзначце словы, якія пішуцца з вялікай літары:***
1) (Д, д)зень геолага;
2) (В, в)ялікая Айчынная вайна;
3) (К, к)упальская ноч;
4) (В, в)ыдатнік народнай асветы;
5) (А, а)лімпійскі медаль.

**А11.** ***Адзначце сінанімічныя рады:***
1) прымус, няволя, прыгнечанне;
2) разам, кампанейскі, калектыўна;
3) бой, баталія, сеча;
4) забарона, вета, табу;
5) прывабны, абаяльны, шляхетнасць.

**А12.** ***Адзначце назоўнікі з канчаткам** -а(-я)**:***
1) завушніцы з (бурштын);
2) войскі 1-га Беларускага (фронт);
3) збочыў з (тратуар);
4) дырэктар (ліцэй);
5) падрыхтаваўся да (ад'езд).

**А13.** ***Адзначце назоўнікі, у якіх у месным склоне назіраецца чаргаванне зычных:***
1) салістка;
2) кветнік;
3) разліў;
4) рог (вуліцы);
5) неразбярыха.

**А14.** ***Адзначце спалучэнні з няправільна ўтворанымі формамі слоў:***
1) два тоўстых дуба;
2) пакутваем ад бескультур'я;
3) за пяць кіламетраў;
4) на беразе ракі;
5) больш разумнейшы за цябе.

**А15.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара ь:***
1) гомел...скі;
2) гарын...скі;
3) ледз...ве;
4) Дз...мітрый;
5) Вадап...янаў.

**А16.** ***Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць дзве літары, пададзеныя ў дужках:***
1) прынесе_ыя (нн);
2) ра_адзіць (сс);
4) раздаро_а (жж);
5) ка_ега (лл).



Репозиторий БГМУ

3) годнас_ю (цц);

**А17.** ***Адзначце словазлучэнні з адноснымі прыметнікамі:***

1) воўчае логава;
2) мядзведжае футра;
3) воўчы апетыт;
4) крыштальная ваза;
5) ранішняе сонца.

**А18.** ***Адзначце словы, якія пішуцца разам:***

1) кабардзіна...балкарскі;
2) халхін...гольскі;
3) турба...генератар;
4) вела...трэк;
5) дызель...электраход.

**А19.** ***Адзначце словы з памылковым напісаннем:***

1) Трэццякоў;
2) сёняшні;
3) таварыскі;
4) данбаскі;
5) тайваньскі.

**А20.** ***Адзначце радкі, у якіх усе словы з'яўляюцца лічэбнікамі:***

1) двайны, двое;
2) пяты, упяцёх;
3) сёмы, дваццаць два;
4) пяцёра, двухсоты;
5) трыццаць, дзясяцера.

**А21.** ***Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-й асобы множнага ліку абвеснага ладу маюць канчаткі*** *-аце, -еце:*

1) ацаніць; 2) адолець; 3) сароміць; 4) сыпаць; 5) адмераць.

**А22.** ***Адзначце сказы, у якіх інфінітыў з'яўляецца часткай састаўнога дзеяслоўнага выказніка:***

1. Хто з нас у дзяцінстве не марыў аб'ехаць увесь сусвет!
2. Пасля абеду брыгадзір паслаў Пятра баранаваць бульбу.
3. Надакучыла з ранку да вечара душыцца пылам на гэтым баранаванні. (*М. Гіль*)
4. Захацелася скончыць клін сёння ж.
5. Маці памкнулася запярэчыць, прысароміць сына.

**А23.** ***Адзначце словазлучэнні з правільна ўтворанымі і напісанымі дзеепрыметнікамі:***

1) прасякнуты любоўю радок;
2) намалёваны пейзаж;
3) выкіненая на бераг рыба;
4) прафесійна пастаўлены голас;
5) запаволенныя жэсты.

**А24.** ***Адзначце словы з правільна вызначаным лексічным значэннем:***

1. Браўнінг — кідальная зброя аўстралійцаў у форме загнутай завостранай палкі, якая, не сустрэўшы ў палёце перашкоды, вяртаецца на тое месца, адкуль была кінута.

2. Аптымізм — бадзёры жыццярадасны настрой, пры якім чалавек верыць у лепшае.

3. Ардынарны — які нічым асаблівым на вылучаецца; звычайны, непрыкметны.

4. Гербарый — калекцыя засушаных раслін, траў.

5. Меланхолік — чалавек энергічнага тэмпераменту, які лёгка ўзбуджаецца пад уздзеяннем якіх-небудзь уражанняў.

**А25.** ***Адзначце сказы, у якіх словы ўжыты ў пераносным значэнні:***

1. Дзень выспяваў нетаропка, як выспявае пад гарачым сонцам на бяскрайняй ніве колас. (*В. Іп.*)

2. Праз нейкі час незнаёмы чалавек прыехаў да жонкі дырэктара школы. (*Бар.*)

3. Мая душа пачынала расцвітаць ад цяпла жаночай пяшчоты. (*Дам.*)

4. Людзі! Да зорак вас не ракеты — шчодрыя сэрцы нясуць. (*У. Верамейчык*)

5. Дагараюць чужынцаў танкі, бой на захадзе ўжо далёка. (*Кір.*)

**А26.** ***Адзначце сказы з моўнымі недахопамі. Запішыце выпраўленыя сказы:***

1. І жыццё ягонае [Міколава] было прынесена ў ахвяру нялюбай справе толькі таму, што яму было недзе зразумець і зведаць музыку, недзе было нават зразумець, што ён яе любіць, што гэта і толькі гэта — ягоны шлях. (*У. К.*)

2. Вялікі «стыліст» і моўны законнік Ян Скрыган адным гэтым словам раптам павярнуўся да мяне зусім новай мужчынскай гранню. (*А. Кудравец*)

3. Я запусціў руку ў рукаўчык, дзе былі крупы, кінуў у рот колькі каліваў і пачаў жаваць. (*Сод.*)

4. Хай спагадаюць сыночку нашаму сонейка і месячык, людцы добрыя. (*В-х*)

5. Вялікі князь нагнуўся, каб падняць дзіду, але Кужаль апярэдзіў яго, схапіў цяжкае дрэўца, беражліва працёр рукой наверша. (*В. Іп.*)

**А27.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю неабходна дапоўніць працяжнікам:***

1. У гарыстай мясцовасці танкам не было дзе развярнуцца болей дзейнічала пяхота. (*В. Б.*)

2. Агляд атрада перад дэсантам лейтэнант Лар заўсёды рабіў моўчкі і не гаварыў ніякіх прамоў, бо ведаў па сабе яны не выклікаюць ніякіх пачуццяў, акрамя раздражнення. (*А. Аляшкевіч*)

3. Дзед Сцяпан ніколі не паліў у печы сухастоем толькі сырым алешнікам. (*Сіп.*)

4. Іван Рыгоравіч толькі сказаў, што вайна гэта жудасная з'ява ў жыцці чалавека. (*Лук.*)

5. Утульны рэстаран выклікае ўспаміны дзяцінства ўвечары мы тапілі грубку, варылі бульбу. (*Альш.*)

**А28.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць коскай (коскамі):***

1. Ды крыло матыля як вясёлка мільгане між пасохлай травы. (*Гаран.*)
2. Грыбіха, ужо не зважаючы на госця, якога ведала як аблупленага, пагрозліва тыцнула Данілу пад самы нос вялізны кулак. (*В-х*)
3. І вера ў выпадковую сустрэчу як на крылах падымае мяне над зямлёй і поўніць душу самым светлым, што ёсць на свеце. (*А. Яскевіч*)
4. Вуліцу пераходзіла пажылая жанчына, якая раптам спынілася, стала як укапаная. (*Бар.*)
5. Рэчыца вядомая як горад-крэпасць на Дняпры. (*Ул. Л.*)

**А29.** ***Адзначце сказы, у якіх зваротак аддзяляецца коскай або выдзяляецца коскамі:***

1. О Беларусь тваёй пяшчотай душа не ўсцешыцца мая. (*Гардз.*)
2. Мама бачу дзяцінства далёкае, што баіцца шэрага воўка. (*Я. Я.*)
3. Пакуль на свеце будуць такія людзі, як вы Тадэвуш, барацьба супраць тыраніі ў любых яе праявах не згасне. (*Я. К.*)
4. Рэкі гэтыя як высвятляецца маламодныя ў параўнанні з шырокай і бурнай Кубанню. (*Зяньк.*)
5. Відаць Капялюш паспеў перасекчы двор і схавацца ў далёкім пад'ездзе. (*М. Ю.*)

**А30.** ***Адзначце сказы з адасобленымі азначэннямі (улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены):***

1. Выпаленая бязлітасным сонцам да цвёрдасці каменю адпачывала рудая зямля пасля сваёй летняй працы калі ў яе чэраве набіралі моц духмяныя расліны і чэпкія карані аліваў прагна п'ючы назапашаную вільгаць. (*Бязл.*)
2. Па даных разведчыка ўкаранёнага па заданні Віктара Гурыновіча ў Бабруйскую школу разведкі сталі вядомы прозвішчы і прыкметы дваццаці васьмі здраднікаў засланых у партызанскія атрады Мінскай і Магілеўскай абласцей. (*В. Кісялёў*)
3. У ноч напярэдадні выправы Касцюшка нечакана сасніў Людвіку. (*Я. К.*)
4. А недзе б'ецца дзікім зверам юнак закінуты за краты. (*С. Крывец*)
5. Я без дай прычыны акінуў вокам пустынны прарэджаны восенню парк. (*Асіп.*)

**А31.** ***Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх часткі звязаны супраціўнымі злучнікамі:***

1. Хлопцы не ведалі яшчэ, што слава чалавецтва не ў мінулым і што біцца трэба не за мінулае, але іхні парыў быў сумленны і чысты. (*У. К.*)

2. У апошнія гады веснавыя паводкі на Ясельдзе адсутнічаюць, затое пачасціліся летнія навадненні. (*Каз.*)

3. Кожная птушка расказвае адна адной пра нешта, а я так і сыду з гэтага свету, чуючы, можа, адну макавінку з цьмы цем таямніц быцця. (*В. Іп.*)

4. Мая пракурорская служба вымушала асцярожна выбіраць сяброў, але Пятро стаў адразу ж адным з лепшых і шчырых маіх дружбакоў. (*А. Літошка*)

5. Вінаград у садзе, у каморы віны, а ў хаце ў белым плацці красная дзяўчына. (*П. Шруб*)

**А32.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю неабходна дапоўніць двукроп'ем:***

1. Бяруся, аднак, сцвярджаць што апантанасць змыкае анёла з д'яблам, дабро са злом нават пры самай відавочнай ісціне дабра або зла. (*Асіп.*)
2. Ужо на аўтастанцыі Сянчук адчуў так знаёмы яму дух райцэнтра вясковая цішыня і няспешнасць людзей ніякіх натоўпаў на прыпынках, трасянка і амаль вясковая гаворка. (*Дзятл.*)
3. Сцяпан не такі ён чужога не возьме. (*Сіп.*)
4. Пройгрыш каманды па віне Ціма сур'ёзнае выпрабаванне сяброўства ў падлеткавым узросце. (*Верц.*)
5. У хлебаробаў чыстае сумленне пакуль жывуць, дык хлеба нам стае. (*М. Лукіў*)

## Тэст В

**В1.** ***Вызначце, якая часціца ўжываецца на месцы пропуску, і ўкажыце суадносіны паміж слупкамі табліцы:***

| | |
|---|---|
| А. Прапанаваў гаспадар пабіцца аб заклад на залатую гінею, што ніхто з гасцей н...прыдумае такога даручэння, якога б Мэры н...выканала. (*«Маладосць»*) | 1. Часціца *ні* ўжываецца для ўзмацнення адмаўлення. |
| Б. Якіх толькі страў н... гатавала наша мама на калядны стол! | 2. Часціца *не* ўжываецца ў клічным сказе і мае сцвярджальны сэнс. |
| В. На жаль, ніхто не ведаў, н... хто такія прышэльцы, н... з якіх далёкіх зорак яны прыляцелі, н... як выглядаюць. (*А. Аляшкевіч*) | 3. Часціца *не* мае адмоўнае значэнне. |
| Г. Максім праводзіў у пагоні гадзіну за гадзінай і н... разу не прысеў. (*М. Ю.*) | 4. Часціца *ні* ўваходзіць у склад сродка сувязі ў складаназалежным сказе. |
| | 5. Часціца *ні* ўжываецца ў ролі паўторнага спалучальнага злучніка ў сказе з аднароднымі членамі (часткамі). |

**В2.** ***Устанавіце адпаведнасць паміж сказамі і іх характарыстыкай з пункту гледжання вытрыманасці марфалагічных норм:***

| | |
|---|---|
| А. Вось і мяне, як іншых, прыручылі… А я ж | 1. Памылка ва ўтварэнні |

| | |
|---|---|
| сама ірвалася штосілы з зялёнага свайго кутка ляснога, шукала іншы, болей прыгажэйшы. (*Я. Я.*)<br>Б. – Выліваха, — сказаў Палачанін. — Ці доўга яна тут будзе здзекавацца з нас? (*У. К.*)<br>В. Падняўся на ганак, пайшоў да дзверы ў хату, якая ўсё яшчэ была расчынена напята. (*Сіп.*)<br>Г. Вакол царквы раслі высокія ліпы з густымі кронамі і старыя бярозы з мноствам вароніных гнёздаў. (*Афяр.*) | формы назоўніка.<br>2. Памылка ва ўтварэнні формы дзеяслова.<br>3. Памылка ва ўтварэнні формы ступені параўнання прыметніка.<br>4. Памылка ва ўтварэнні формы прыналежнага прыметніка.<br>5. Марфалагічныя нормы не парушаны. |

**В3.** ***Утварыце складаны прыметнік з першай часткай лічэбнікам і запішыце яго ў патрэбнай склонавай форме:***

Заолаг, прыродазнаўца, урач, публіцыст Бенядзікт Дубоўскі нарадзіўся 29 красавіка 1833 года ў маёнтку Адамарын (за 4 кіламетры на ўсход ад вёскі Дубравы, недалёка ад таго месца, дзе пачынае свой 78-кіламетровы шлях рака Уша). (*М. Бандарэнка*)

**В4.** ***Адзначце схему, якая адпавядае пастаноўцы знакаў прыпынку ў наступным сказе:***

Хіба я не казаў што галубкі не для вераб'ёў а дочкі магнатаў не для шляхцюкоў шалёна зароў гетман у кайданы мярзотніка (*Я. К.*)

1. «П, — а. — П…»
2. «П! — а, — п».
3. «П, — а. — П!»
4. «П! — а: — П!»
5. «П? — а. — П!»

### Тэкст да заданняў В5–В8

### Ранкам у хаце

1. Лета добра ўтравела, і водар духмянага сена, якое вяскоўцы сушылі на недалёкім балонні, здавалася, запаўняў усё наваколле. 2. Тыдзень, як стаяла спякота: ад дзённай гарачыні не паспявала астываць за короткую ноч зямля. 3. Але людзям трэба было рабіць сваю адвечную работу.

4. – Памерці можна ад духаты гэтай… Нават з ранку продыху нямашака… — уголас прамовіла сама сабе Домна, зазіраючы ў печ, і ўздыхнула: — Трэба бульбу таўчы, а гэтага як ваўкі некуды звалаклі…

5. Кабета адышла ад печы, зазірнула ў акно, але, так нікога і не ўбачыўшы на падворку, вярнулася і, ціха вохкаючы, паспрабавала зрушыць чыгун.

6. Незадаволена буркнула:

– Прасіла ж, Васё: не насыпай гэты пудовік бульбай. Як яго цяпер уладаваць? Дзевак будзіць, ці што? І дзе толькі ён швэндаецца, га? Бульба ж пераварылася…

7. Паспрабавала яшчэ раз, праз высілкі, і чыгун, нарэшце, пыхнуўшы смачнай парай, паддаўся. 8. Але сілы жанчыну пакідалі: рукі дрыжалі, і чыгун мог перакуліцца, таму, злуючыся на мужа, яна пакінула непасільны занятак.

9. – Ну, дзе цябе носіць, стары, га? Бульба згарыць…

10. У сенцах нехта бразнуў клямкай, і жанчына абрадавалася: увайшоў мужчына!

**В5.** ***Вызначце стыль тэксту і яго тып:***

1) публіцыстычны, разважанне;
2) навуковы, апісанне;
3) мастацкі, апавяданне;
4) гутарковы, апавяданне з элементамі апісання.

**В6.** ***Вызначце ў сказах 5–6 словы, будова якога адпавядае схеме:*** *прыстаўка + прыстаўка + корань + суфікс + суфікс.*

**В7.** ***Вызначце, якому дзеяслову ў сказах 8–9 адпавядаюць наступныя марфалагічныя прыкметы:***

1) пераходны;
2) незваротны;
3) незакончанага трывання;
4) II спражэння.

**В8.** ***У сказах 1–3 знайдзіце словы абмежаванага ўжывання. Укажыце назву лексічнай групы, да якой адносіцца гэтае слова.***

## Варыянт 2

### Тэст А

**А1.** ***Адзначце словы з аднолькавай колькасцю літар і гукаў:***

| | |
|---|---|
| 1) пачуццё; | 4) прыяцель; |
| 2) грудзі; | 5) конны. |
| 3) абагрэць; | |

**А2.** ***Адзначце словы, у якіх ёсць глухія зычныя:***

| | |
|---|---|
| 1) эмульсійны; | 4) развага; |
| 2) цікаўны; | 5) новабудоўля. |
| 3) бераг; | |

**А3.** ***Адзначце словы з націскным другім складам:***

| | |
|---|---|
| 1) стары; | 4) вапнавы; |
| 2) слабы; | 5) каменны. |



Репозиторий БГМУ

3) брыдкі;

**А4.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара** а:*

1) д…клараваць;
2) мар…ва;
3) ш…рэнга;
4) ч…мадан;
5) ц…нзура.

**А5.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара** я:*

1) м…тодыка;
2) біс…ктрыса;
3) с…ржант;
4) пазел…нець;
5) выс…чка.

**А6.** ***Адзначце словы з няправільным напісаннем:***

1) дрэсіраваць;
2) пісіміст;
3) агрэсіўны;
4) люмінісцэнтны;
5) медаль.

**А7.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара** о:*

1) чырв…нагвардзейскі;
2) ф…таграфія;
3) ф…таоптыка;
4) мн…гаўладдзе;
5) д…брадушны.

**А8.** ***Адзначце словы з прапушчанай літарай** е:*

1) сярэдн…сібірскі;
2) бран…бойны;
3) верхн…лужыцкі;
4) вогн…паклонніцкі;
5) вугл…бетон.

**А9.** ***Адзначце словы з прапушчанай літарай** у:*

1) бачыў …першыню;
2) пакга…з;
3) перад …нівермагам;
4) джо…ль;
5) Ка…каз.

**А10.** ***Адзначце слова з прапушчанай літарай:***

1) бараз…на;
2) кампос…ны;
3) вус…на;
4) скарас…ны;
5) праек…ны.

**А11.** ***Адзначце словы, якія пішуцца з малой літары:***

1) (З, з)ямны шар;
2) (Г, г)рынвіцкі мерыдыян;
3) (З, з)аходняя Беларусь;
4) (А, а)рмянская музыка;
5) (Г, г)родзеншчына.

**А12.** ***Адзначце сінанімічныя рады:***

1) верны, адданы, адважны;
2) адзінка, паасобнік, экземпляр;

3) араты, земляроб, ратай;
4) стралок, снайпер, зенітчык;
5) пісьмо, ліст, эпістала.

**А13.** ***Адзначце назоўнікі з канчаткам -у(-ю):***
1) адлюстраванне (гераізм);
2) выйсці з (лес);
3) каля запаснога (выхад);
4) глядзіць з (фатаздымак);
5) водар (чабор).

**А14.** ***Адзначце назоўнікі, якія ў форме меснага склону маюць канчатак -е:***
1) дыета; 2) галоўка; 3) выклічнік; 4) свята; 5) друк.

**А15.** ***Адзначце спалучэнні слоў, у якіх займеннікі ўжыты правільна:***
1) ніхто іншы не прыйшоў;
2) ні хто іншы, як Гарлахвацкі;
3) нехта святкуе перамогу;
4) ад самой Масквы;
5) у абыякага чалавека.

**А16.** ***Адзначце словазлучэнні з правільнай лексічнай спалучальнасцю слоў:***
1) скрытная камера;
2) сытны абед;
3) запаведныя мясціны;
4) суседская вёска;
5) грамадзянскі абавязак.

**А17.** ***Адзначце сказы, у якіх трэба пісаць прыназоўнік са:***
1. Я ... сваім дзедам заўсёды вітаўся за руку. (*Ул. Сц.*)
2. Я адчуваў ... неймаверным болем, што нешта не так дзеецца ў маім жыцці. (*Дам.*)
3. Чаму царыца нават не выйшла ... сваіх пакояў, каб прывітаць госця? (*Васюч.*)
4. Светлы бок жыцця тчэцца ... светлых памкненняў. (*Ул. Сц.*)
5. Бізун бацька ... старога рэменя сплёў. (*Гап.*)

**А18.** ***Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок:***
1) дрэва…сасна;
2) блок…пост;
3) штаб…афіцэр;
4) віцэ…прэзідэнт;
5) крэпасць…герой.

**А19.** ***Адзначце сказы з састаўным іменным выказнікам:***
1. Людзям трэба было цягнуць сваю адвечную работу. (*Гаўр.*)
2. Дзед паспеў пакаштаваць тых ігруш, салодкіх і даўкіх. (*Ул. Сц.*)
3. Лес выглядаў змрочным і нежывым, бы пустэльня. (*Васюч.*)
4. У снежні 1939 г., пасля далучэння Заходняй Беларусі да СССР, быў створаны запаведнік «Белавежская пушча». (*«Маладосць»*)

Репозиторий БГМУ

5. Андатра — млекакормячае атрада хамякападобных — была завезена ў Беларусь у 1948 годзе. (*«Маладосць»*)

**А20.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю неабходна дапоўніць працяжнікам:***

1. Купанне ў чыстай вадзе выдатны сродак узбадзёрвання. (*П. С.*)
2. Касцюшка крытычна ацэньваў свае малюнкі і частку іх без ваганняў адправіў у печ, бо разумеў: жывапіс не яго прызванне. (*Я. К.*)
3. Вы людзі дарослыя і несяце поўную адказнасць за свае ўчынкі. (*А. Дудараў*)
4. Вузел сувязі гэта цэнтральная нервовая сістэма войска. (*А. Дудараў*)
5. Аляксей Дудараў найбольш вядомы як драматург і кінадраматург. (*«Маладосць»*).

**А21.** ***Адзначце аднасатаўныя няпэўна-асабовыя сказы:***

1. Перашапчу табе ўсе казкі свету. (*Бур.*)
2. Праз дзесяць хвілін сігналы радыёмаяка засякуць. (*А. Дудараў*)
3. Вочы Геракла зацягнула ружовым туманам. (*Васюч.*)
4. Спыніўся і прыслухаўся — ззаду было ціха. (*А. Нафрановіч*)
5. Спускаюцца ўніз, вось у гэты раўчучок, праязджаюць гэты малюпасенькі лясок. (*А. Дудараў*)

**А22.** ***Адзначце сказы з адасобленымі дададзенымі членамі (улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены):***

1. Несучы сцішаную жывёліну на руках Геракл шпарка пакрочыў уніз па схіле гары. (*Васюч.*)
2. За некалькі секунд асілак аддыхаўся нацягнуў лук і прыцэліўся. (*Васюч.*)
3. Алкід ішоў упэўненай хадой адчуваючы што да яго вярнулася моц. (*Васюч.*)
4. Камень пушчаны рукой волата раскалоў выступ скалы засыпаўшы пастухоў дробным друзам. (*Васюч.*)
5. Цяглiцы бы ўдавы ўздымаліся пад скурай прыхадня пры кожным кроку. (*Васюч.*)

**А23.** ***Адзначце словазлучэнні з правільна ўтворанымі і напісанымі дзеепрыметнікамі:***

1) узрадаваныя перамогай шведы;
2) ліквідаваная несправядлівасць;
3) распачатыя дзеянні;
4) акружаючае войска;
5) выступаючы прафесар.

**А24.** ***Адзначце сказы з лексічнымі ці са стылістычна-граматычнымі памылкамі:***

1. Пад раніцу, седзячы на лаўцы ля рэчкі, Андрэй задрамаў. (*А. Р-ч*)

2. Біялагічныя даследаванні, якія меркавалася правесці, давялося абмежаваць да вельмі сціплых памераў дзякуючы адсутнасці падтрымкі і спачування мясцовых улад. (*М. Бандарэнка*)

3. Калегі па рабоце падтрымлівалі вучонага, дапамагалі яму ў стварэнні заалагічнага музея, які з'явіўся яго навуковай лабараторыяй. (*М. Бандарэнка*)

4. Незнаёмы варушыў вуснамі, як быццам пералічваў пра сябе статак. (*Васюч.*)

5. Сваячкаю старая груша-дзічка глядзіць на строме на прымоўклы сад. (*В. Яр.*)

**A25.** ***Адзначце сказы, у якіх трэба паставіць тры коскі:***

1. Памятаю што калі прыйшоў стрыечны брат Міша з фотаапаратам дзед адставіў пілу і ўзяўся зашпільваць на кашулі каўнер.

2. З першых гадоў свайго яшчэ не вельмі свядомога жыцця да апошніх сустрэч мы з дзедам віталіся поціскам гледзячы ў вочы і праз той поціск мне перадаваліся сіла і спакой.

3. Мне было гадоў сем і заступіцца за дзеда я не мог але крыўда на дзядзьку Лявона засталася.

4. Я запомніў як дзед сказаў што калі яго не будзе то я стану жыць замест яго.

5. Дзед параўнаў мой чырвоны мячык з круглай зямлёй і паказаў на ім што калі пайсці ў адным напрамку то напэўна прыйдзеш у зыходнае месца. (*Ул. Сцяпан*)

**A26.** ***Адзначце словы з правільна вызначаным лексічным значэннем:***

1. Статыст — асоба, якая на сцэне выконвае пабочныя ролі без слоў.

2. Шкіпер — капітан грузавога судна.

3. Фарватар — струмень вады, які застаецца ззаду судна.

4. Кіцель — прыталеная куртка ваеннага крою з чатырма накладнымі кішэнямі і хлясцікам ззаду.

5. Фураж — раслінны корм свойскай жывёлы і птушак.

**A27.** ***Адзначце сказы, у якіх словы ўжыты ў пераносным значэнні:***

1. Праз цэлых трыццаць год паўтару: аўтар апавядання «Марыля» — арыгінальны пісьменнік. (*Янк.*)

2. Паперы аркуш стыне на стале, пачуццяў сіні гар на ім сатлеў. (*А. Звонак*)

3. Маладзік, прапорваючы вострым рогам неабдымную цемру ночы, плыў высока ў небе. (*В. Іп.*)

4. Вытанчаным слыхам мага Вакула пачуў у хоры чысты, светлы голас маладой дзяўчыны, адчуў хваёвы пах. (*В. Іп.*)

5. Новая хваля сораму прыліла да яе стомленага, бледнага твару, пазбавіла яе мовы. (*А. Васілевіч*)

**А28.** ***Адзначце сказы, у якіх часціца*** *не* ***на месцы ўсіх пропускаў пішацца асобна:***

1. На гэтым шляху нас чакае і н…мала розных выпрабаванняў, расчараванняў, пакут, і далёка н…кожны іх вытрымлівае. (*З. Пр.*)
2. Я вырас пад гарматнымі стваламі, я мераў час секундай, а н…днём; я вызначаў свой рост н…пад стваламі — пад расчахлёнай пашчай, пад агнём. (*Гаўр.*)
3. Вячэраць у гатэльным рэстаране Андрэй н…захацеў, хуценька сабраўся і, н…чакаючы маршрутнага аўтобуса, узяў таксі. (*А. Р-ч*)
4. Му́зыка, н…таропкая, мяккая, н…ахвотна і н…смела парывалася ў глыбіню рэстараннай залы. (*А. Р-ч*)
5. Нарэшце музыка паявіўся і, н…на кога н…гледзячы, сеў да інструмента, гучна і адчайна ўдарыў па клавішах. (*А. Р-ч*)

**А29.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць коскай (коскамі):***

1. Цяпер жа Васіль дапаўзаў да ложка і падаў як забіты. (*А. Бар.*)
2. Ганна стала вырывацца, але Колевы рукі былі як абцугі. (*Гаўр.*)
3. Сэрца маці як чуйны радар ловіць нашых пакут адгалоскі. (*І. Масян*)
4. Ухапіў Сцёпка нейкую карагу, זароў што бык на бойні ды пагнаўся за Тодарамі. (*В-х*)
5. Дудзіч выйшаў з кабінета як не сваімі нагамі: стала моташна, сціснулася сэрца. (*Дам.*)

**А30.** ***Адзначце сказы, у якіх зваротак аддзяляецца коскай або выдзяляецца коскамі:***

1. Ты матуля мне будзіш раніцу дзіўнай песняй да болю роднай. (*Я. Я.*)
2. Безумоўна цікавасць да фантастыкі ў нашай краіне досыць вялікая. (*«Маладосць»*)
3. Мой субяседнік як распалены касцёр разагрэўся полымем успамінаў. (*Ул. Л.*)
4. Тады дзеду іграйце адразу вясёлае. (*Б.*)
5. Люблю твае Нарач затокі і тоні, як вецер густыя туманы развесіць. (*М. Т.*)

**А31.** ***Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку:***

1. Спакон вякоў пяе народ, і песні льюцца, быццам рэкі. (*С. Крывец*)
2. Ці сыдуцца нашыя сцежкі і давядзецца яшчэ раз сустрэцца з гэтымі вясёлымі і добрымі людзьмі? (*Лоб.*)



Репозиторий БГПУ

3. Аднойчы ўчула песню пра дзівасіл, і было такое на душы, што хацелася плакаць і плакаць. (*Лоб.*)

4. Добрая слава на паліцы ляжыць, а благая па дарожцы бяжыць. (*Прык.*)

5. Над агароджай узвышалася залатая галава Вялеса і віўся сівым вэлюмам дым ад святога вогнішча. (*З. Д.*)

**А32.** ***Колькі і якіх знакаў прыпынку павінна быць? Адзначце нумар правільнага адказу.***

Пра тое што прадстаўніцы слабой часткі чалавецтва практыкаваліся ў фізічна складаных і небяспечных гульнях сведчаць старажытныя фрэскі з выявамі «гульняў з быком» дзе прымалі ўдзел юнакі і дзяўчаты якія скакалі праз быка робячы як лічаць даследчыкі неверагодныя нават з сучаснага пункту гледжання рэчы пераскоквалі трымаючыся за яго рогі рабілі зваротнае сальта апускаліся на спіну жывёлы а затым на зямлю. (*І. Вуглік*)

1) 9 косак, 2 працяжнікі;
2) 13 косак, 1 працяжнік;
3) 7 косак, 2 працяжнікі; 1 двукроп'е;
4) 11 косак, 1 двукроп'е.

## Тэст В

**В1.** ***Вызначце, які знак прыпынку трэба паставіць у складаным бяззлучнікавым сказе. Устанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы:***

| | |
|---|---|
| А. Людзі павінны разумець нішто проста так не даецца. (*«Маладосць»*) | 1. Коска ставіцца таму, што часткі не залежаць адна ад другой, але цесна звязаны па сэнсу. |
| Б. Заснулі пратокі, прыціхлі віры дрымота на сцежках падводных. (*Ваб.*). | 2. Двукроп'е ставіцца, бо другая частка ўказвае на прычыну таго, пра што гаворыцца ў першай. |
| В. Той-сёй з гультаяватых кадэтаў спрабаваў кпіць са «Шведа» Касцюшка, не вагаючыся, выклікаў крыўдзіцеляў на двубой. (*Я. К.*) | 3. Двукроп'е ставіцца, бо другая частка дапаўняе, раскрывае сэнс першай. |
| Г. Здаецца, не нямецкія і беларускія, а менавіта чэчэнскія карціны найбольш удаліся Віктару Праўдзіну там сапраўды адчуваецца яго прысутнасць. (*Запр.*) | 4. Працяжнік ставіцца, бо другая частка выражае неадпаведнасць, нечаканы вынік таго, пра што гаворыцца ў першай. |
| | 5. Працяжнік ставіцца, бо першая частка паказвае на час або ўмову таго, пра што гаворыцца ў другой. |

Рэпазіторый БДПУ

**В2.** ***Вызначце суадносіны паміж фразеалагізмамі ў сказах і іх сінтаксічнай роляй:***

| | |
|---|---|
| А. Маша звалілася як снег на галаву ў самы разгар гарадскога свята. (*Гаўр.*)<br>Б. Ганна захоплена, з павагай глядзела на хлопца, які за нейкае імгненне вырас у яе вачах. (*Гаўр.*)<br>В. Вы мне прынеслі не гісторыю развіцця хваробы, а фількіну грамату. (*А. Тул.*)<br>Г. На другі дзень пасля ад'езду жонкі ўзняўся з першымі пеўнямі, апрануўся ў загадзя падрыхтаваную, як на свята, вопратку. (*В. Ш.*) | 1. Дзейнік.<br>2. Выказнік.<br>3. Дапаўненне.<br>4. Азначэнне.<br>5. Акалічнасць. |

**В3.** ***Устанавіце адпаведнасць паміж раздзеламі мовазнаўства і паняццямі, якія там вывучаюцца:***

| | |
|---|---|
| А. Марфалогія. | 1. Азначэнне. |
| Б. Сінтаксіс. | 2. Займеннік. |
| В. Фанетыка. | 3. Гукі мовы. |
| Г. Лексіка. | 4. Архаізмы. |
| | 5. Марфема. |

**В4.** ***Вызначце суадносіны паміж сказамі і іх характарыстыкай:***

| | |
|---|---|
| А. Янка сціпла развіталася і пайшла некуды за раку, на другую сенажаць, а я, разгублены, пачаў збірацца дадому. (*А. Тул.*)<br>Б. Па адзінай вясковай вуліцы разбрыліся сосны, дубы, рабіны, яблыні. (*А. Тул.*)<br>В. Сапраўднага кахання жадаюць усе жанчыны і ў мірны час, і ў ваенны: што б ні адбывалася на зямлі, жанчына застаецца жанчынай. (*«Маладосць»*)<br>Г. А па абедзе над вёскаю навісалі налітыя воласам хмары, бушаваў вецер, ліў дождж. (*І. Пт.*) | 1. Просты ўскладнены сказ.<br>2. Складаназлучаны сказ.<br>3. Складаны бяззлучнікавы сказ.<br>4. Складаназалежны сказ.<br>5. Складаны сказ з рознымі відамі сувязі. |

**В5.** ***Вызначце суадносіны паміж складаназалежнымі сказамі і тыпамі даданых частак:***

| | |
|---|---|
| А. Горад, дзе вучыўся, дзе сустрэўся і спазнаў радасць з Лізаю, наведаў адразу ж пасля перамогі. (*Сач.*)<br>Б. Што Ліза была гаспадаром, Глеб не ведаў. (*Сач.*)<br>В. Тое, што мучыла, пазбаўляла сну і спакою, пачалося даўно, вельмі даўно. (*Сач.*)<br>Г. Хлопец згодна кіўнуў галавою, ускочыў на каня, пастаяў, паўзіраўся ўслед дзяўчыне, пакуль яна не схавалася за кустом, і пагнаў каня да княжацкага замка. (*З. Д.*) | 1. Азначальныя.<br>2. Дзейнікавая.<br>3. Акалічнасная часу.<br>4. Дапаўняльная.<br>5. Акалічнасная прычыны. |

Репозиторий БГПУ

## Тэкст да заданняў В6–В8

1. Толькі ўжо калі ўзяўся Васілёк рукой за веснікі, канчаткова пераканаўшыся, што з дзедам «піва не зварыш», дагнала ў спіну дзядусева пытанне:

– А калі сур'ёзна, ёлкі-маталкі, навошта табе мая гармата?

2. Унук адказаў з падкавыкай:

– А тых жа, дзед, варон і ганяць. Маці кажа, што спасу няма ад іх — кураняты прападаюць.

3. Дзед нечакана зарагатаў, бо адказ дужа спадабаўся. 4. Дзед яшчэ раз пераканаўся, што хлопец з характарам — увесь у свайго бацьку.

5. – Паслухай мяне, нябожко, ёлкі-маталкі, зазірні да мяне заўтра, — хітнуў галавою дзед і хітра і пільна стрэліў вокам у падлетка. — Заўтра, калі ў цябе будзе час…

6. – А чаго хадзіць да цябе? 7. Зноў жа скажаш, што не згаворымся, што я ад зямлі не адрос.

8. – От які хуткі, палкі-маталкі! 9. Бачце, няўсцерп яму, як дзеўцы замуж. 10. Можа я з табою гаварыць-балаболіць люблю, можа мне падабаецца, як ты ўпарцішся і нічога не разумееш у гэтым жыцці. 11. Можа, мне з табою проста інцярэсна, га? 12. Бо на бацьку свайго ты дужа падобны. 13. А я паважаў яго вельмі: разумны і дабрачы чалавек, скажу табе шчыра, быў. 14. А ты — стрэльбу, стрэльбу, дзед, прадай… 15. А можа, мне з ёю развітацца шкада, як з гэтым белым светам. 16. Не, каб падрыхтаваць дзеда, настроіць яго на добры лад, з ласкай да яго, з падыходзікам, дык ён кандзібоберам перада мною танцуе…

17. Хлапчук здзівіўся, пачуўшы ад дзеда такое **прызнанне**. 18. Падалося, што тыя словы прамовіў не дзед, а нехта іншы, які схаваўся недзе побач і не паказваўся. 19. Выварочваў сваю душу, вырываў са сваіх грудзей сэрца, ад чаго Васількова сэрца зайшлося «ў шпары» ад дзедавага няўцямнага і нечаканага прызнання.

**В6.** ***Вызначце стыль і жанр тэксту.***

**В7.** ***Вызначце, якому дзеяслову ў сказах 6–10 адпавядаюць наступныя марфалагічныя прыкметы. Запішыце дзеяслоў у неазначальнай форме:***

1) неперaходны;
2) незваротны;
3) закончанага трывання;
4) I спражэння.

**В8.** ***Вызначце спосаб утварэння выдзеленага ў 17-м сказе слова. Запішыце адказ у назоўным склоне.***

## Варыянт 3

### Тэст А

**А1.** ***Адзначце словы, у якіх ёсць гук [й’]:***

1) наяве; 2) вячысты; 3) гаючы; 4) небасхіл; 5) трое.

**А2.** ***Адзначце словы, у якіх свісцячыя зычныя памякчаюцца:***

1) сферычны;
2) забяспечыць;
3) збавіцель;
4) збегчыся;
5) схітрыць.

**А3.** ***Адзначце словы з няправільна пастаўленым націскам:***

1) дыспáнсер;
2) гваздзікí;
3) рэмень;
4) берасцяны;
5) загавóр.

**А4.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара э:***

1) д…зерцір;
2) ар…штант;
3) майст…р;
4) д…пламат;
5) т…мпература.

**А5.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара я:***

1) інв…нтар;
2) дз…журны;
3) праф…сійны;
4) эф…ктыўны;
5) с…рмяжны.

**А6.** ***Адзначце словы з няправільным напісаннем:***

1) кандытэр;
2) каллектыўны;
3) павесялелы;
4) рыдыкюль;
5) субяседнік.

**А7.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара о:***

1) мн…гапудовы;
2) мар…заўстойлівы;
3) п…ліграфічны;
4) ф…тограф;
5) парас…нападобны.

**А8.** ***Адзначце словы з прапушчанай літарай а:***

1) ільн…завод;
2) востр…канечнік;
3) кур…дыміць;
4) вок…мгненна;
5) чарн…зём.

**А9.** ***Адзначце словы з прапушчананй літарай у:***

1) тэрары...м;
2) Люблінская …нія;
3) а…таген;
4) кансілі…м;
5) а…дыенцыя.

**A10.** ***Адзначце словы з прапушчанай літарай з:***
1) ра…казаць; 4) …агітаваць;
2) …выходны (пункт); 5) …эканоміць.
3) бя…моўны;

**A11.** ***Адзначце словы, якія пішуцца з вялікай літары:***
1) ордэн (П, п)рацоўнага Чырвонага Сцяга;
2) (П, п)ершы Беларускі фронт;
3) (В, в)ерхняя Тунгуска;
4) (Д, д)октар медыцыны;
5) (Б, б)русельская капуста.

**A12.** ***Адзначце сінанімічныя рады:***
1) свавольнік, сарвігалава, гарэзнік;
2) сварыцца, судзіцца, лаяцца;
3) каталог, рэестр, спіс;
4) раздарожжа, ростань, расстанне;
5) шчыльна, упрыцірку, усутыч.

**A13.** ***Адзначце назоўнікі з канчаткам -у(-ю):***
1) вынікі (турнір); 4) запасы (торф);
2) пераможца (конкурс); 5) загад (доктар).
3) скланенне (займеннік);

**A14.** ***Адзначце назоўнікі, у якіх у месным склоне назіраецца чаргаванне зычных:***
1) гірлянда; 2) танец; 3) геральдыка; 4) дзень; 5) друшляк.

**A15.** ***Адзначце словы-амонімы:***

1. Калька: «празрыстая папера або тканіна, на якую здымаюць копіі з чарцяжоў і малюнкаў» і калька: «слова або выраз, пабудаваны па ўзору слова або выразу з іншай мовы»;
2. Пераплёт: «цвёрдыя вокладкі ў кнізе, сшытку» і пераплёт: «цяжкае, заблытанае становішча».
3. Кампанія: «група асоб, якія разам праводзяць вольны час» і кампанія: «сукупнасць ваенных дзеянняў, абмежаваных месцам, часам».
4. Маркіза: «жонка або дачка маркіза» і маркіза: «лёгкі навес з тканіны пад акном, дзвярамі для засцярогі ад сонца».
5. Каманда: «кароткі вусны загад камандзіра» і каманда: «асабовы састаў, экіпаж судна».

**A16.** ***Адзначце назоўнікі, якія маюць форму адзіночнага ліку:***
1) двайняты; 4) адведкі;
2) паводзіны; 5) кансерванты.
3) падарожжы;

Репозиторий БГМУ

**А17.** ***Адзначце словазлучэнні з прыметнікамі, ад якіх не ўтвараюцца ступені параўнання:***

1) Далёкі Усход;
2) шчаслівая доля;
3) лёгкая атлетыка;
4) камандзіраў загад;
5) белая кашуля.

**А18.** ***Адзначце, якія марфалагічныя прыкметы адпавядаюць лічэбніку ў наступным сказе:***

У тысяча восемсот восемдзесят восьмым годзе ў Шоўкавічах пасяліўся мой дзед Янка — Ліпскі Іван Іванавіч.

1) колькасны;
2) парадкавы;
3) просты;
4) састаўны;
5) дапасуецца да назоўніка ў адзіночным ліку, мужчынскім родзе, месным склоне.

**А19.** ***Адзначце правільна напісаныя словы:***

1) жыткавіцкі;
2) светлацень;
3) аўтасэрвіс;
4) памфлетыст;
5) інстытутскі.

**А20.** ***Адзначце сказы, у якіх трэба ўжыць адмоўныя займеннікі:***

1. Рабі нечаканае, рабі, як не бывае, рабі, як не робіць (нехта, ніхто), — і тады пераможаш. (*У. К.*)

2. (Нешта, ніщто) малюнкі чысціні адняць у памяці не зможа. (*В. Ж.*)

3. Што ні кажыце, а палітрук упершыню за (некалькі, ніколькі) месяцаў вайны адчуў сябе звычайным чалавекам, у якога не страляюць, які сам не абараняецца. (*Дам.*)

4. Вядома, юную Булгакоўскую (нехта, ніхто) не спытаў, ці хоча яна наогул ісці замуж. (*Я. К.*)

5. Генадзь быў апрануты ў (нейкі, ніякі) адмысловы імпартны шэры касцюм. (*Капыл.*)

**А21.** ***Адзначце дзеясловы, якія ў форме 3-й асобы множнага ліку абвеснага ладу маюць канчаткі** -уць(-юць)**:***

1) сумяшчаць;
2) пялёскаць;
3) спыніць;
4) гудзець;
5) акругляць

**А22.** ***Адзначце словазлучэнні з правільна ўтворанымі і напісанымі дзеепрыметнікамі:***

1) авеяны легендамі горад;
2) схаваны ў нетрах зямлі;
3) умацаваннае паселішча;
4) акуратна разлінеяны аркуш;
5) застыглая ў лёце птушка.



Рэпазіторый БДМУ

**А23.** ***Адзначце сказы, у якіх трэба паставіць працяжнік:***

1. Ты не сонца, усіх не абагрэеш. (*Сач.*)
2. Уменне самастойна думаць, прымаць рашэнні важная задача. (*З. Д.*)
3. З табой сустрэча сэрцу асалода, з табой разлуку назаву бядой. (*М. Д.*)
4. Зрубіць дом, змайстраваць санкі, вазок ці канапу было для дзеда справай звыклай. (*Альш.*)
5. Гэта быў боль па чалавеку, які стаў для мяне ўсім і настаўнікам, і дарадцам, і старэйшым сябрам. (*Лоб.*)

**А24.** ***Адзначце сказы з памылкамі ва ўжыванні дзеепрыслоўных зваротаў:***

1. Седзячы ў засені дуба над ціхай рэчкай, у галаву прыходзілі самыя нечаканыя думкі.
2. Працаваўшы на прысядзібным участку, Насця вельмі стамілася.
3. Выступаючы перад вучнямі, Мікалай Станкевіч узгадаў свае школьныя гады, распавёў пра 75-гадовую гісторыю існавання «ЛіМа».
4. Арганізуючы юбілейную выставу, прысвечаную Напалеону Ордзе, у Брэсце прэзентавалі ўсе архіўныя матэрыялы, у тым ліку і прадастаўленыя ды падораныя бібліятэцы польскімі калегамі. (*«ЛіМ»*)
5. Успомніўшы пра ростань з Аляксеем, Таццянін голас міжволі задрыжэў.

**А25.** ***Адзначце сказы з простым дзеяслоўным выказнікам:***

1. Кожны з нас ёсць адзінокі птах. (*Н. Салодкая*)
2. Няхай расстання чорная жуда нас не кране сваім агнём халодным. (*Бур.*)
3. Гэтаму кучараваму лейтэнанту Гурская вочкі рабіла. (*А. Дудараў*)
4. Рана скроні пачалі сівець. (*Н. Салодкая*)
5. Уся франтавая артылерыя будзе лупіць па гэтых каардынатах. (*А. Дудараў*)

**А26.** ***Адзначце сказы з прыдаткамі, у якіх дапушчаны недакладнасці ва ўжыванні злучка і двукосся:***

1. Побач з князем ехалі яго сыны-падлеткі — Веляслаў і Драгамір, сінявокія і светлавалосыя. (*З. Д.*)
2. Беласнежны карабель прыгажун, спушчаны на ваду, з гонарам плыў супраць хваляў. (*Г. Ч.*)
3. Ад ветрыку тонкія галіны рукі бярозы загайдаліся. (*Лоб.*)
4. Магутны студабекер ціха каціўся, даганяючы мяне з гары ад Крайска. (*І. Пт.*)
5. Запрасілі аднойчы маіх суседзяў выступіць перад турыстамі-масквічамі. (*Лоб.*)

**A27.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць дзвюма коскамі:***

1. Замэчак рэшткі старажытнага горада пабудаванага Уладзімірам для Рагнеды і Ізяслава. (*«Полымя»*)

2. Цябе не радавалі вёсны, а зімы доўгія былі і ратавалі толькі кросны, што ў хаце з зазімкаў жылі. (*Кар.*)

3. Усе вайскоўцы слухалі Косцю ўважліва спачувальна акрамя старшага са шпаламі на пятліцах які глядзеў на Косцю і Марысю недаверліва. (*Дуб.*)

4. Быў позні вечар калі лейтэнанта Лара раптам выклікалі ў штаб брыгады які знаходзіўся на галоўным зоркалёце флатыліі, лінкоры «Смелы». (*А. Аляшкевіч*)

5. Пытаемся ці захавалася сядзіба Скрыганоў, а калі захавалася то дзе яна. (*А. Кудравец*)

**A28.** ***Адзначце адназначныя словы:***

1) прэтэндэнт;
2) хлеб;
3) унітарны;
4) хованка;
5) дэкорум.

**A29.** ***Адзначце сказы, у якіх прысутнічаюць словы гутарковага стылю. Падбярыце да іх нейтральныя сінонімы:***

1. Чаму малады, здаровы, заслужаны чалавек раптам ні з таго ні з сяго адгадоўвае бараду і зашываецца ў глушэчу? (*Федар.*)

2. Блазан гакнуўся вобземлю і заціх — як памёр усё роўна. (*Сіп.*)

3. Навошта тлуміць галаву, калі ў любы момант пры патрэбе можна зазірнуць у слоўнік? (*Федар.*)

4. Маці часусьці пабялела, вусны яе здрыгануліся, і на сынава пытанне адказала пытаннем: «А нашто табе?» (*Бут.*)

5. Цяпер гэтыя ліпы высока ўзняліся ў неба, шырока раскінулі свае галіны. (*Дубр.*)

**A30.** ***Адзначце словы з адасобленымі дапаўненнямі (улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены):***

1. Князёўна пайшла на хітрасць пасадзіўшы вечарам за стол замест сябе непрыгожую дваровую дзяўчыну. (*Бел. кн.*)

2. Стась хлопец спартыўны займаўся ў футбольнай секцыі акрамя таго захапляўся лыжамі і хакеем. (*В-х*)

3. Бацька стаяў засяроджана гледзячы перад сабой трохі далей ад княжыча і ягоных слуг. (*В. Іп.*)

4. Алені прыжыліся на Камандорскіх астравах і мясцовыя жыхары атрымалі акрамя ўсяго новую крыніцу малака і мяса. (*М. Бандарэнка*)

5. Граў і выспеўваў рыжа-агністы Салавей найлепшы музыкант у наваколлі. (*В. Адамчык*)

**А31.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць двукроп'ем:***

1. Перад акном двухмеснай палаты сосны расступаліся, адкрывалі маляўнічы краявід палі са стагамі саломы, палеткі з зялёнай рунню, вёска з могілкамі на даляглядзе і вузкая змейка дарогі, якая звязвала санаторый з навакольным светам. (*М. Кулеш*)

2. Горкая ўсмешка кранула матчыны губы вучыць дачку розуму было позна. (*Афяр.*)

3. Дакладна Косця не мог вызначыць ці шуміць дзесьці на перакаце вада, ці шуміць у ягоных вушах, бо адчуваў, што галава цяжкая, патыліца нібы налілася свінцом. (*Лев.*)

4. Празвінеў камар на вуха пара венікі вязаць! (*Г. Пашкоў*)

5. У Заходняй Еўропе дзятлы даўно занесены ў Чырвоную кнігу. Значыць, ёсць усе падставы сцвярджаць што Беларусь стала апошнім прыстанішчам лясных дактароў. (*П. С.*)

**А32.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю неабходна дапоўніць кропкай з коскай:***

1. З возера да зямлянкі Косця і Марыся вярталіся на захадзе сонца распальвалі вогнішча і гатавалі вячэру. (*Дуб.*)

2. Калі ў тым годзе прыязджала камісія з Міністэрства адукацыі і праводзіліся адкрытыя ўрокі, дык геаграфію лепш за іншыя прадметы ведалі ўсе класы, а Эла Іванаўна была ўрачыста прызнана лепшай настаўніцай школы яны, вучні, ганарыліся ёю. (*Федар.*)

3. Вось тут перапыняецца нашая гісторыя, якая ўсплыве аж праз пятнаццаць гадоў і на гэты раз месцам дзеяння выбера не далёкі Афганістан і не падмаскоўны Падольск, а беларускую вёску Вялікая Паляна менавіта тут з'явяцца перад намі, як на экране тэлевізара, і старыя знаёмыя героі, і зусім новыя менавіта тут наша таямнічая заблытаная гісторыя паступова раскруціцца, разблытаецца, праяснее і пад канец ператворыцца проста ў гісторыю (*Федар.*)

4. Калі ў мяне пытаюць ці ўмею касіць, то я, вясковец ад калыскі, адчуваю нейкі пякучы сорам. (*В-х*)

5. Перакацілася Поўня ад левай рукі здані да правай і зноў завісла над галавою, пульсуючы, пераліваючыся чырвона-чорнымі фарбамі быццам расплаўленая лава ў жарале вулкана, які ненарокам, зусім нечакана прачнуўся ад утомнага сну. (*Казл.*)

## Тэст В

**В1.** ***Выпішыце граматычную ўмову з няпэўна-асабовага сказа:***

1. Звычайна тут вельмі людна. (*В. В.*)
2. Ад нядаўняга разбурэння і следу не засталося. (*В. В.*)



Рэпазіторый БДПУ

3. Нашу рэспубліку ў грозныя гады вайны нездарма называлі рэспублікай-партызанкай. (*«ЛіМ»*)

4. Тут усё нам так блізка, знаёма, зразумела. (*В. В.*)

5. Сказанае слова за хвост не зловіш. (*Прык.*)

**В2.** ***Вызначце суадносіны паміж сказамі і іх характарыстыкай***:

| | |
|---|---|
| А. Па непраніклівым твары Небра нельга было ўявіць, што робіцца з ім і якія буры віруюць у душы яцвяга. (*Сіп.*)<br>Б. У хаце спрабаваў нешта рабіць, нечым заняцца, аднак нічога ў Небра не выходзіла. (*Сіп.*)<br>В. Вось чаму, калі ноч люстру зорнага неба запальвае і палову Зямлі спавівае ў дрымоту і сон, пранікае ў душу неспакой і расце ў ёй, і сэрца зашкальвае — радыяцыя роспачы ў сотні разоў перавысіла фон. (*В. Гадулька*)<br>Г. Кавалерскі вечар спраўлялі ў хаце жаніха, ён запрашаў сваіх сяброў і дзяўчат. (*А. Лакотка*) | 1. Складаны бяззлучнікавы сказ.<br>2. Складаназалежны сказ з сузалежным аднародным падпарадкаваннем.<br>3. Складаны сказ з рознымі відамі сувязі.<br>4. Просты ўскладнены сказ.<br>5. Складаназлучаны сказ. |

**В3.** ***Устанавіце адпаведнасць паміж сказамі і іх характарыстыкай з пункту гледжання вытрыманасці сінтаксічных норм:***

| | |
|---|---|
| А. У вялікім пакоі сабраліся шмат людзей.<br>Б. Бацька неяк мне расказаў, што дзед Аляксандр лячыў зёлкамі хворых, ад якіх адмаўляліся прафесійныя дактары, напрыклад, поліяміэліт. (*К-д*)<br>В. Лаўроўская адразу ж успомніла плёткі аб тым, што яе сённяшні залётнік нібы збіраецца ажаніцца на Нінцы. (*Афяр.*)<br>Г. Чытаючы раманы Жуля Верна, уяўляюцца далёкія заморскія краіны з экзатычнымі звярамі і птушкамі. | 1. Сінтаксічныя нормы не парушаны.<br>2. Парушаны нормы будовы сказа з дзеепрыслоўным зваротам.<br>3. Парушаны нормы кіравання.<br>4. Парушаны нормы каардынацыі дзейніка і выказніка.<br>5. Парушаны нормы будовы сказа з дзеепрыметным зваротам. |

**В4.** ***Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі:***

| | |
|---|---|
| А. Даць дыхту.<br>Б. Жыць з мазаля.<br>В. Як у ваду глядзеў.<br>Г. Баявое хрышчэнне. | 1. Угадаў, нібы загадзя ведаў, прадбачыў што-небудзь.<br>2. Першы ўдзел у баі; першае сур’ёзнае выпрабаванне ў якой-небудзь справе.<br>3. Задаць наганяй.<br>4. Усяго дабівацца самому напружанай працай.<br>5. Гаварыць упустую, пустасловіць. |



Рэпазіторый БДПУ

**В5.** ***Колькі і якіх знакаў прыпынку павінна быць у сказе? Адзначце нумар правільнага адказу:***

На чацвёрты дзень з узыходам сонца ўсё славянскае войска ў адзін момант выгукнула страшэнны зык і з усіх бакоў рушыла на сцены горада адны кідалі каменне з каменямётаў другія цягнулі лесвіцы да сцяны трэція падносілі агонь да варот чацвёртыя пасылалі атручаныя стрэлы якіх было столькі што яны нібы чорныя хмары засланялі неба і сонца. (*З. Д.*)

1) 11 косак; 3) 1 працяжнік, 8 косак;
2) 1 двукроп’е, 7 косак; 4) 8 косак.

### Тэкст да заданняў В6–В8

### Ад вікінгаў

1. У Віцебскім абласным краязнаўчым музеі прайшла выстаўка «На шляху ў Візантыю». 2. Былі прадстаўлены работы членаў віцебскага клуба гістарычнай **рэканструкцыі** «Варгенторн»: касцюмы, зброя, даспехі, упрыгажэнні, прадметы побыту насельніцтва Прыдзвіння і суседніх тэрыторый, дзе ў IX–XI стагоддзях жылі вікінгі, крывічы ды латгалы. 3. Экспанаваліся выробленая са скуры і драўніны карта гандлёвага шляху «з варагаў у грэкі», тканы з воўны і расшыты латгальскі мужчынскі плашч, кашуля мараплаўцы XI стагоддзя, зробленая з канаплянай тканіны, іншыя ўзоры тагачаснага рамяства. 4. Наведнікі атрымлівалі амаль дакументальнае ўяўленне пра развіццё культуры дзвінскага рэгіёна ў далёкія часы, бо ўсё рабілася паводле гістарычных матэрыялаў, змешчаных у друку, на аснове археалагічных раскопак. 5. Прытым усе экспанаты — з натуральных матэрыялаў, апрацаваных **уручную**, без выкарыстання сучасных тэхналогій. 6. Для клуба гістарычный рэканструкцыі «Варгенторн», які існуе з 2004 года, гэта была першая маштабная выстаўка.

**В6.** ***Адзначце характарыстыкі, якія адпавядаюць тэксту:***

1) тып тэксту — разважанне;
2) сувязь сказаў у тэксце паралельная;
3) асноўная думка тэксту выражана ў 5-м сказе;
4) адным са сродкаў сувязі сказаў у тэксце з’яўляецца злучнік.

**В7.** ***Вызначце спосаб утварэння выдзеленага ў 5-м сказе слова.***

**В8.** ***Запішыце беларускі адпаведнік да выдзеленага ў 2-м сказе слова.***

## Варыянт 4

### Тэст А

**А1.** ***Адзначце словы, у якіх літара*** ю ***абазначае два гукі:***

1) зязюля; 4) заюрыць;
2) нюханне; 5) юнкер.
3) каюта;

**А2.** ***Адзначце спалучэнні слоў, вымаўленне якіх не супадае з напісаннем:***

1) не дбае;
2) без прынукі;
3) не трэба;
4) не пакажа;
5) без возера.

**А3.** ***Адзначце словы з аднолькавым трэцім гукам:***

1) разнесці;
2) касьба;
3) носьбіт;
4) казка;
5) вузкі.

**А4.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара*** *ы:*

1) пр…цэдэнт;
2) пр…міяльны;
3) д…ндрарый;
4) кр…вавы;
5) прагл…нуць.

**А5.** ***Адзначце словы, у якіх прапушчана літара*** *я:*

1) здз…йсненне;
2) выдз…ўбці;
3) берв…но;
4) б…стселер;
5) ман…ўровы.

**А6.** ***Адзначце словы з няправільным напісаннем:***

1) персанаж;
2) выляцець;
3) пецярня;
4) тэлестудыя;
5) інтэлегенцыя.

**А7.** ***Адзначце словы з прапушчанай літарай*** *о:*

1) в…страслоў;
2) п…ліметалы;
3) в…льналюбівы;
4) п…ўправаднік;
5) руж…вашчокі.

**А8.** ***Адзначце словы з прапушчаным спалучэннем*** *ыя:*

1) акард…ніст;
2) аж…таж;
3) індывід…льны;
4) мемар…льны;
5) ід…ліст.

**А9.** ***Адзначце словы з прапушчанай літарай*** *у:*

1) вернікі-…ніяты;
2) пераможнае «…ра»;
3) беларуска-…краінскі;
4) здолеў ...спрыняць;
5) стра…с.

**А10.** ***Адзначце словы, якія пішуцца паводле марфалагічнага прынцыпу:***

1) шчаслівы;
2) не кажа;
3) наваколле;
4) волжскі;
5) бязгрэшны.

**А11.** ***Адзначце словы, якія пішуцца з малой літары:***
1) не паважаю (А, а)бломавых;
2) (Г, г)ераклаў подзвіг;
3) (П, п)іфагорава тэарэма;
4) (Б, б)ерталетава соль;
5) (Д, д)ом ветэранаў.

**А12.** ***Адзначце сінанімічныя рады:***
1) торны, наезджаны, біты;
2) нагода, зачэпка, прычына;
3) войска, армія, раць;
4) павага, пашана, рэйтынг;
5) няўдача, пройгрыш, афера.

**А13.** ***Адзначце назоўнікі з канчаткам -у(-ю):***
1) малако у (збанок);
2) ісці супраць (вецер);
3) загад па (універсітэт);
4) размова па (тэлефон);
5) прыехаць з (Пінск).

**А14.** ***Адзначце назоўнікі, у якіх у месным склоне назіраецца чаргаванне зычных:***
1) ар'ергард; 2) назоўнік; 3) пух; 4) мустанг; 5) скарга.

**А15.** ***Адзначце словы з прапушчаным апострафам:***
1) Прыдняпроў…е;
2) перал…ю;
3) Запаляр…е;
4) Пракоф...еў;
5) Закаўказ…е.

**А16.** ***Адзначце словазлучэнні з граматычнымі недахопамі:***
1) чужы кішэнь;
2) ад дзедава прашчура;
3) чырвонае яблычка;
4) белая гусь;
5) стары шынель.

**А17.** ***Адзначце радкі, у якіх усе словы — назоўнікі 2-га скланення:***
1) завадатар, акно, ронда, сэрца;
2) рукаў, пасяджэнне, імя, стрэл;
3) дзеяслоў, старшына, бездань, вугаль;
4) бельэтаж, неба, полымя, сапфір;
5) быльнёг, фельчар, цемя, галлё.

**А18.** ***Адзначце спалучэнні слоў, якія пішуцца асобна:***
1) дзяржы…дрэва;
2) грамадска…карысны;
4) птушка…салавей;
3) гідра…электрастанцыя;
5) грам…малекула.



Репозиторий БГМУ

**А19.** ***Адзначце канструкцыі, якія не з'яўляюцца словазлучэннямі:***

1) мы паўтарылі;
2) на ўроку;
3) той урок;
4) паўтарылі ямб;
5) узяліся за практыкаванні.

**А20.** ***Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя курсівам словы з'яўляюцца акалічнасцю:***

1. *Як пацеркі*, вятры перабіраюць сугуччы слоў на розных мовах свету. (*В. Яр.*)
2. Мора губамі злізвае свежых слядоў *ланцужок*. (*В. Яр.*)
3. *Ноччу* снілася мора дыханне і бурштын залаты алычы. (*В. Яр.*)
4. Кірэй пачаў *у думках* пракручваць сваю магчымую сустрэчу з Андрэем Глушко. (*В. Ш.*)
5. Не спрабуй *вярнуцца* сюды і сваволіць. (*Васюч.*)

**А21.** ***Адзначце сказы, у якіх трэба паставіць працяжнік:***

1. Беларуская літаратура адна з самых маладых літаратур свету. (*Р. Бар.*)
2. Твая радзіма гэта месца, куды цябе цягне сэрцам. (*А. Янкоўскі*)
3. У вадзе чалавек значна лягчэйшы, чым на беразе.
4. Гэтыя дзве вёскі нібы падзелены непераадольнай мяжою. (*Н-к*)
5. Мой візаві быў чалавек спрактыкаваны. (*Зяньк.*)

**А22.** ***Адзначце складаназлучаныя сказы з правільна пастаўленымі знакамі прыпынку:***

1. Хоць не былі мы на вайне, але яна прайшла праз нашы сэрцы... (*Я. Каршукоў*)
2. Па-за імі праносіліся чорныя хрыбты, выступы, яры, і мільгалі палеткі і хаціны. (*Васюч.*)
3. Сплыў паром, але дыханне коней ля былых начуе пераправ. (*В. Яр.*)
4. Яшчэ дажджы сцюдзёныя з вятрамі не выстудзілі гнёзды ў кронах дрэў і над ракой, лугамі і барамі яшчэ жыве пра лета ціхі спеў. (*В. Яр.*)
5. Усміхнуўся і Іван Гаўрылавіч ды ўсмешка атрымалася нейкай вымучанай. (*Марц.*)

**А23.** ***Адзначце сказы з памылкамі ў дзеяслоўным кіраванні:***

1. Я не збіраюся ні аб чым у цябе пытацца, не разлічваю, натуральна, на адкрытасць, шчырасць. (*Афяр.*)
2. Ты, Клім, дзеля свайго дабрабыту ажаніўся на нялюбай. (*Гап.*)
3. Ты прабач мяне за тое, мама. (*Гап.*)
4. Аб пісьменніцкай працы мяркуюць не па колькасці напісанага, а па яго значнасці. (*Кам.*)
5. З татам я неаднойчы ездзіла і па сена, і па снапы, і па дровы. (*М. Захарэвіч*)

**А24.** ***Адзначце сказы з ускоснымі дапаўненнямі:***

1. Бывала, варона лапці абувала, а цяпер грак ходзіць так. (*Прык.*)
2. Дзе многа па куце сядзіць, там мусіць мыш галодна быць. (*Прык.*)
3. Ад бяды кіем не адаб'ешся. (*Прык.*)
4. Дачка ў пары — не трымай ў двары. (*Прык.*)
5. Слязамі бядзе не паможаш. (*Прык.*)

**А25.** ***Адзначце складаназалежныя сказы з правільна пастаўленымі знакамі прыпынку:***

1. Сяргей выцірае крысом палінялай сарочкі з твару пот, а потым зноў размахваецца сваёй сялянскай «зброяй» [касой], бы той казачны асілак, што збівае галовы змею-пачвары. (*В-х*)

2. Мне здалося, што Гайна, у белай кашулі, з распушчанымі белымі валасамі, з агромністымі вачыма-фіялкамі, ляціць проста на мяне. (*В. Іп.*)

3. Нясі мяне, радасць, нясі ў казку, што дорыць прырода. (*К. Жук*)

4. Там, у кустах, густа парос парыснік які ў нашай вёсцы завуць рабіннікам і чмялёўнік — каровіны ласункі. (*М. Гіль*)

5. Касцюшка на чужым кані ў роспачы блукаў па полі бітвы сярод параненых і палеглых, адшукваючы сваю кулю сярод мноства тых што пасвіствалі навокал. (*К. Т.*)

**А26.** ***Адзначце сказы з адасобленымі членамі (улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены):***

1. Сярэдняга росту русявая вастраносенькая яна нічым не вылучалася сярод дзяўчат-равесніц. (*Лоб.*)

2. Вуляна даланёю выцерла мокры ад пырскаў твар зірнула ў вочы Небру. (*Сіп.*)

3. Я глядзеў на раз'ятранага маршалка не адчуваючы страху. (*В. Іп.*)

4. На Літве і Беларусі паўстанне 1794 года ўзначаліў Якуб Ясінскі інжынерны палкоўнік. (*К. Т.*)

5. З табою акрамя арыштаванага пойдуць сяржант Андрушын і радавы Тарасаў. (*Дуб.*)

**А27.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць дзвюма коскамі:***

1. Дзяўчаты і хлопцы, па дурасці, палескай песні сароміліся а замест яе спявалі розную модную гарадскую лухту якая хутка прыходзіла і гэтак жа хутка знікала ў нябыт. (*У. К.*)

2. Узрост старажытных гарадоў лічаць з таго года калі пра горад упершыню паведамляе летапіс. (*У. А.*)

3. Здавалася што калі ты была побач я рабіўся лепшы. (*Лук.*)

4. У разгуканай цішы вечаровай дзе засынае ў завадзі аер насупілі свае густыя бровы вярбіна над абрывам і асвер. (*К. Жук.*)

5. Яшчэ я любіў хадзіць з Язэпкам па лесе куды часта ганялі статак пакуль у калгасе не ўпраўляліся з сенакосам. (*М. Гіль*)

**А28.** ***Адзначце складаназалежныя сказы з сузалежным аднародным падпарадкаваннем:***

1. Як бы там ні было, Боская воля была выканана і вёска Ражкоўка на Камянеччыне выратавана. (*Масл.*)

2. Хоць мы і любілі Балгарыю, хоць і неблагое тут было жыццё, але доўгая ростань з роднымі, з Радзімай ужо станавілася нясцерпнай. (*В. Б.*)

3. Немцы планавалі па дарозе Гарадзец–Барсукі адрэзаць частку лесу, у якім размяшчаліся партызаны, паставіць там куляметных гнёздаў і пагнаць на іх партызан. (*Лук.*)

4. Ідзі і забудзь ўсё, што я табе раней гаварыў і што ты сёння бачыў. (*Гап.*)

5. Віктар Гардзей так цікава і ўмела падае нам жыццё прыроды, што не трэба доўгага тлумачэння, каб уразумець, хто з'яўляецца героем любога яго верша. (*В. Жушма*)

**А29.** ***Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю неабходна дапоўніць працяжнікам:***

1. Жыць бы мне, не тужыць: я ж зусім не апошні і не лішні на гэтай зямлі. (*С-к*)

2. Прафесія бортправадніцы толькі на першы погляд рамантычная на самай справе праца не толькі небяспечная, але і нялёгкая. (*Г. Суша*)

3. Мінаў час і Івана зноў нібы магнітам цягнула да Ладуцькаў. (*Лук.*)

4. Упершыню ў жыцці бацька даверыў княжычу вельмі важную справу склікаць на вайну мужчын-велясітаў, даверыў віць вянок, сплецены з лыка, які трэба было везці па паселішчах на поўдзень. (*З. Д.*)

5. Стала зразумела трэба шукаць чалавека, які некалі пісаў гэтыя пасланні Яну Скрыгану. (*А. Кудравец*)

**А30.** ***Адзначце складаныя бяззлучнікавыя сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць двукроп'ем:***

1. Малюнак быў жахлівы пярэднія фіны, пераважна камандзіры, былі скошаны кулямётным агнём. (*Дам.*)

2. Сваё падполле, свае «маладыя гвардыі» былі ў Беларусі ў кожным гарадку, пасёлку, вёсцы людзі проста фізічна адчувалі прысутнасць чужынцаў на роднай зямлі і інстынктыўна супраціўляліся гэтаму бесцырымоннаму ўварванню. (*М. Тычына*)

3. Дзверы, моцныя, як у крэпасці, былі з тоўстых дошак выбіць іх не ўдалося. (*В. Іп.*)

4. Дарослыя паспрабавалі адсекчы, адламаць ад залатой дошкі хаця б невялікі кавалак, але ўсе намаганні сталіся марнымі ні сякера, ні нож нават драпінаў не пакідалі на зіхоткай паверхні золата. (*Г. Ч.*)

5. Нос быў кірпаты, вусны занадта пульхныя прыгажуняй дачка каваля не выглядала. (*В. Іп.*)

**А31.** ***Адзначце сказы з правільна пастаўленымі знакамі прыпынку:***

1. Пад кронай тваёй непраглядна-густой шукаў ад дажджу я прытулак, а сонца пякло — ты на выпадак той давала цянёк-паратунак. (*Кар.*)

2. Хацелася б адзначыць, што ў творах беларускіх пісьменнікаў, якія пішуць дэтэктывы, прысутнічаюць апрача займальнай інтрыгі і дынамічнага сюжэта нацыянальны каларыт і містычныя матывы беларускага фальклору. (*А. Чарота*)

3. Аксана маладая яшчэ, але з-за жыццёвай неўладкаванасці і нечаканых удараў лёсу неяк сагнулася, пастарэла, і голас яе, і позірк гаварылі пра тое, што яна шмат нацярпелася, і што ёй вельмі нялёгка. (*Бар.*)

4. Сарандапіх, як і ўсе гледачы, быў заінтрыгаваны: Ірына ўпарта ўтойвала ад яго нейкі сакрэт, які яна збіралася паказаць у час велікодных спаборніцтваў. (*З. Д.*)

5. На Вербніцу, на Вербніцу мне марыцца і верыцца, што наша шчасце вернецца, як расцвітуць сады і туманы вішнёвыя гадзінай вечароваю над далямі вясновымі, як вэлюм, паплывуць. (*Кар.*)

**А32.** ***Адзначце памылковыя сцвярджэнні:***

1. Словы з запазычанай прыстаўкай контр- заўсёды пішуцца праз злучок.

2. Дзеканне і цеканне назіраюцца толькі ў словах славянскага паходжання.

3. Асноўную частку беларускай лексікі складаюць агульнаславянскія словы.

4. У публіцыстычным і навуковым стылях выкарыстоўваюцца фразеалагізмы, якія маюць кніжную афарбоўку.

5. Зборныя лічэбнікі ўжываюцца з назоўнікамі — назвамі асоб мужчынскага і жаночага полу.

## Тэст В

**В1.** ***Вызначце суадносіны паміж раздзеламі мовазнаўства і паняццямі, якія там вывучаюцца:***

| | |
|---|---|
| А. Сінтаксіс. | 1. Клічнік. |
| Б. Пунктуацыя. | 2. Склад. |
| В. Лексікалогія. | 3. Аглушэнне. |
| Г. Фанетыка. | 4. Інверсія. |
| | 5. Антонім. |

**В2.** ***Знайдзіце назоўнік, форма множнага ліку назоўнага склону якога ўтворана няправільна, і запішыце правільную форму:***

1) лектары; 2) словы; 3) манастыры; 4) каменні; 5) дубы.



Рэпазіторый БДПУ

**В3.** ***Вызначце суадносіны паміж складаназалежнымі сказамі і тыпамі дадзеных частак:***

| | |
|---|---|
| А. Пра веліч і дыяпазон таленту Рыгора Барадуліна сведчыць і тое, што яго перакладаюць на розныя мовы свету. (*У. Завальнюк*) | 1. Азначальная. |
| Б. Чым бліжэй станавіўся прызначаны тэрмін, тым большы неспакой авалодваў старэйшым братам. (*Г. Ч.*) | 2. Дапаўняльная. |
| В. Канец лістапада і пачатак снежня, асабліва калі яны чорныя і бясснежныя, мой дзед не любіў. (*Ул. Сц.*) | 3. Акалічнасная ўступкі. |
| Г. Які ні вялікі быў конкурс у медыцынскі інстытут, Караліна ўсё ж паступіла. (*М. П.*) | 4. Акалічнасная часу. |
| | 5. Дзейнікавая. |

**В4.** ***Вызначце, калі ставіцца коска (коскі) ў сказах са злучнікам*** *як*. ***Укажыце суадносіны паміж слупкамі табліцы:***

| | |
|---|---|
| А. За гады службы маёр навучыўся адрозніваць сапраўдных сышчыкаў ад людзей часовых, якім аператыўная работа патрэбна толькі як чарговая прыступка ў кар’ерыстычнай лесвіцы. (*В. Пр.*) | 1. Коска не ставіцца, бо зварот мае значэнне «ў якасці». |
| Б. Разгледзеў юнак скрозь трывожны паўзмрок як з лесу на далёкім беразе вырваўся віхор. (*Я. К.*) | 2. Коска не ставіцца, бо зварот з’яўляецца выказнікам. |
| В. Ён як малады нежанаты спецыяліст не адмаўляўся ездзіць у камандзіроўкі. (*Сач.*) | 3. Зварот выдзяляецца коскамі, бо мае акалічнаснае значэнне прычыны. |
| Г. А ля вады сляды рыбацкіх ботаў як знакі нецярпення: час прыйшоў прасмольваць човен. (*В. Яр.*) | 4. Коска не ставіцца, бо параўнальны зварот уваходзіць у склад выказніка. |
| | 5. Коска ставіцца перад злучнікам як, які звязвае часткі складаназалежнага сказа. |

## Тэкст да заданняў В5–В8

### Русалка

1. Шмат прыгожага, дзеткі, на нашай з вамі Радзіме. 2. Гэта і звонкія сасновыя бары, пранізаныя сонечным святлом і напоеныя гаючым паветрам. 3. Гэта і блакітныя азёры, у люстэркі якіх глядзіцца і яснае сонейка, і срэбраны месячык. 4. Але найвялікшы цуд, роўнага якому няма нідзе на свеце, — гэта нашы дзяўчаты. 5. У азёр забралі яны бяздонную сінь сваіх вачэй, у лёну — шаўковыя косы, у бярозак — гнуткія станы, а ў шчымлівай роднай песні — дабрыню і пяшчоту. 6. Калі яны пакахаюць, дык на ўсё жыццё, а сілком ніхто ім любы не будзе. 7. Дык вось…

Репозиторий БГМУ

8. У беднай сялянскай сям'і падрастаў якраз такі цуд. 9. Марыляю звалі. 10. Прыгожыя дзеці нараджаюцца ад моцнага кахання. 11. Бацькі Марылі не маглі жыць адно без аднаго, але маці пры родах памерла, і бацька адзін гадаваў сваю дачку. 12. Як увайшла ў цвет дзяўчына, роўнай ёй па прыгажосці нідзе не было. 13. Убачыў яе аднойчы паніч Тодар Запольскі — і абамлеў. 14. Сядзіць у брычцы, разявіўшы рот, і слова сказаць не можа. 15. А Марыля хаця і **бедная**, але красу сваю ведала, ды і слоўка вострае нядоўга шукала.

16. – Закрый рот, паніч, а то, чаго добрага, і верабей заляціць! — звонка крыкнула яна, і сяброўкі зайшліся смехам. 17. Пачырванеў Тодар, смалянуў пугай па жарабцу, і той шалёным алюрам панёсся ў бок маёнтка.

18. З той пары не даваў паніч праходу Марылі. 19. Пераймаў яе з дарагімі падарункамі, але гордая дзяўчына нічога не прымала.

20. – Не па сабе сасну гнеш, паніч, не пара я табе. 21. Не ляжыць у мяне да цябе сэрца, выбачай!

22. – Марыля, я ўсё для цябе зраблю, толькі будзь маёй!

23. – А тады ажаніся са мной, яснавяльможны пан! 24. Прышлі сватоў да майго бацькі, а я падумаю.

24. – Ты ж ведаеш, што мае бацькі ніколі на такое не згодзяцца…

25. – А быць тваёй чарговай каханкай я не жадаю! — сказала Марыля як адрэзала.

26. Не супакоіўся фанабэрысты паніч і вырашыў паклікаць на дапамогу **нячыстую сілу**…

**В5.** ***Адзначце антонімы да выдзеленага ў 15-м сказе слова:***

1) заможны;
2) трывалы;
3) багаты;
4) абяздолены;
5) грашавіты.

**В6.** ***Вызначце стыль і тып тэксту:***

1) публіцыстычны, апісанне;
2) публіцыстычны, разважанне;
3) мастацкі, апавяданне з элементамі апісання;
4) гутарковы, апавяданне з элементамі апісання.

**В7.** ***Вызначце сярод сказаў 11–15 двухсастаўны няпоўны. Укажыце яго нумар.***

**В8.** ***Вызначце, якім членам сказа з'яўляюцца выдзеленыя ў 26-м сказе словы.***

## Змест

Умоўныя скарачэнні ........................................................................ 3
Кантрольная работа № 1 (дыктант) ......................................................... 5
Кантрольная работа № 2 .......................................................................... 8
Кантрольная работа № 3 .......................................................................... 12
Кантрольная работа № 4 .......................................................................... 15
Кантрольная работа № 5 .......................................................................... 29
Кантрольная работа № 6 .......................................................................... 48
Кантрольная работа № 7 .......................................................................... 66
Кантрольная работа № 8 .......................................................................... 76
Кантрольная работа № 9 .......................................................................... 104

Репозиторий БГМУ